ISSN 2218-029X

Веснік
Брэсцкага ўніверсітэта

Галоўны рэдактар:
М.Э. Часноўскі

Намеснік галоўнага рэдактара:
Г.М. Сендзер

Міжнародны савет
В.Р. Бязрогаў (Расія)
Ф.Я. Васілюк (Расія)
Марк Грабэ (Германія)
Андраш Золтан (Венгрыя)
Ежы Нікітаровіч (Польшча)
Фелікс Чыжэўскі (Польшча)
П.М. Ямчук (Украіна)

Рэдакцыйная калегія:
У.А. Сенькавец
(адказны рэдактар)
В.У. Будкевіч
І.Я. Валітава
В.І. Іўчанкаў
Т.А. Кавальчук
А.А. Лукашанец
Л.Г. Лысюк
З.П. Мельнікава
М.І. Мішчанчук
В.Ф. Русецкі
А.С. Сляповіч
В.І. Сянкевіч
У.А. Янчук

Пасведчанне аб рэгістрацыі
ў Міністэрстве інфармацыі
Рэспублікі Беларусь
№ 1337 ад 28 красавіка 2010 г.

Адрас рэдакцыі:
224665, г. Брэст,
бульвар Касманаўтаў, 21
тэл.: 23-34-29
e-mail: vesnik@brsu.brest.by

Часопіс «Веснік Брэсцкага
ўніверсітэта» выдаецца
з снежня 1997 года

Серыя 3

ФІЛАЛОГІЯ
ПЕДАГОГІКА
ПСІХАЛОГІЯ

НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ ЧАСОПІС

Выходзіць два разы ў год

Заснавальнік – установа адукацыі
«Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

№ 2 / 2011

У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай
камісіі № 26 ад 02.02.2011 г. часопіс «Веснік Брэсцкага ўніверсітэта»
ўключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь
для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў
па філалагічных, педагагічных і псіхалагічных навуках

ISSN 2218-029X

Vesnik
of Brest University

Editor-in-chief:
M.E. Chasnovski

Deputy Editor-in-chief:
G.M. Sender

International Board:
V.V. Byazrogav (Russia)
F.Y. Vasilyuk (Russia)
Mark Grabe (Germany)
Andrash Zoltan (Hungary)
Ezhi Nikitarovich (Poland)
Felix Chizhevski (Poland)
P.M. Yamchuk (Ukraine)

Editorial Board:
U.A. Senkavets
(managing editor)
V.Y. Budkevich
I.Y. Valitava
B.I. Iuchankav
T.A. Kavalchuk
A.A. Lukashanets
L.G. Lysyuk
Z.P. Melnikava
M.I. Mishchanchuk
V.F. Rusetski
A.S. Slyapovich
V.I. Syankevich
Y.A. Yanchuk

Registration Certificate
by Ministry of Information
of the Republic of Belarus
№ 1337 from April 28, 2010

Editorial Office:
224665, Brest,
Boulevard Kosmonavtov, 21
tel.: 23-34-29
e-mail: vesnik@brsu.brest.by

Published since December 1997

Series 3

PHILOLOGY
PEDAGOGICS
PSYCHOLOGY

SCIENTIFIC-THEORETICAL JOURNAL

Issued two times a year

Founder – Educational Institution
«Brest State University named after A.S. Pushkin»

№ 2 / 2011

According to the order of Supreme certification commission № 26
from February 02, 2010, the journal «Vesnik of Brest University» was included
to the List of editions of the Republic of Belarus for publication of the results
of scientific research in philological, pedagogical and psychological sciences

ЗМЕСТ

ФІЛАЛОГІЯ

Ішчанка Г.М. Агульначалавечае і нацыянальнае ў эсэ У. Караткевіча «Saxifraga» 5

Сацута І.У. Асаблівасці парадыгмаў скланення прыметнікаў у старабеларускім перакладзе «Гісторыі аб Атыле» 10

Станкевіч Л.Ф. Устойлівыя адзінкі мовы з кампанентамі-назвамі свойскіх жывёл (конь, кабыла, жарабок, жарабя) 19

Мішчанчук М.І. Старонка адраджэння: з назіранняў пра паэму М. Гусоўскага «Песня пра зубра», яе пераклады 29

Кузнецова Е.Л. К вопросу о мотивации названий травянистых лекарственных растений 36

Осовская И.Н. Дисенсные маркеры в конфронтативном дискурсе 42

Снежко А.И. Место артикля в системе языка 48

Белка Л.Р. Фарміраванне справаводчай тэрміналогіі беларускай мовы ў пачатку XX ст. (на матэрыяле «Дзелавода» С. Серады) 53

Праневіч Г.М. Ад «Прускай вайны» Яна Вісліцкага да «Песні пра зубра» Міколы Гусоўскага: кантрапункты вайны і міру 59

Лещёва Л.М. Интерактивный компьютерно-опосредованный способ формирования основ переводческой компетенции 69

Бароўская І.А. Вобразна-стылёвыя пошукі беларускай песеннай лірыкі 77

Швед І.А. Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання колеравых сімвалаў міфапаэтычнага мыслення беларусаў 84

ПЕДАГОГІКА

Сегенюк Г.В. Системный подход к взаимодействию школы и семьи в педагогическом наследии В.А. Сухомлинского 90

Кавалевіч М.С. Каштоўнасныя арыентацыі асобы і іх педагагічная падтрымка: сінергетычны падыход 96

Старовойтова Д.А. Методологическая рефлексия педагога-исследователя как фактор качества научного исследования 104

Якуш Е.И. Сущность понятия «ценностное отношение учащихся профессиональных лицеев к избранной профессии»: междисциплинарный подход 112

Решеткина И.В., Селивоник С.В. Адаптация содержания среднего математического образования Республики Беларусь к требованиям Евросоюза средствами систем упражнений 127

Ничишина Т.В. Нарушение внешних и внутренних границ семьи как одна из причин ее неблагополучия 136

Демчук Т.С. Здоровьесозидающая педагогическая деятельность как современная стратегия сохранения и укрепления здоровья школьников 141

Соколова Т.В. Волонтерская деятельность будущих специалистов социально-гуманитарного профиля как условие их профессиональной подготовки 150

ПСІХАЛОГІЯ

Довгая Ю.Л. Понимание слова – основа успешности коммуникации и решения коммуникативно-интеллектуальных проблем 157

Северин А.В. Методика последовательного добавления анализаторов для коррекции нарушений перцептиных действий подростков 165

Комарова И.А. Эмоциональная саморегуляция подростков-сирот: постановка проблемы 173

Бирюкевич Е.А. Особенности жизненных целей у взрослых и лиц юношеского возраста 179

Шматкова И.В. Особенности материнских представлений об эмоциональном благополучии ребенка раннего возраста 189

Сацук А.В. Основные характеристики субъектности как проявления функционирования самосознания личности 195

Клещева Е.А. Типы взаимоотношений родных и неродных родителей и детей в повторнобрачной семье 204

ПАДЗЕІ, ДАТЫ, ЮБІЛЕІ

Сенькавец Г.А. Складаючыя духоўнага жыцця Максіма Багдановіча 211

Звесткі аб аўтарах 214

© Выдавецтва БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2011

INDEX

PHILOLOGY

Ishchanka H.M. Uladzimir Karatkevich's essay «Saxifraga» 5

Satsuta I.V. The specific morphological features of the adjectives in the old Belarusian translation of the «Attila's history» 10

Stankievich L.F. Verbal set expressions including components referring to domestic animals (horse, stallion, mare, colt) 19

Mishchanchuk M.I. A Piece of Renascence: Thoughts about M. Gusovski's Poem «A Song about Bison» and its Translations 29

Kuznetsova E.L. On motivation of names of herbaceous medicinal plants 36

Osovskaya I.N. Desense markers in confrontative discourse 42

Snezhko A.I. The article in language system 48

Belka L.G. The formation of paper work terminology of the Belarusian language at the beginning of the XX century (on the basis of S. Sereda's «Delovod») 53

Pranevich H.M. From Jan Vislicki's «Prussian war» to Mikola Gusouski's «The song about a European bison»: counterpoints of war and piece 59

Leshchova L.M. Interactive computer-mediated technique for translation competence fundamentals formation ... 69

Borovskaya I.A. Figurative-stylistic searches of the Belarusian lyrics of a song 77

Shved I.A. Theoretical and methodological basis of the research of colour symbols of mytho-poetical thinking of Belarusians 84

PEDAGOGY

Segenyuk G.V. System approach to family and school interaction in the educational heritage by V.A. Sukhomlinsky 90

Kovalevich M.S. Personal value orientations and their pedagogic as support: synergetic approach 96

Staravoitava D.A. Methodological reflection of a teacher-researcher as a quality factor of scientific research 104

Yakush E.I. The essence of the notion «Value attitude towards the chosen profession with the students of professional lyceums»: interdisciplinary approach 112

Rashotkina I.V., Selivonik S.V. Adaptation of the concept of the secondary mathematics education in the Republic of Belarus to the demands of the European Union by means of the exercises systems 127

Nichishina T.V. The breach of external and internal family bounds as one of the cause of its trouble 136

Demchuk T.S. Health improving pedagogical activity as modern strategy of preservation and strengthening of pupils' health 141

Sokolova T.V. Volunteer Activity in the Context of Training of Future Specialists of Social-and-Humanitarian Specialization 150

PSYCHOLOGY

Dovgaya Y.L. Understanding of the word – the basis of success of communications and the decision of communicatively-intellectual problems 157

Severin A.V. Application technique of consecutive addition of analyzers for correction of perceptual actions teenagers with computer addiction 165

Komarova I.A. Emotional self-control of teenagers-orphans: problem statement 173

Birukevich E.A. Peculiarities of the life goals of adults and young people 179

Shmatkova I.V. The peculiarities of mothers' representations of toddlers' emotional well-being disorders 189

Sazhuk A.V. The major characteristics of subjectivity manifesting of functioning of self-consciousness 195

Kleshcheva E.A. The types of relations between native and nonnative parents and children in repeated marriage families 204

EVENTS, DATES, JUBILEES

Senkavets H.A. Components of spiritual life of Maxim Bagdanovich 211

Information about the authors 214

© Publishing house of BrSU named after A.S. Pushkin, 2011

ФІЛАЛОГІЯ

УДК 821.161

Г.М. Ішчанка

АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧАЕ І НАЦЫЯНАЛЬНАЕ Ў ЭСЭ У. КАРАТКЕВІЧА «SAXIFRAGA»

У артыкуле асэнсоўваецца рэцэпцыя У. Караткевічам жыцця і творчасці класікаў украінскай літаратуры Тараса Шаўчэнкі і Лесі Украінкі. Зроблены гісторыка-функцыянальны аналіз эсэ «Saxifraga».

Лёс прывёў Уладзіміра Караткевіча на зямлю Украіны ў гады ваеннага ліхалецця. Будучы пісьменнік разам з маці трапіў у Кіеў адразу пасля яго вызвалення ад фашыстаў. Аўтабіяграфічная аповесць «Лісце каштанаў» (1974), нарыс «Мой се градок!» (1982) надзвычай ярка і эмацыйна перадаюць успрыманне старажытнага горада вачыма хлопчыка-падлетка. Як і родны горад У. Караткевіча Орша, Кіеў раскінуўся на берагах Дняпра – калыскі славянскай культуры. Рака яднала любімыя гарады і народы. Атмасфера старадаўняга велічнага стольнага горада выклікала ў душы У. Караткевіча разуменне сэнсу свайго чалавечага прызначэння. Пісьменнік прызнаецца: «…Я паступова адчуў галоўнае ўва мне, прыналежнасць да Вялікай Гісторыі Славян, да гісторыі народаў, у тым ліку да ўкраінскага, што складаюць маё племя. Уваходзіў у галоўную справу майго жыцця: асэнсаванне нас, сённяшніх, асэнсаванне таго, хто мы ёсць сёння і куды мы ідзём, – праз асэнсаванне нашага ўчора» [3, с. 116].

Восенню 1944 года сям'я Караткевічаў вярнулася на Беларусь. У Оршы юнак закончыў сярэднюю школу і ў 1949 годзе паступіў вучыцца на філалагічны факультэт Кіеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Праз гады, ацэньваючы свой юнацкі выбар, ужо вядомы пісьменнік адзначыць: «І я, відаць, не дужа памыліўся, прадчуваючы, што менавіта там мне ўдасца лепей зразумець мінулае ўсходнеславянскіх народаў, чым яно ў кожнага народа падобнае і чым адметнае» [3, с. 118]. Кіеўскі ўніверсітэт спраўдзіў спадзяванні беларускага студэнта. Юнак шмат працаваў у яго бібліятэках, архівах, меў доступ да старадрукаў, перыёдыкі мінулых гадоў. Праз усё жыццё У. Караткевіч пранёс удзячнасць сваім выкладчыкам, што падтрымалі яго духоўныя памкненні, дапамаглі авалодаць культурай навуковай і творчай працы. У вершы, прысвечаным акадэміку А.І. Бялецкаму, ёсць радкі, якія вельмі дакладна перадаюць гуманістычную сутнасць той настаўніцкай дапамогі:

О, як трэба шукаць на шляхах чалавека,
Як любіць, берагчы, не крыўдзіць яго,
Каб пабачыць *славу наступнага века* (вылучана намі – *Г.І.*)
У сэрцы сціплага сына суседа свайго! [1, с. 150].

Прыведзеная цытата сведчыць таксама і аб тым, што ўжо на пачатку творчага шляху (верш напісаны ў 1950-х гг.) малады паэт прадбачыў сваё месца ў гісторыі нацыянальнай культуры.

У. Караткевіч дасканала ведаў украінскую мову, літаратуру, гісторыю, мастацтва. У часы вучобы ва ўніверсітэце яго нават абвінавачвалі ва ўкраінскім нацыяналізме. Беларускі пісьменнік захапляўся жыццём і творчасцю Т. Шаўчэнкі, І. Франко, Лесі Украінкі. У свой запаветны гістарычны раман «Каласы пад сярпом тваім» У. Караткевіч увёў эпізадычны вобраз Тараса Шаўчэнкі. Галоўны герой рамана князь Алесь Загорскі сустракаецца з Кабзаром у Пецярбургу і схіляе галаву ў знак пашаны перад жыццёвым і творчым подзвігам былога прыгоннага. Вуснамі свайго

любімага героя, носьбіта аўтарскай пазіцыі, У. Караткевіч ацэньвае ролю Тараса Шаўчэнкі ў развіцці гістарычнай свядомасці нашчадкаў: «А толькі… гіне народ, калі на пачатку ягонай дарогі не з'явіцца такі, як вы (Шаўчэнка. – *Г.І.*), без кампрамісаў… З часам мірыяды людзей сальюцца ў любові да вас, таму што вы нідзе не саступалі, таму што справа ваша – высакародная, таму што такой любові, як ваша, яшчэ пашукаць на зямлі. Такой любові, калі адзін чалавек ратуе цэлы народ» [2, с. 184]. Т. Шаўчэнку прысвечана эсэ У. Караткевіча «І будуць людзі на зямлі» (1964).

Прыклад Т. Шаўчэнкі не толькі натхняў У. Караткевіча, але станавіўся ўзорам для грамадскай дзейнасці, аб чым сведчыць аўтарскае прызнанне: «Часам, у злыя гадзіны, я нават не ведаю, ці люблю я беларусаў, да якіх маю гонар належаць. За бязмежную цярпімасць да таго, чаго не трэба, за мяккасць, што мяжуе з рэптыльнасцю, за тое, што яны занадта сумленныя і «верныя Янукі». Але нават у тыя хвіліны я разумею, з пагардай да самога сябе (бо яны – гэта я), што адна справа не любіць чалавека і зусім іншая – не ратаваць яго, калі ён топіцца. Я стану ратаваць. Нават цаною гэтай паношанай шкуры і спрацаваных мазгоў, якія падсохнулі ўжо і тарахкаюць. І хаця на таўшчыню воласа, наколькі хопіць маёй сілы, я прыбліжу да іх паратунак. *Уратую іх*» [4, с. 181].

Быць прарокам у Айчыне даволі няпроста. У. Караткевіч, як ніхто іншы з беларускіх пісьменнікаў, адчуваў на сабе цяжар гэтай місіі, аднак не драматызаваў сітуацыю. У яго дзённіку ёсць запіс, поўны годнасці і мужнасці: «Пакуль самаасэнсавання няма, трэба проста, *горда і самотна рабіць сваю справу* (вылучана намі – *Г.І.*), не зважаючы ані на якія пляўкі, поўхі, страты. Відаць, пры такім становішчы біць будуць з усіх бакоў. Што ж, і гэта набытак. Такім, па-мойму, пакуль што яшчэ ніхто не мог пахваліцца. Калі вытрымаем – значыць, тытаны і не памрэм. Калі не вытрымаем – туды нам і дарога, шэлег нам кошт і смецце нам магіла. І іншага мы не варты. І хай яны тады здыхаюць, такія ўладары думак і такі народ, не пераводзяць дарма хлеб. Таму што кожны купляе права на жыццё маральнай стойкасцю, веліччу душы, у якую ніхто не мае магчымасці запусціць лапы» [4, с. 183].

Як сведчаць сучаснікі У. Караткевіча, самым цяжкім перыядам у жыцці пісьменніка была другая палова 1960-х – пачатак 1970-х гадоў, калі распачалося сапраўднае цкаванне аўтара «Каласоў пад сярпом тваім», калі ў кожным яго радку бачылі крамолу. «Побач з Васілём Быкавым Уладзімір Караткевіч успрымаўся тады ў Беларусі як галоўная асоба ў супрацьстаянні кансерватыўным колам, як найбольш небяспечны парушальнік спакою» [5, с. 97].

У няпросты жыццёвы перыяд У. Караткевіч напісаў эсэ «Saxifraga» (1971), прысвечанае Лесі Украінцы. Гэтым творам беларускі пісьменнік адгукнуўся на стагоддзе з дня нараджэння славутай валынянкі. Твор У. Караткевіча далучаў беларускага чытача да жыццёвага і творчага подзвігу Лесі Украінкі. У эпоху таталітарызму пераконваў сучаснікаў у тым, што свабода мастака вызначаецца не столькі знешнімі абставінамі, колькі ўнутраным светам асобы, яе духам і воляй. Жанр эсэ дазволіў У. Караткевічу стварыць не толькі захапляльны вобраз мужнай пісьменніцы, але і выказацца пра балючыя праблемы сучаснасці, выявіць майстэрства пісьменніка, публіцыста, перакладчыка. (У мастацкую тканіну эсэ ўключаны творы Лесі Украінкі, перастворaныя на беларускую мову У. Караткевічам).

Напэўна, каб заінтрыгаваць чытача, для назвы свайго эсэ У. Караткевіч выбірае лацінскае найменне расліны ламікамень – гэты вобраз выкарыстала ў сваёй творчасці Леся Украінка. Ва ўспрыманні беларускага пісьменніка названая кветка – мастацкае ўвасабленне няскоранага духу фізічна кволай, але надзвычай мужнай жанчыны. У даступнай займальнай форме У. Караткевіч запрашае чытача асэнсаваць не толькі крыніцы таленту Лесі Украінкі, але і каталізатары яе духоўнай энергіі. Расказваючы

пра бацькоў славутай валынянкі, беларускі пісьменнік звяртае ўвагу чытача на той факт, што бацька Лесі паходзіў «з паўночнай Чарнігаўшчыны, ледзь не з Беларусі» [3, с. 154]. Ад бацькі, лічыць аўтар эсэ, дзяўчынка ўзяла ў спадчыну «не толькі вонкавыя рысы, але і дабрыню бязмежную, цярплівасць, паблажлівую лагоднасць, сілу волі, бескарыслівае сумленне, крайнюю прыстойнасць, здольнасць хутчэй моўчкі пакутаваць самому, чым прыносіць пакуты іншым, і велічэзную павагу да годнасці чалавечай…» [3, с. 154]. Маці, украінская пісьменніца Алена Пчылка, выпеставала ў дзіцяці «здольнасці і ўкраінскае сэрца».

У. Караткевіч нібы запрашае чытачоў эсэ зрабіць завочную экскурсію па Валыншчыне, з любоўю апісвае Лесін беленькі дамок і непаўторныя палескія краявіды, народныя святы. Далучэнне дзіцяці да фальклорных традыцый спрыяла ўсведамленню Лесяй рэгіянальнай адметнасці краю, пераканання ў тым, што «мы не чарнігаўскія і не палтаўскія, а мы палешукі». На думку У. Караткевіча, наведванне дзецьмі ваколіц возера Нячымнага, гутаркі з пасечнікам Львом (які пазней стаў прататыпам дзядзькі Льва са славутай «Лясной песні») выпрацоўвалі ў душы Лесі адчуванне еднасці з Палессем, краем легенд і паданняў. Нездарма ў канцы жыцця душа ўжо вядомай пісьменніцы зноў вярталася сюды, ў край маленства, на святую зямлю бацькаўшчыны, з далёкай Грузіі, і за дзесяць-дванаццаць дзён была створана «Лясная песня». У. Караткевіч захапляецца гэтым творам, разважаючы аб яго жанры, адзначае: «Я не ведаю лепшага ў гэтым жанры. Бо гэта не п'еса, не драма, не феерыя нават, а вялікая паэма жыцця гэтай лясной і вадзяной зямлі» [3, с. 167].

Эскізна ў творы перадаецца цырымонія свята Вадохрышча, у час якой дзесяцігадовая таленавітая валынянка застудзіла ногі і на ўсё жыццё была распята на пакутніцкім крыжы невылечнай хваробы: «Палонка… Крыж з лёду, увянчаны голубам… Марозная пара ад вады… Чырвоныя ў сцюдзёным сонцы рызы… І вось праз два гады ўсё гэта адгукнулася» [3, с. 155].

Вінавацячыся перад чытачамі за жорсткасць, У. Караткевіч, аднак, прызнаецца, што ў страшнай бядзе, якая напаткала Лесю ў дзяцінстве, ён схільны бачыць «зерне станоўчага». Падставай для такіх высноў сталі назіранні аўтара за лёсам многіх жанчын-паэтэс, якія паклалі свой талент на алтар сям'і. «Уявім сабе, – піша У. Караткевіч, – уся энергія, уся любоў, увесь боль пайшлі б туды» [3, с. 161].

Адмежаваная ад сяброў-равеснікаў, знаходзячыся ў самоце, Леся самастойна авалодала дзясяткам замежных моў. Ліпучыя кайданы з гіпсу не перашкодзілі жанчыне няўтомна працаваць на карысць свайго народа, стаць «дасканалай паэтэсай, драматургам, празаікам.., цікавым і бездакорна праўдзівым і справядлівым крытыкам і публіцыстам, значным гісторыкам, этнографам, фалькларыстам, музыказнаўцам» [3, с. 156].

Сучаснікі, сябры У. Караткевіча, у сваіх успамінах пра пісьменніка адзначаюць яго выключную працаздольнасць. Творчая спадчына аўтара эсэ сведчыць пра шматграннасць таленту У. Караткевіча, апантанае слугаванне ідэі нацыянальнага, духоўнага адраджэння народа. Прыкладам для У. Караткевіча былі лёсы яго папярэднікаў – М. Багдановіча, Лесі Украінкі. Пісьменнік, якога часта папракалі за кніжнасць, адарванасць ад надзённага жыцця, лічыў, што ў «асобе Лесі Украінкі ва ўкраінскую літаратуру ўвайшло тое, чаго не хапала ў той час і ўкраінцам і нам: спалучаныя з высокай ідэяй інтэлігентнасць, вытанчанасць і, пры ўсёй нацыянальнай стыхіі, Сусветнасць у самым вышнім сэнсе гэтага слова. У нас гэта зрабіў Багдановіч, у іх – яна» [3, с. 161].

У падтэксце гэтай ацэнкі чуецца клопат У. Караткевіча пра стан літаратурнага жыцця ў 70-я гг. XX ст. Пісьменнік балюча перажываў негатыўнае стаўленне некаторых крытыкаў да яго гістарычнага рамана «Каласы пад сярпом тваім». Аповед пра дзейнасць Лесі Украінкі можна разглядаць як яшчэ адну спробу абудзіць

гістарычную свядомасць суайчыннікаў. З захапленнем расказвае У. Караткевіч, як небагатая, хворая ўкраінская пісьменніца на свае грошы арганізавала ў 1908 г. фальклорную экспедыцыю на Палтаўшчыну, каб зрабіць запісы дум і гістарычных песень, якія «выміралі ўжо тады». У. Караткевіч піша: «Сабрана было… два тамы. Да выдання другога Леся не дажыла. Але гэта таксама помнік ёй, вялікай выратавальніцы скарбаў» [3, с. 157].

Беларускі пісьменнік, захапляючыся ўчынкам Лесі, не мог не адзначыць, што лёс нашых нацыянальных скарбаў менш шчаслівы: «Царскія служкі знішчылі найбольш адметную, паэтычную, найбольш гістарычную з'яву быцця народнага» [3, с. 158]. У. Караткевіч свядома згадвае ў эсэ назвы беларускіх гістарычных песняў, якія чула яго маці ў выкананні лірнікаў, што хадзілі па вясковых хатах. Гэтыя спевы, пачутыя на кірмашы ў пасляваеннай Оршы, выклікалі ў Караткевіча слёзы. Пісьменнік так тлумачыць іх прычыну: «І плакаў, як усе вакол; плакаў, можа, не столькі ад спеваў, колькі ад адчування, што прысутнічаю пры сконе чагосьці гонарнага і велічнага. Таго, што ў самыя клятыя і чорныя часы не давала згаснуць святому адчуванню, што мы гордыя і вялікія людзі, калі мы стварылі такое» [3, с. 158]. Аналагічную рэакцыю выклікалі ў душы У. Караткевіча і спевы кабзароў: «Заплачкі, галошанне беларускае і паўночна-ўкраінскае, – вось што гэта нагадвала» [3, с. 159]. У велічным, спакойным і трагічным галашэнні бандурыста бачыцца У. Караткевічу «парастак гармоніі вышэйшай» [3, с. 159].

На думку пісьменніка, подзвіг Лесі Украінкі выяўляецца не толькі ў творчасці, у абароне слова і песні, але найперш у абароне годнасці чалавека і краіны. У. Караткевіч цытуе ў сваім эсэ фрагменты з гнеўнага артыкула пісьменніцы «Голас адной расійскай зняволенай», які мужная валынянка даслала ў французскую газету «La Reform», пасля таго, як увосень 1896 года рускага цара і царыцу віталі ў Парыжы не толькі афіцыйныя колы, але і некаторыя музыканты, артысты, пісьменнікі. Словы Лесі Украінкі былі надзвычай прыдатнымі і для ацэнак сацыяльнага і нацыянальнага жыцця ў СССР. Савецкая гістарыяграфія замоўчвала праблемы нацыянальнай дыскрымінацыі народаў у царскай Расіі. Паўстанне пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага інтэрпрэтавалася як сялянскі бунт супраць прыгону. Гістарычны раман У. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім», у якім пісьменнік паспрабаваў праўдзіва адлюстраваць пярэдадзень паўстання 1863 г., з вялікай цяжкасцю прабіваўся да чытача. Афіцыйная крытыка папракала пісьменніка ў парушэнні гістарычнай праўды. У эсэ Караткевіч згадвае, што рэдактар рамана «моцна пакрэмзаў» у адным раздзеле прамову чарнасоценнага прафесара Руніна, бо палічыў, што гэтай прамовай пісьменнік абражае суседні народ, прадстаўнікі якога не маглі так гаварыць пра сваіх малодшых братоў. У. Караткевіч прызнаецца, што ў аснову прамовы Руніна пакладзены думкі Рыціха, выкладзеныя ў кнізе «Пакрыўджаны край». Аўтар «Каласоў пад сярпом тваім» прыводзіць у эсэ цытаты з названай кнігі, дзе зневажаецца нацыянальны і чалавечы гонар беларусаў і ўкраінцаў. Згадваюцца ў творы і афіцыйныя дзяржаўныя дакументы, паводле якіх украінцам забаранялася ўжыванне роднай мовы. Аднак сіла закону аказалася слабейшай за сілу духу Лесі Украінкі. У. Караткевіч піша: «І хто б уступіўся за галодных і паняволеных, за радзіму, каб не Тарасаў цень, каб не Іван Франко, каб не гэтая слабенькая, кволая жанчына» [3, с. 162].

Заслуга ўкраінскай пісьменніцы бачылася У. Караткевічу яшчэ і ў тым, што «яна ваявала не толькі супраць прыгнятальнікаў, але і супраць хутарскога беспардоннага «патрыятызму», які лёкайствуе перад моцнымі, ліжа ім рукі, кідаецца ад гучных лозунгаў да халуйства… Супраць патрыятызму галушак і світак за патрыятызм адукаванай грамады, якая, вядома, і галушак не забыла, але дайшла да вышынь духу чалавечага, культуры чалавечай» [3, с. 163]. Гэтыя радкі можна ўспрымаць

і як водпаведзь У. Караткевіча тым крытыкам, якія абвінавачвалі пісьменніка ў адрыве яго творчасці ад жыцця, заклікалі пісаць у рэчышчы сацыялістычнага рэалізму. Леся Украінка была блізкай У. Караткевічу і па духу, і па творчых эстэтычных прынцыпах. Робячы інтэрпрэтацыю творчасці ўкраінскай пісьменніцы, ён адначасова тлумачыў чытачу і свае мастацкія прыярытэты. У. Караткевіч адзначае, што многія драматычныя творы Лесі Украінкі пераносілі чытачоў у далёкія краі і далёкія вякі, і гэтая акалічнасць успрымалася як загана. Беларускі пісьменнік не падзяляе пазіцыю некаторых даследчыкаў, уступае ў палеміку.

«Сучасная ёй – і не толькі сучасная – крытыка, – гаворыць пісьменнік, – часта рабіла паэтэсе закіды і папрокі ў «экзатычнасці». Я аніяк не згодзен з ёю. Тут не «экзатычнасць», а ўся тая самая праблема адхілення творчай думкі, што, ва ўмовах нецярпімасці і самавольства, блукае па чужых краінах, па краінах гісторыі, па краінах казкі» [3, с. 167]. Творчая думка У. Караткевіча таксама адкрывала беларускаму чытачу невядомыя старонкі занядбанай нацыянальнай гісторыі, абуджала гістарычную памяць. Сваю незакончаную аповесць, якую некаторыя даследчыкі лічаць працягам рамана «Каласы пад сярпом тваім», аўтар назваў «Зброя».

Сімвалічны сэнс гэтай назвы можа быць спасцігнуты праз асэнсаванне ацэнкі У. Караткевічам ролі Лесі Украінкі ў духоўным жыцці ўкраінскага народа: «Яна ведала мэту лепей за многіх, ведала шлях да яе. І сродкі дасягнення гэтай мэты як ніхто… *Спакойна і мужна рабіла сваю справу* (вылучана намі – *Г.І.*). Не яе справа была біцца. Яе справа была куць і сталіць зброю, якой, урэшце, перамогуць воіны яе народа, воіны ўсіх прыгнечаных зямлі, воіны, створаныя спецыяльна дзеля таго, каб перамагаць. Слова яе ўражвала, нішчыла, біла – значыць, перамагала і яна» [3, с. 163].

Аўтарскае сцверджанне сёння ўспрымаецца і як самаацэнка У. Караткевічам ўласнай жыццятворчасці, разгорнутым тлумачэннем таго, што будзе пасля ўкладзена ў радкі верша: «Быў. Ёсць. Буду».

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1987. – Т. 1. – 538 с.
2. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1989. – Т. 4. – 530 с.
3. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1991. – Т. 8. Кн. 2. – 495 с.
4. Караткевіч, У. У дарозе і дома: З запісных кніжак / У. Караткевіч // Полымя. – 1989. – № 1. – С. 164 – 183.
5. Мальдзіс, А. Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: Партрэт пісьменніка і чалавека / А. Мальдзіс. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 230 с.

Ishchanka H.M. **Uladzimir Karatkevich's Essay «Saxifraga»**

The subject of the article is Uladzimir Karatkevich's perception of the life and creative work of the classics of Ukrainian literature Taras Shevchenko and Lesya Ukrainka. The author has made historical and functional analysis of the essay «Saxifraga».

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 12.02.2011

УДК 811.161.3

І.У. Сацута

АСАБЛІВАСЦІ ПАРАДЫГМАЎ СКЛАНЕННЯ ПРЫМЕТНІКАЎ У СТАРАБЕЛАРУСКІМ ПЕРАКЛАДЗЕ «ГІСТОРЫІ АБ АТЫЛЕ»

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці ўтварэння і словазмянення прыметнікаў у старабеларускім рукапісным перакладзе аповесці «Гісторыя аб Атыле». У граматычным плане адбылося спрашчэнне скланення. У помніку адзначана пэўная колькасць традыцыйных, устарэлых форм, а таксама запазычанняў з польскага перакладу.

Воінская аповесць «Исторыя о Атыли короли угоръскомъ» паявілася ў старабеларускай літаратуры каля 1580 г. у складзе так званага Пазнанскага зборніка і ўяўляе сабой ананімны старабеларускі пераклад з польскага выдання гэтай аповесці, друкаванага перакладу Ц. Базыліка з лацінамоўнага твора «Athila» венгерскага гуманіста М. Олаха, напісанага ў 1538 г. у Нідэрландах і ўпершыню надрукаванага ў 1568 г. у Швейцарыі ў якасці ўстаўкі ў даследаванне па венгерскай гісторыі А. Банфіні [1, с. 540].

Прыметнік у старабеларускай мове існаваў ужо як сфарміраваная часціна мовы і меў сваю сістэму форм і катэгорый. Адрозніваліся прыметнікі іменныя, або кароткія, і займенныя, або поўныя. У перыяд ранняй усходнеславянскай пісьменнасці кароткія прыметнікі часткова захоўвалі яшчэ рысы архаічнага ладу мовы. Яны маглі ў сказе ўжывацца ў ролі азначэння поруч з поўнымі прыметнікамі і скланяліся, як назоўнікі з адпаведнымі асновамі. Пашырэнне займенных форм прыметнікаў у якасці азначэння прывяло да замацавання іменных прыметнікаў спецыяльна ў ролі выказніка (ці прэдыкатыўнага члена састаўнога выказніка). Вынікам замацавання кароткіх прыметнікаў у прэдыкатыўным значэнні з'явілася тое, што яны пачалі страчваць свае склонавыя формы і, значыцца, сваё ранейшае граматычнае значэнне. Адміранне старой сістэмы граматычных форм кароткіх прыметнікаў яскрава намецілася ўжо ў XIII ст., калі была страчана форма творнага склону адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду. У далейшым страчаны былі і астатнія формы ўскосных склонаў, за выключэннем вінавальнага. Устойліва ўжываліся толькі формы назоўнага склону адзіночнага і множнага ліку.

У старабеларускім перакладзе «Гісторыі аб Атыле» формы кароткіх *адносных і якасных* прыметнікаў прадстаўлены нязначна і з'яўляюцца, як правіла, вынікам царкоўнаславянскага ўплыву. У атрыбутыўнай функцыі кароткія формы адзначаны адзінкавымі прыкладамі тыпу *то єс҃ рє҃ ꙗвна [1, с. 123]; стрꙋга малючка была посерє҃ полѧ [1, с. 171]; С тоє ворожки Атылѧ, бꙋдꙋчы вэсо҃, заразо҃ тꙗгнꙋ҃ в дорогꙋ [1, с. 187]; Атылѧ фрасꙋнкꙋ полонъ водлє своєго звычаю школо мѣста ѣздилъ [1, с. 191]*.

Асноўнай жа іх сінтаксічнай функцыяй з'яўляецца ўжо прэдыкатыўная: *мѣсто... годно вєчное памꙗтки [1, с. 107]; Заправдꙋ быстра то битва а вєчное памєтки годна [1, с. 113]; мало нє всє полє было крываво [1, с. 115]; Ѣэцыѳ҃съне мо҃ быти бєзпечо҃ [1, с. 129]; нє хочє҃ ни в чо҃ винє҃ зоста҃ [1, с. 133]; з обꙋ сторон была поражка та҃к сроꙁка и крывава [1, с. 147]; мо҃ наша бꙋдє҃ цѣла завжды [1, с. 157]; то можє быти правдє подобно [1, с. 161]; єго дꙋху надхненью и воли мꙋшꙋ быти послꙋшо҃ [1, с. 167]; котры҃ бы єго силамъ ровенъ мо҃ быти [1, с. 181]; чысто҃ст҃ю и роду зацностью славна, а так*

хороша и^{к} цудне^{и}шое в м҃стє на^{а} нєє не было *[1, с. 193]*; **Атылм ... ра^{а} ждати будєть** *[1, с. 197]*; **Эмэрыѓ висиготски^{и} коро^{а} мало тэ^{ж} не такъ много л҃^{т} бы^{а} жы^{в}** *[1, с. 207]* .

Кароткія формы ўжываюцца часта паралельна з поўнымі, што сведчыць аб паступовым выцясненні іменных прыметнікаў займеннымі: **Была тэды быстра и великам битва** *[1, с. 111]*; **старам Ѵгорска кроиника свѣтчыть** *[1, с. 121]*; **повѣтрэ тихоє было, и нєбо гасно** *[1, с. 123]*; **м҃сто было людное, купецкими гандлмми велицэ и славно** *[1, с. 161]*. У большасці ж выпадкаў функцыю прэдыкатыўнага члена састаўнога выказніка выконваюць ужо поўныя формы: **Тотъ в которо^{м} самъ мешкалъ былъ шолковы^{и}** *[1, с. 119]*; **Ѵзрос^{т} ихъ бы^{а} не велми велики^{и}** *[1, с. 121]*; **Сама р҃чъ ес^{т} та^{к} великам и потребнам** *[1, с. 121]*; **єсть то наро^{а} быстры^{и}, дужы^{и}, мужны^{и}** *[1, с. 155]*; **м҃сто было людное** *[1, с. 161]*; **Атылм срокгимъ облежѐ^{и}ємъ былъ велми тажки^{и}** *[1, с. 165]*; **то^{т} тво^{и} лю^{а} не ес^{т} терпеливы^{и}** *[1, с. 167]*; **м҃сто ... было зацное и великое** *[1, с. 175]*; **Тоє жолнеро^{в} нарека^{и}є ачъколвєкъ Атыли было велми прыкроє** *[1, с. 189]*.

У множным ліку кароткія прыметнікі назоўнага і вінавальнага склонаў усіх трох родаў ужываліся ў старабеларускай пісьменнасці XV–XVII стст. часцей за ўсё з агульным для цвёрдай асновы канчаткам **-ы**. Даследуемаму помніку характэрна ўжыванне як новага, так і спрадвечнага канчатка мужчынскага роду **-и**, што сведчыць аб незавершанасці працэсу ўніфікацыі кароткіх форм прыметнікаў множнага ліку: **ѡбли^{ч}та на погледенью велми грозны** *[1, с. 121]*; **на мєстцэ тоє здоровы прышли** *[1, с. 145]*; **сѹть Ѵзросту высокого але на працу нетерпеливы** *[1, с. 145]*; **жолнерэ єго были пильны а готовы всє... мужнє зносить** *[1, с. 153]*; **бысте вы на дѹху здоровы были** *[1, с. 169]*; **Такъ за сѧ сѹть щастливы, несмертэльны А на жадные вѣки нигды нескончоны** *[1, с. 169]*; **сѧ всюды по м҃сту почали полны шаленоє запальчывости росходить** *[1, с. 169]*; **а за выступки телєсные єсмо винъни** *[1, с. 169]*; **до чого с прыроже^{и}м своєго склонъни ес^{т} єстє** *[1, с. 181]*; **рыцэръскихъ спра^{в} которые прыстоѧть мѹжнымъ людємъ гакъ єщє сперву склонни, а ѡхотни были єстє** *[1, с. 181]*; **силы ^{ѡх}тепе^{р} сѹть слабы** *[1, с. 183]*; **ѡни... готовы всякие раны поды^{и}мовати** *[1, с. 191]*; **Ани збро^{и}ни** мещане ани жадна небезпечно^{єст} не могла и^{ѵ} ѡ^{т} предсавза^{т}та гамовать *[1, с. 191]*. Кароткія формы выступаюць тут пераважна ўжо як прэдыкаты. Як і ў адзіночным ліку, у гэтай функцыі іх выцясняюць поўныя формы: **жерди на которы^{х} стоя^{а} были золотые** *[1, с. 119]*; **сѹть на тую надзѹ и на мѹкѹ терпеливые** *[1, с. 167]*; **прыроже^{и}та людъские бываютъ розные** *[1, с. 179]*.

У назоўным і пры неадушаўлёных назоўніках у вінавальным склонах адносныя і якасныя прыметнікі мужчынскага роду адзіночнага ліку пры цвёрдай аснове і аснове на шыпячы маюць традыцыйны нясцягнуты канчатак **-ый**(**-ы^{и}**): **на працу телєсную , на голодъ... велми терпеливы^{и}, рады доброє и смѣлы^{и}, ... до славы велми хотливы^{и}** *[1, с. 117]*; **Марсъ ѡсобливы^{и} нашого народу бо^{г} на^{м} допоможе** *[1, с. 143]*; **тотъ грубы^{и} наро^{а} бронити не будє^{т}** *[1, с. 167]*; **то^{т} побожны^{и} бискѹ^{п} ...поча^{а} гако и пере^{а} ты^{и} молитвы плачѹ пильные до бога чынити** *[1, с. 171]*; **тебе за таки^{и} злостливы^{и} Ѵчыно^{к} справедливы^{и} сѹд божы^{и} будєть ждати** *[1, с. 173]*; **на которомъ м҃стцѹ поставили столпъ камены^{и}** *[1, с. 113]*; **на постра^{х} непрыятелю Ѵчынили ѡгромны^{и} а страшливы^{и} ѡкрыкъ** *[1, с. 113]*; **ѡстато^{к} во^{и}ска справи^{а} в гѹфъ валны^{и}** *[1, с. 147]*; **Л҃вы^{и} ро^{г} засадилъ кгэпидами** *[1, с. 147]*; **Слышали в костєлє гакись дивны^{и} а страшливы^{и} шѹ^{м}** *[1, с. 173]*.

Адлюстраваннем жывога вымаўлення з'яўляецца ўжыванне канчатка **-ий** пасля заднеязычных, які выступаў як варыянтны пачынаючы з самага ранняга перыяду

старабеларускай пісьменнасці і ўказваў на памякчэнне заднеязычных: ***ведъже розумѣли то быть межы собою а межы Угры великиї муръ Дуна*** *[1, с. 107]*; ***мелъ гетманъ непрыятельскиї в тої битвѣ полечы*** *[1, с. 137]*; ***а єстэмъ король Угорскиї*** *[1, с. 161]*; ***люд хрестянскиї, с покорою падаючы до ногъ вашыхъ, просить*** *[1, с. 171]*; ***бы та на тотъ часъ... великиї шборонца*** *[1, с. 195]*; ***людъ рымъскиї... с покорою до тебѣ прышолъ*** *[1, с. 199]*; ***Атыла за коротки часъ добы все*** *[1, с. 127]*.

Пасля шыпячых зафіксаваны новыя формы з канчаткам цвёрдай разнавіднасці ***-ый*** (***-ыї***), якія ў старабеларускай пісьмова-літаратурнай мове ўсё часцей ужываліся побач з формамі мяккай разнавіднасці: ***В тотъ часъ Этэрєўсъ сын короля Анкгельского младенєцъ хорошыї цнотливыї и добрыхъ шбычаєвъ почалъ ся старать в малъженство w Уршулю*** *[1, с. 175]*.

Для поўных прыметнікаў жаночага роду ў назоўным склоне адзіночнага ліку пры цвёрдай аснове і аснове на шыпячы характэрны канчатак ***-ая*** (***-аѧ***): ***сила непрыятельскаѧ...не прыростала*** *[1, с. 133]*; ***то єстъ пэвнаѧ рѣчъ*** *[1, с. 149]*; ***Угорскаѧ велми у великої вонтпѣю*** *[1, с. 149]*; ***тыї напомина ємъ быстрость Угорскаѧ ничого ся не гамовала*** *[1, с. 171]*; ***влоскаѧ земля в коротцої часє... наша будетъ*** *[1, с. 185]*; ***горачаѧ кровъ єї на перси текла*** *[1, с. 205]*. Формы жаночага роду з мяккай асновай у помніку не зафіксаваны, як не зафіксаваны формы з мяккай асновай для поўных прыметнікаў ніякага роду, якія пасля цвёрдых зычных асновы ў назоўным і пры неадушаўлёных назоўніках у вінавальным склонах адзіночнага ліку маюць традыйны канчатак ***-ое***: ***воїско непрыятельское быть далеко боїшое*** *[1, с. 137]*; ***королевство французское... наї прыбудетъ*** *[1, с. 143]*; ***великое паїство широкое вельможное а паметное зажды было*** *[1, с. 183]*; ***зашло ємy дорогy... рымское воїско досыть великое*** *[1, с. 187]*; ***зобравшы новое воїско зашли наї дорогy*** *[1, с. 113]*; ***сэрцэ болзливое неякою надѣєю тешыї*** *[1, с. 139]*; ***што бы нещастъє воеїное принесло*** *[1, с. 139]*; ***столечное мѣсто свое ємy подати мѣї*** *[1, с. 147]*; ***Умыслиї паїство Угорское саї посѣсти*** *[1, с. 177]*.

У родным склоне адзіночнага ліку поўныя прыметнікі мужчынскага і ніякага роду з цвёрдай асновай зафіксаваны з традыцыйным для старабеларускай мовы канчаткам ***-ого***: ***тѣла у того столпа камеїого... поховано*** *[1, с. 115]*; ***бы середнего узросту, ... шбъліцаѧ чернавого, ... походy гордого*** *[1, с. 117]*; ***єстэсь биї божыї на караїє выступковъ людy хрестянского посланыї*** *[1, с. 135]*; ***Суть то знаки великого мужства и уродливого сэрца*** *[1, с. 153]*.

У жаночым родзе асноўнае месца займае ўсходнеславянскі канчатак цвёрдай разнавіднасці ***-ое***: ***бы... головы водле инъшыхъ членковъ померное, ... бороды редкое, ... руки хисткое и мужное*** *[1, с. 117]*; ***Много людеї з далекихъ краї до него ся з доброе воли своєе зъежчало*** *[1, с. 125]*; ***Тобѣ дотyль тое можности земское ужывати допуститї*** *[1, с. 137]*; ***рєка Лигеръ с правое стороны заважаєтъ, з лѣвое Родаї*** *[1, с. 141]*; ***wтї воли божое не wтїступили*** *[1, с. 167]*; ***Угровє с татарское земли вышли*** *[1, с. 207]*. Зафіксаваны тут і новы канчатак ***-ой/-ей***, які ўзнік у выніку рэдукцыі канцавога ненаціскнога ***е*** (***h***): ***ижъ ся всихъ влоскії земли справї и поступковъ wтї него Угровє довѣдали*** *[1, с. 129]*; ***напервї тэды до Стыры, Карынты, Словенскої и долмацкое земли вторгнyлъ*** *[1, с. 187]*; ***бы та на тотъ часъ бискyпої того мѣста панъ Аррыанскої сэкты великії шборонца*** *[1, с. 195]*; ***паметаючы на шбъѳитостъ земли Угорскої частокротъ сыны свои напомина*** *[1, с. 209]*. Пачатак адлюстравання такіх форм у пісьменнасці адносіцца к канцу XV ст. У прыватнасці, яны зафіксаваны ў «Пакутах Хрыста» і «Аповесці аб трох каралях-валхвах» [2, с. 150].

У давальным склоне адзіночнага ліку нязменныя з агульнаўсходнеславянскай эпохі формы мужчынскага і ніякага роду з канчаткам ***-ому***, а таксама жаночага роду на

-ой(**-о**^{и}) пры цвёрдай аснове: ***самъ шбавлѧ̀ сѧ давать штпо̀ такъ великому множству непрыятє̀ [1, с. 107]; во̀ско до дава̀ѧ штпору та̀ наглому непрыятелю по готову мѣлъ [1, с. 107]; тому злому на̀ вельцэ ѵтискаючому забѣгъ [1, с. 167]; смелє намовлѧла мещаны ку мужному зношенью того [1, с. 169]; чыстость свою Хрыстусу правдивому шфяровала [1, с. 177]; Тоє ночы... Марцыянови цэсарови константынопольскому снило сѧ [1, с. 205]; положы̀ сѧ недалеко ѡ̀ Дуная къ полуднево̀ стороне [1, с. 107]; здивившы сѧ много человѣка такъ мудро̀ вымове [1, с. 137]; видено комэту стегаючую полома свое ку заходно̀ стороне [1, с. 139].***

Зафіксаваныя ў «Гісторыі аб Атыле» поўныя прыметнікі жаночага роду з цвёрдай асновай у вінавальным склоне адзіночнага ліку маюць свой звычайны канчатак **-ую**: ***цэлую ночъ были сѣкли и забивали [1, с. 109]; всю дольную ѵгорскую зємлю... подъ свою мо̀ подбили [1, с. 113]; всюду великую поражку чынили [1, с. 115]; збудова̀ бы̀ собѣ подлую кучку на шно̀ мѣстцы [1, с. 133]; дѣвочку малючкую ... ѵ шыи собѣ на хустку ѵвезала [1, с. 163]; справившы... рѣчы на та̀ далекую дорогу потрєбные пустила сѧ морем з Брытанѣи [1, с. 175]; всю французскую зємлю, и ѵвесь захо̀ слонца звитажы̀ [1, с. 177].***

У творным склоне прыметнікі мужчынскага і ніякага роду ўжыты з канчаткам **-ымъ/-имъ**, які знайшоў шырокае адлюстраванне ў помніках розных жанраў: ***с посполиты̀ добромъ мо̀ радити [1, с. 117]; єго во̀ско перє̀ непрыятельскѝ меншое было [1, с. 139]; много мѣс̀ наглы̀ трєсеньємъ зємли ѵпало [1, с. 139]; которое трудности... з вами сполнє шднакѝ сэрцэмъ нє зносѝ [1, с. 141]; вы тэ̀ шхотны̀ а нє лякъливы̀ сэрцэ̀ на непрыятєлѧ натираитє [1, с. 145]; да̀ны̀ рыцэрскимъ звычає̀ ѵтвержоны [1, с. 149]; сутъ нєшгарнены смысломъ людскимъ [1, с. 169]; перє̀ ты̀ по̀ рымскимъ панова̀ємъ были [1, с. 183]; на кождого властны̀ єго прозвискомъ клика̀ [1, с. 193]; для чого бы надъ звыча̀ та̀ сѧ лацнымъ а мякъкѝ протѝ рымано̀ ставѝ [1, с. 199]; тягну̀ ... до тыхъ влоскоє зємли мѣстцъ которыє лежали на̀ морємъ адрыатыцкѝ [1, с. 197].*** Пры асновах на заднеязычныя ва ўсіх выпадках выступае канчатак мяккай разнавіднасці, які адпавядае норме жывой мовы.

У жаночым родзе адзінымі з'яўляюцца формы з двухскладовым канчаткам: ***стрєлючы на непрыятєлѧ розною бронею мешали ѝ [1, с. 115]; шднакою силою и сполны̀ накладо̀ во̀ну противъ ѵгро̀ вести и кончыть мели [1, с. 133]; Тягну̀ тогды Атыла з великою прудкостью на полє Каталяницъкоє [1, с. 139]; ѵмыслѝ смерть штцовъскую ѵгорскою кро̀ю шплатити [1, с. 149]; жывота небеского пэвною надѣєю шжыдати будємъ [1, с. 167]; будучы звитажоны крєпкостью человѣчою... вѣры которую вызнали ѡ̀ступать [1, с. 167].***

Поўныя прыметнікі мужчынскага і ніякага роду ў месным склоне адзіночнага ліку маюць характэрны для старабеларускай пісьменнасці канчатак **-омъ/-емъ**: ***в люду ѵгорскомъ великую поражку чынили [1, с. 109]; товарышо̀ своѝ на право̀ рогу поставѝ [1, с. 147]; Эцыѵсъ з рымскимъ людо̀ на лѣво̀ рогу сталъ [1, с. 147]; значыло сѧ, ѝ в коротко̀ часє мѣсто до єго ру̀ пры̀ти мѣло [1, с. 191]; постановѝ ... посты въ Єдорє мѣстє далматско̀ [1, с. 179]; в каждомъ щастливо̀ и нещастливо̀ повожє̀ю показова̀ сѧ [1, с. 141]; Санкгибана короля... в середнемъ гуфє поставили [1, с. 147]; ѵгорскаѧ рє̀ велми ѵ велико̀ вонтпє̀ю [1, с. 151]; видє̀ чоловѣка в шыроко̀ шдѣнью [1, с. 201].***

У месным склоне адзіночнага ліку прыметнікам жаночага роду з цвёрдай і зацвярдзелай асновай характэрны старабеларускі канчатак **-ой** (**-о**^{и}): ***Матэрнови перед ты̀ на велико̀ помочы были [1, с. 121]; збурє̀ѧ Рыму и смерть некажого а̀***

по каталанскоⷨ битвѣ стала [1, с. 127]; Атыла франсоваᵛ сѧ ѡ нефортунноⷨ прошлоⷨ битвѣ повожⷣѥ [1, с. 137]; небезпечно в земли непрыѧтельскоⷨ битвꙋ давать [1, с. 141]; ѥсмо в ѡбчоⷨ земли много королевъ и много народоᵛ мꙋжнѥ звитѧжыли [1, с. 143]; Хаба недолго в татарскоⷨ земли бꙋдꙋчы живъ ꙋмеᵖ [1, с. 209].

У назоўным і пры неадушаўлёных назоўніках у вінавальным склонах у агульнаўсходнеславянскай мове поўныя прыметнікі множнага ліку мелі канчаткі ў залежнасці ад роду. Для старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы былі характэрны дваякія формы. З аднаго боку, з самых ранніх пісьмовых крыніц да XVIII ст. назоўны склон множнага ліку поўных прыметнікаў усіх трох родаў афармляўся пры дапамозе канчатка мужчынскага роду *-ыи/-ии*. З другога боку, ужо ў ранні перыяд тут замацоўваецца канчатак жаночага роду *-ые/-ие*, які паступова ў старабеларускай пісьменнасці стаў пануючым [2, с. 158]. Сістэма форм членных прыметнікаў назоўнага і вінавальнага склонаў множнага ліку ў беларускім перакладзе «Гісторыі аб Атыле» адлюстроўвае ўніфікацыю форм толькі па жаночым родзе: *мешкали розные народы [1, с. 107]; конскиѥ ꙋберы золотом и дорогими каменьми были ѡсажоны [1, с. 119]; жерди... были золотые [1, с. 119]; Маю за тоѥ же ѥси ѡбачыᴬ знаки небесные [1, с. 137]; ѡщепы ѡгнистые з обополнѥ сѧ черѣᶻ него пробивали [1, с. 139]; легъкиѥ ꙋтарчки чынили [1, с. 145]; пышныѥ слова почаᴬ мовити [1, с. 159]; мои милые мещанѥ, бачꙋ в собѣ годности [1, с. 167]; ѥⷨ ещѥ дано волные тры лѣта [1, с. 175]; мѣстечка и великиѥ мѣста... шабли вашоѥ нѥ бомли сѧ [1, с. 183]; теперъ протиᵛ вамъ силы зꙋполныѥ [1, с. 183]; которыѥ такъ люди мужные ꙗко тэ᷑ гнюсныѥ а ничэмныѥ [1, с. 183]; мѣста вѥлми богатые и вѥлми хорошыѥ збꙋрылъ [1, с. 187]; мꙋры пустые вабили ѥго до того [1, с. 189]; искры ꙗкъ бы ѡгнистые блискали [1, с. 191]; дѣти свои ещѥ голыѥ... в гꙋбѥ по ѡдномꙋ носилъ [1, с. 191]; Молодые и старые ѡднако забивали [1, с. 193]; ѡныѥ дꙋжые тѣла ... такъ сѧ ледачыⷨ бавѧть [1, с. 193]; вси браны мѣстскиѥ зараз были поѡᵛвалены [1, с. 197]; вино и вэнусъ... за збытныⷨ ꙋжываⷨѥⷨ сꙋть небезпечныѥ [1, с. 205].* Як і ў іншых склонах, канчатак мяккай разнавіднасці знаходзім пасля заднеязычных, цвёрдай – пасля шыпячых, якія зацвярдзелі.

У родным, вінавальным (пры адушаўлёных назоўніках) і месным склонах множнага ліку поўныя прыметнікі ўсіх трох родаў маюць унаследаваны ад агульнаўсходнеславянскай эпохі сцягнуты канчатак *-ыхъ/-ихъ*, які замацаваўся ў якасці нормы: *стали ѕ людеⷨ потомныхъ памѧткою [1, с. 113]; быᴬ ... плечеⷨ шыроκиᵡ,... ѡчю свѣтлыᵡ [1, с. 117]; ѡдѣнье было с косматыᵡ скꙋᵖ [1, с. 121]; кготтовѥ за давныᵡ часоᵛ ѡᵀнесли были ѡᵀ ꙋгровъ крывдꙋ [1, с. 131]; Много знакоᵛ небескихъ тоѥ битвы назначало сроκгость [1, с. 139]; Атыла... ꙋшоᴬ рꙋᵡ рымскиᵡ [1, с. 159]; троха бѣлыᵡ головъ што хороⷨшыᵡ зоставили [1, с. 193]; Атыла большеⷨ сѧ боитъ дикихъ звераᵀ [1, с. 201]; Вжѥ быᴬ Атыла з влоскиᵡ граниᵘ вытѧгнулъ [1, с. 201]; ничого на насъ в тыᵡ рѣчаᵡ свѥцкихъ таᵏ тѧжко нѥ прындеᵀ [1, с. 167]; которыхъ потоⷨ послуги и дꙋжости ѕ многиᵡ рыцэрскиᵡ рѣчаᵡ ѡжываᴬ [1, с. 195]; доставшы вечноѥ славы по тѧжкиᵡ а долгихъ працаᵡ... покою ѡжывали [1, с. 201]; ѡмыслиᴬ быᴬ по так великиᵡ воⷨнаᵡ ... ѡᵀпочынꙋть [1, с. 203].*

Новыя сцягнутыя канчаткі з’яўляюцца адзінымі адпаведна ў давальным і творным склонах: *казаᴬ раⷨныѥ до ѡбозꙋ ѡᵀводить а свѣжыⷨ на тоѥ мѣстцо наступовать [1, с. 191]; перѣᴬ давными часы гꙋновѥ... были положыли сѧ были ѡбозоⷨ надъ рѣкою Тисою [1, с. 107]; конскиѥ ꙋберы золотоⷨ и дорогими каменьми были ѡсажоны [1, с. 119]; з великими воⷨски зъѣхали сѧ [1, с. 137]; небо сѧ*

крывавыми *вороты* ***w***^{т}*ворыло [1, с. 139];* ***многими*** *словы* ***м***^{ѣ}***лъ ва***^{с} *до того намовлати [1, с. 141];* ***короткими*** *словы та*^{к} *имъ* ***w***^{т}***повѣда***^{ѧ} *[1, с. 167];* ***Тые зо многими мещаны аквилеенскими...*** ***ѵ***^{т}*екли были до некоторое выспы [1, с. 187].* Формы парнага ліку ў старабеларускім перакладзе не зафіксаваны. На іх месцы ўжываюцца прыметнікі ў форме множнага ліку: ***два властные сыновє... вели спо***^{ѳ} ***з собою w панство*** *[1, с. 207]. Прыналежным* прыметнікам уласціва пэўная спецыфіка ў словаўтваральных і марфалагічных адносінах. У старабеларускай мове яны ўтвараліся пераважна ад адушаўлёных назоўнікаў пры дапамозе суфіксаў ***-ов***, ***-ев***, ***-ин***, ***-ьjь-*** (***-jь-***), ***-н-***. У агульнаўсходнеславянскі перыяд прыналежныя прыметнікі скланяліся па іменным тыпе. Пад уплывам адносна-якасных прыметнікаў яны пачалі набываць поўныя формы скланення. Аднак побач з поўнымі працягвалі захоўвацца і кароткія. У такім стане сістэма форм прыналежных прыметнікаў уласціва і мове старабеларускага перакладу «Гісторыі аб Атыле».

У назоўным і пры неадушаўлёных назоўніках у вінавальным склонах адзіночнага ліку прыналежныя прыметнікі ўсіх трох родаў захоўваюць ранейшыя іменныя формы: ***тытꙋ***^{ѧ} ***Атыли которы***^{и} ***сѧ писа***^{ѧ} ***то***^{т} ***бы***^{ѧ} ***Атꙋла сын Бэндэкгэчо***^{ѳ} *[1, с. 121];* ***Ацыѵсо***^{ѳ} ***лю***^{ѧ} *...* ***первє***^{и} ***поча***^{ѧ} ***пирхать*** *[1, с. 149];* ***Пото***^{и} ***ѵмысли***^{ѧ} *...* ***ѵдарыти на wбозъ Атылє***^{ѳ} *[1, с. 149];* ***страшна была можность Атылєва*** *[1, с. 177];* ***повѣдили пꙋстэлниково пророчество быти правдивоє*** *[1, с. 137];* ***Тотъ... на мѣстцо Костанцыѵсово надъ всими во***^{и}***ски... прєложо***^{и} *[1, с. 129].* І толькі прыметнікі, утвораныя пры дамазозе суфіксаў з элементам ***j***, ужыты, як правіла, у поўнай форме: ***и єстэмъ король ѵгорски***^{и} ***би***^{и} ***божы***^{и} *[1, с. 161];* ***ѵблагали гнѣ***^{в} ***божы***^{и} *[1, с. 163];* ***справєдливы***^{и} ***сꙋ***^{ѧ} ***божы***^{и} ***бꙋдєть ждати*** *[1, с. 173].* Поўныя формы такіх прыметнікаў з'яўляліся пануючымі ў тагачаснай старабеларускай пісьменнасці. Адпаведныя іменныя формы сустракаюцца даволі рэдка: ***млсрдьє бо***^{ж}***є*** *мимо вси иншыє людкиє речы завжды важнєшыє быти розꙋмѣємъ [1, с. 165].* Яны ўласцівы выключна раннім старабеларускім помнікам пераважна рэлігійных жанраў. На гэтай падставе можна сцвярджаць, што іх не існавала ў жывой народнай мове таго часу [2, с. 164].

У родным і пры адушаўлёных назоўніках у вінавальным склонах прыналежныя прыметнікі мужчынскага і ніякага родаў ужываюцца выключна ў поўнай форме, чым старабеларускі пераклад вылучаецца сярод тагачасных пісьмовых помнікаў: ***на паметкꙋ имєнꙗ Атылєвого вси***^{и} ***людємъ волны***^{и} *до* ***мѣстца шного былъ прыстꙋ***^{и} *[1, с. 127];* ***гдѣ за жывота єщэ Гонорыѵсового мешкаючы ѵ Атыли и ѵ***^{к} ***ѵгро***^{в} ***бы***^{ѧ} ***в ласцэ*** *[1, с. 129];* ***довѣдавшысѧ w***^{т} ***шпѣкго***^{в} ***ѵмыслꙋ Тразимꙋнъдового ... прызва***^{ѧ} *до* ***себє свои***^{х} ***жолнєро***^{в} *[1, с. 149];* ***которам заправдꙋ з божого допꙋще***^{и}***м походить*** *[1, с. 169];* ***вшєдши до покою Атылєвого нашли и***^{ж} ***с кро***^{в}***ю дꙋша з него давно вышла*** *[1, с. 205];* ***року w***^{т} ***нарожє***^{и}***гꙗ Хрыстꙋсового трыста сємдєсѧ***^{т} ***трєтєго*** *[1, с. 205];* ***гєтма***^{и} ***во***^{и}***ска Атылєвого... з народꙋ и***^{х} ***нємєцкого пошо***^{ѧ} *[1, с. 209].* У старабеларускай пісьменнасці займенная форма роднага склону гэтых прыметнікаў усё часцей пачынае замяняць іменную з канца XV ст. Аднак пануючай займенная форма ў родным склоне прыналежных прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду становіцца толькі ў пісьмовых крыніцах XVII ст. [2, с. 165]. Відавочна, што ў жывой народнай мове поўныя формы выцеснілі іменныя формы роднага склону прыналежных прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду яшчэ раней, што і знайшло адлюстраванне ў беларускім перакладзе «Гісторыі аб Атыле».

Некалькі іншы малюнак у жаночым родзе. У адрозненне ад мужчынскага і ніякага роду, тут назіраецца паралельнае ўжыванне іменных і займеннікавых форм. Прыналежныя прыметнікі жаночага роду з цвёрдай асновай фіксуюцца ў іменнай форме з канчаткам ***-ы***, у займеннай – з новым канчаткам ***-ой*** (***-о***^{и}) на месцы больш

архаічнага *-ое*: *wбовлаючыся силы Атылевы много королевствъ розшыроны [1, с. 123]; рады Атылевы добрэ былъ свѣдо" [1, с. 137]; не ждучы wт поведи Валентыновы w малъженство Гонорын понялъ Микольту [1, с. 203]; ничого далє" писати на тот часъ не ўмыслилъ щдно до смерти Атылевы [1, с. 209]; Атыла мѣлъ прагнути прыязни Тэщдорыково" [1, с. 131]; шкромъ воли божое жадное моцы не будєть мѣти [1, с. 137]; далеко wт дороги Атылево" лежачо" [1, с. 161]; Эцыўсъ будучы свѣдо" рады Трызымундово" wбавя сл [1, с. 153]*. Паралельнае ўжыванне іменных і займенных форм у родным склоне прыналежных прыметнікаў жаночага роду было характэрна і для іншых помнікаў старабеларускай пісьменнасці. Праўда, іменныя формы сустракаюцца тут значна радзей, пераважна ў дзелавых і свецкіх жанрах [2, с. 166]. З форм давальнага склону зафіксавана толькі ўтвораная пры дапамозе суфікса з элементам *j* поўная форма ад прыналежнага прыметніка мужчынскага роду: *все тобѣ јако слузе божому послушно будєть [1, с. 161]*. У вінавальным склоне прыналежныя прыметнікі жаночага роду выступаюць у іменных формах: *мещане выразумевшы волю Атылеву... короля до мѣста ўпровадили [1, с. 197]; во все" здаєт сл на волю папежову [1, с. 201]; на голову папежову видя чоловѣка [1, с. 201]; сестреницу Атылеву за собою мѣлъ [1, с. 207]*. Звычайна кароткія формы мелі і іншыя помнікі старабеларускай пісьменнасці.

У творным склоне рэдкія ў даследуемым тэксце прыналежныя прыметнікі ўсіх трох родаў маюць, як правіла, поўныя формы з традыцыйнымі канчаткамі: *его звано бичо" божы" [1, с. 159]; которое вже му сл давно было за намовою Аэцыусовою захотѣло [1, с. 131]; звитажоны крепкостью чоловѣчою [1, с. 167]; чого єстє не так далецэ силами вашыми, јако божымъ допущє"є" достали [1, с. 171]; Постараю сл w тое за помо"ю божею [1, с. 185]*. Спарадычна ўжываюцца кароткія формы жаночага роду тыпу *хочєт... непрыятельскоє во"ско ўгорски" во"ско" и мужство" за бо"ю помо"ю поразить [1, с. 151]*.

У месным склоне пад уплывам жывой народнай мовы замацаваліся займенныя формы: *w жывотє Атылево" ничого пэвного не вѣдалъ [1, с. 177]; въ wбозє Атылево" вєлми трудно было w жывность [1, с. 189]; w во"скy Аэцыўсово"... пэвное вѣдомости не мѣлъ [1, с. 129]; по смерти Атылево"... повторнє зємлю ўгорскую были посѣли [1, с. 209]*. Такая ж сістэма форм творнага склону адзіночнага ліку характарызуе і старабеларускую пісьменнасць разглядаемага перыяду.

У назоўным і пры неадушаўлёных назоўніках у вінавальным склонах множнага ліку прыналежныя прыметнікі ў «Гісторыі аб Атыле», як і ў старабеларускай мове, звычайна ўжываюцца ў іменных формах: *Атылевы сыны... кождy" хотя на себе па"ство посѣсти [1, с. 209]; Атыла... тые слова пустэльниковы ўчя [1, с. 137]; прея сл тые слова Давыдовы вымовила [1, с. 173]*. Для прыметнікаў жа, утвораных пры дапамозе суфіксаў з элементам *j*, звычайнай, як і ў старабеларускай мове, з'яўляецца поўная форма: *глѣдєвшы на тыѫ местъ водле наўки своєє на черова быдлачые повѣдили [1, с. 137]*. Ва ўскосных склонах множнага ліку прыналежныя прыметнікі маюць толькі поўныя формы: *будучы... поражо" зъ шєстмадесят братоѫ своиѫ невластныѫ сыноѫ Атылевыѫ [1, с. 209]; до которого тытулу пото" для слоѫ пустольниковыѫ прыда би" божы" [1, с. 121]; ўгровє wт гэтманов Тэщдозыўсовыѫ щдною битвою были звитажоны [1, с. 121]; што Атылевы" жолънеромъ пере тымъ выражали [1, с. 163]; на wстатоѫ будучы Дэтрыковыми фортэльми поражо" [1, с. 209]*. Толькі поўныя формы ва ўказаных склонах множнага ліку прыналежных прыметнікаў характэрны былі ў часы стварэння беларускага перакладу «Гісторыі аб Атыле» і для іншых пісьмовых помнікаў. Канчаткі поўных прыметнікаў пры афармленні ўскосных

склонаў прыналежных прыметнікаў характэрны для сучаснай беларускай мовы. Зафіксаваныя ў парадыгмах скланення прыметнікаў фанетычныя і ўніфікацыйныя змены і пераўтварэнні адлюстроўваюць агульнае развіццё граматычнага ладу старабеларускай мовы.

Самым пашыраным сродкам утварэння форм вышэйшай ступені параўнання якасных прыметнікаў у даследуемым помніку з'яўляецца складаны суфікс ***-ейш-*** (***-е"ш-***): ***довѣда^ сѧ чого пэвне"шого*** *wколо повоженьм свои^ рѣче"* *[1, с. 137]*; ***што бы было на^ то подобенство ѹтека"ѧ соромотне"шого*** *[1, с. 141]*; ***што намъ спросне"шого,... непрысто"нѣ"шого, што продковъ нашы^ мужству противне"шого*** *[1, с. 141]*; ***цудне"шое в мѣстѣ на^ неє не было*** *[1, с. 193]*; ***на wстатокъ славу непоследне"шую... wздобимъ*** *[1, с. 143]*; ***Валлми" с правого боку... рымски" чолне"шы" лю^ wстрє нагревалъ*** *[1, с. 147]*; ***wхотне"шы" вжо сэрцэмъ ждали всяки^ прыго^*** *[1, с. 169]*; ***не суть тые над продки свои кготы ани зацне"шые ани мужне"шые*** *[1, с. 143]*; ***На чолѣ постави^ другіе дробне"шые короли*** *[1, с. 145]*; ***за гэтмано" смѣлъшые шли*** *[1, с. 151]*; ***руки тымъ волне"шые мѣла*** *[1, с. 163]*; ***ѹда^ сѧ до скромне"шых А людє" прысто"не"шых wбычає^*** *[1, с. 123]*. Формы вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў маюць паказчыкі роду і ліку, скланяюцца, як і іншыя прыметнікі займеннага скланення. У такім выглядзе яны былі шырока распаўсюджаны як у старабеларускай літаратурнай мове, так і ў народных гаворках таго часу. Значна шырэй, чым у сучаснай беларускай мове, выкарыстоўвалася ў старабеларускі перыяд форма вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў на ***-ш-***, якая ў наш час утвараецца толькі ад некаторых прыметнікаў, напрыклад, ***стары – старшы*** (побач са ***старэйшы***), ***малады – малодшы*** (побач з ***маладзейшы***) [2, с. 173]. Такая форма шырока прадстаўлена ў разглядаемым помніку, прычым часта ўжываецца ў адным сказе паралельна з формамі вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў на ***-ейш-***: ***по то" стороне... мы^ былъ слабшы"*** *[1, с. 191]*; ***не хоче" пры"ти в неволю которая далеко срожшая єсть нижли смертъ*** *[1, с. 141]*; ***тоє па"ство... просторне"шэ шыршэ и зацне"шэ пре^ тымъ бывало*** *[1, с. 183]*; ***ничого знаменитшого а до захова"ѧ панства на долги" ча^ безпечне"шого быти не може*** *[1, с. 131]*; ***што на" бо' лѣпшого пожыточне"шого и щаствлившого може дати надъ тоє*** *[1, с. 143]*; ***срожшую пилне"шую а небезпечне"шую потрєбу мѣли єсмо передъ собою*** *[1, с. 139]*; ***завжды то за рѣ" хоро"шую почытано*** *[1, с. 141]*; ***ѹгрове могли рокъ короткшы" личыти*** *[1, с. 207]*; ***его ласкавшы" противъ на" ѹчынить не мѣли*** *[1, с. 165]*; ***за гэтмано" смѣлъшые шли*** *[1, с. 151]*; ***троха бѣлы^ головъ што хоро"шы^ зоставили*** *[1, с. 193]*.

Дастаткова прадстаўлена і форма вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў, утвораная суплетыўна пры дапамозе суфікса ***-ш-*** ад іншых асноў: ***во"ско непрытельскоє быть далеко бо'шое нижли перве" мнима^*** *[1, с. 137]*; ***не меншого мужства надоби до захова"ѧ королевствъ нижли до набыва"ѧ*** *[1, с. 117]*; ***сѧ мы до лепшого способу жы"ѧ наверънє"*** *[1, с. 163]*; ***ты" большому ѹпадку а небезпечности тепе^ подъданы єстъ*** *[1, с. 183]*; ***завжды то за рѣ" лѣпшую... почытано*** *[1, с. 141]*; ***сэрцэ лепшое взяли*** *[1, с. 149]*; ***бысмы не то'ко большы" пожыто^ Але тэ^ и большую славу w"несли*** *[1, с. 155]*; ***не завжды лѣпшы" звыкло зычливо быти*** *[1, с. 151]*; ***никгды пре^ сѧ большыхъ мужства своєго не wказа^ знако^*** *[1, с. 143]*; ***дѣвочокъ сємъ большыхъ мѣла wколо себе*** *[1, с. 163]*; ***двоє меншы^ всадила на быдла*** *[1, с. 163]*. Падобныя ўтварэнні вельмі шырока адлюстроўваюцца ў старабеларускай пісьменнасці.

Самым актыўным спосабам утварэння найвышэйшай ступені параўнання прыметнікаў у старабеларускай мове было выкарыстанне прыстаўкі ***най-***, якая

далучалася да форм вышэйшай ступені. Радзей сустракаецца сцягнуты варыянт указанай прыстаўкі **на-**, прыкметна пашыраны і ў старабеларускай пісьменнасці [2, с. 174]. Ні старасла вянскай, ні агульнаўсходнеславянскай мовам такая прыстаўка не была ўласціва. Затое яна была характэрна для старапольскай мовы, якая і стала, верагодна, крыніцай яе для старабеларускай мовы, у тым ліку і для мовы беларускага перакладу «Гісторыі аб Атыле». Тут зафіксаваны толькі формы з прыстаўкай **на-**: ***А и҃ мене ѡ наможне҃шы҃ межы корольми до того прыневолѧе҃*** (параўн. польск. *A iź mię o* ***patęźnieyszy*** *między krolmi do tego przyniewalasz*) *[1, с. 479]*; ***конь што налепшы҃ и наверне҃шы҃...*** ***нагле здо҃к*** *[1, с. 207]*; ***позбиравшы трупы свое, а набольше҃*** ***Кэвы гетмана з великою скорботою ѡбычаемъ татарскимъ погребли*** *[1, с. 113]*; ***Та҃*** ***тэ҃к часу набольшого нещастѧ а правє ѡстатнего крэсу богу душу дали*** *[1, с. 171]*; ***намужне҃шꙋю и напотꙋжне҃шꙋю*** ***часть ... восполо҃к зо мною з домов ихъ выгнали естє*** *[1, с. 143]*; ***са҃ з людо҃ што начольне҃шымъ свои҃*** ***подлє хорꙋгви ста҃*** *[1, с. 145]*; ***нє вонтплю ничого ѡ вашои҃, жолнеры шлахэтные а товарышы наверне҃шые в потребахъ, мужстве*** *[1, с. 139]*; ***двѣ рѣчы на во҃не сꙋть напредне҃шые*** *[1, с. 185]*; ***насильне҃шые народы ѡ҃т ѡсходу слонца пэръсове*** (параўн. польск. ***patoźnieyszy*** *narodowie od wschodu słoncá persowe*) *[1, с. 468]*; ***воли҃т набо҃шые нєбезпечности поднати нижли сѧ дати звитѧжыти*** (параўн. польск. *á woli* ***nawięsze*** *niebespieczność́i podiąć niźli sie dáć zwyciężyć [1, с. 495]*.

У старабеларускім перакладзе маюць месца і апісальныя формы выражэння найвышэйшай ступені параўнання шляхам спалучэння слоў ***вельми***, ***самый*** з зыходнымі формамі прыметнікаў: ***Атыльла... бы҃ ... на студень и на горачность велми терпеливы҃, ... до славы велми хотливы҃, ... велми росторопны҃ и хитры҃*** *[1, с. 117]*; ***ѡзрос҃т ихъ бы҃ нє велми великы҃, але ѡбли҃ча на погледенью велми грозны҃*** *[1, с. 121]*; ***Атыла сокгимъ облеже҃ємъ бы҃ велми тѧжки҃*** *[1, с. 165]*; ***Тое жолнеро҃в нарека҃є ачъколвє҃к Атыли было вельми прыкрое*** *[1, с. 189]*; ***жолнеры єго нашли на҃ прервою некоторое горы велми высокое нєякого пысты҃ника*** *[1, с. 133]*; ***муси҃ ѡ нє҃ велми пилное стара҃є мѣти*** *[1, с. 139]*; ***понялъ Милькоту ...паненку вельми хорошꙋю*** *[1, с. 205]*; ***бысте сѧ роспусне срожыли въ звитѧжстве которое звитѧжоны҃ часто кроть Фольговали а на самые пышные сторожыть сѧ звыкло*** *[1, с. 171]*; ***много ѡборо҃ны҃к мѣстъ сэкванскихъ и францускы҃к вельми богаты҃к и зацны҃к ... з кгрунтꙋ выверꙋ҃а и збуры҃*** *[1, с. 127]*. Апісальны спосаб выражэння найвышэйшай ступені параўнання прыметнікаў, атрыманы ў спадчыну ад агульнаўсходнеславянскай мовы, быў уласцівы старабеларускай пісьменнасці і жывой народнай мове.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Золтан, А. «Athila» М. Олаха в польском и белорусском переводах XVI века / А. Золтан. – Ниредьхаза, 2004. – 554 с.

2. Булыка, А.М. Гістарычная марфалогія беларускай мовы / А.М. Булыка, А.І. Жураўскі, І.І. Крамко. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 327 с.

Satsuta I.V. **The Specific Morphological Features of the Adjectives in the Old Belarusian Translation of the «Attila's History»**

The article deals with the peculiarity of the adjective's formation and inflection in the old Belarusian translation of the «Attila's history». The simplification of the declension took place in the grammatical plan. A certain amount of the traditional, obsolete forms, as well as borrowings from the Polish translation are fixed in the literary monument.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 15.04.2011

УДК 81:39(476)(07)

Л.Ф. Станкевіч

УСТОЙЛІВЫЯ АДЗІНКІ МОВЫ З КАМПАНЕНТАМІ – НАЗВАМІ СВОЙСКІХ ЖЫВЁЛ (*КОНЬ, КАБЫЛА, ЖАРАБОК, ЖАРАБЯ*)

Аналізуецца этналінгвістчыны змест устойлівых адзінак мовы (фразеалагізмы, прыказкі і ўстойлівыя параўнанні) тэматычнай групы конь, кабыла, жарабя. Падаецца этымалогія і семантыка ўстойлівых адзінак.

Дабрабыт селяніна вельмі цесна быў звязаны *са свойскімі жывёламі* ў яго гаспадарцы. Але жывёлы былі для людзей не толькі крыніцай харчавання і адзежы. Шмат стагоддзяў нашы продкі назіралі за паводзінамі, асаблівасцямі характару той ці іншай жывёлы. Вынікам такіх назіранняў і з'явілася стварэнне ўстойлівых адзінак мовы з кампанентамі-назвамі *свойскіх жывёл*.

Мэтай нашай працы з'яўляецца аналіз устойлівых адзінак мовы з кампанентамі-назвамі *буйной свойскай жывёлы* (*конь, кабыла, жарабок, жарабя*). Крыніцамі для аналізу сталі фразеалагічныя і парэміялагічныя слоўнікі-працы, у тым ліку А. Аксамітава [1], Ф. Янкоўскага [2], І. Лепешава [3] і М. Якалцэвіч [4], С. Мілач [5]. У гэтых працах прыводзіцца таксама ўнікальны моўны матэрыял з фондаў І. Насовіча, Я. Ляцкага, М. Федароўскага, Е. Раманава, П. Шэйна і інш.

Конь – буйная свойская аднакапытная жывёліна, якая выкарыстоўваецца для перавозкі людзей і грузаў, а таксама для верхавой язды. Кабыла – самка каня. Жарабок (жарабец) – непакладаны конь; конь-самец. Жарабя – дзіцяня каня. У земляробчым плане ніводная беларуская сям'я не магла абысціся без валоў ці коней; амаль да сярэдзіны XX стагоддзя конь выкарыстоўваўся на Беларусі ў якасці асноўнай цягавай жывёлы. (Параўнайце: Я. Колас называе трактар, які прыйшоў на змену валам і коням, *сталёвым валом* і *сталёвым канём*, але народная мудрасць усё адно сцвярджае, што і ў час навукова-тэхнічнага прагрэсу *на трактар спадзявайся, а каня не прадавай; на трактар спадзявайся, але каня не забывай; на трактар надзейся, а каня не кідай* [6]). Заможнымі гаспадарамі лічыліся тыя, у каго былі свае коні (параўнайце: *ні вала ні каня,* 'зусім нічога (няма, не было ў каго-н.); пра крайнюю беднасць', *ні вала ні каня не пакінуць* 'зусім нічога'). «Конь – адна з самых шанаваных жывёл у беларускай міфалогіі. Яго вобраз актыўна выкарыстоўваўся ў касмалогіі і ў культе продкаў, у міфалогіі ён быў звязаны з трыма галоўнымі сацыяльнымі групамі грамадства: святарамі, ваярамі, земляробамі (гэтыя групы Ж. Дзюмезіль прасочвае ва ўсіх індаеўрапейскіх культурах). Вялікая роля належала гэтай жывёле ў абрадах варажбы» [7, с. 252].

1. Нашы продкі верылі, што дужы, працавіты конь – верны памочнік чалавека – прыносіць поспех і шчасце. Менавіта «на кані і з дапамогай каня казачныя героі перамагаюць ворагаў, выконваюць цяжкія даручэнні, адшукваюць сваіх каханых» [8, с. 10]. Таму зразумела, што конь стаў адным з любімых герояў не толькі казак, але і фразеалагізмаў, устойлівых параўнанняў, прыказак і прымавак.

Нездарма пра таго, хто быў пераможцам і пераможаным, гавораць *на кані і пад канём быць, пабываць* (у дыялектах Брэстчыны [9] – *буты пуд конём і на коню*) 'у самых разнастайных, прыемных і непрыемных сітуацыях (быць і пад.)', *на кані быць, адчуваць сябе* 'у прыемнай сітуацыі, у выгадным становішчы', *на белым кані быць, апынуцца, вярнуцца* 'у выгадным становішчы, як пераможца', *пад канём быць,*

аказвацца ‘у непрыемнай сітуацыі, у нявыгадным становішчы (быць і пад)’, *Па конях!*, *На коні!* ‘наперад; пайшлі, паехалі; каманда рухацца куды-н.’ і ‘кавалерыйская каманда для пасадкі на коней’. Што да ўстойлівых адзінак *на кані* і *пад канём*, то гэта параўнальна нядаўнія ўтварэнні, «абломкі» фразеалагізма *на кані і пад канём* ‘у самых разнастайных, прыемных і непрыемных сітуацыях (быць і пад.)’, пабудаваных на супастаўленні дзвюх частак. У зборніку І.І. Насовіча выраз фіксуецца ў форме *быў на кані і пад канём* [10, с. 237–238, 281]. Адсюль зразумела, што чалавек адчувае сябе больш упэўнена менавіта на кані: *рады, як на сто коней сеў*, *як на сто коней сеў (села, селі)* ‘адчувае вялікую радасць, задавальненне’, *як (як бы) на кані праехаць, пражыць, як на кані праехаць* ‘вельмі добра, удала (пражыць, праслужыць)’.

Відаць, да гэтай групы ўстойлівых выразаў можна дадаць і запазычаныя фразеалагізмы-антонімы *садзіцца (сесці) на свайго <любімага, улюбёнага> канька* ‘пачынаць размову на ўпадабаную, улюбёную тэму’; *узлазіць (узлязаць, залазіць, залязаць, узбівацца) на свайго канька* ‘пачынаць гаварыць пра сваё любімае’ і *злазіць (злезці) са свайго канька* ‘пераставаць гаварыць на любімую тэму’. У рускай мове фразеалагізм *садзіцца на свайго любімага канька* склаўся на аснове калькі з французскай мовы *c’est son dada* (літаральна «ёсць яго канёк») ці з англійскай мовы *it is his hobby horse* (літаральна «гэта ёсць яго любімы канёк, хобі»). Узнікненне фразеалагізма *садзіцца на свайго любімага канька* адбылося ў выніку разгортвання метафарычнага кантэксту нарашчэннем дзеяслоўнага кампанента *садзіцца* (на каго). Назоўнікавы ж кампанент *канёк* атрымлівае тут як бы падвойнае значэнне: і прамое, памяншальнае да *конь* у зыходным значэнні, і фігуральнае – ‘захапленне, хобі’ [10, с. 336]. Параўнайце таксама індывідуальна-аўтарскі фразеалагізм Я. Коласа *савецкі конь* ‘танк’.

2. Праз фразеалагізмы з кампанентам-назвай *конь* апісваюцца:

а) фізічныя і псіхічныя якасці чалавека: сіла, вёрткасць, знаходлівасць (*з-пад каня падковы адарве, з-пад бягучага каня падковы паадрывае*); розум, кемлівасць (*мець каня ў галаве*); наравістасць, упартасць, натурыстасць (*бірулеў конь*); непаваротлівасць, нязграбнасць, няўклюднасць (*конь аглаблёвы*);

б) колькасць, памеры чаго-н.: *з конску ногу* ‘многа’, *на кані не аб’ехаць* ‘пра вялікае’, *хоць канём едзь* ‘вялікая (шчыліна)’;

в) стан чаго-н.: *у вушах коні стаялі, у вушах коні стаяць* ‘брудныя, нямытыя вушы; звычайна пра дзяцей’.

3. Некаторыя фразеалагізмы з кампанентам-назвай *конь* адлюстроўваюць звычкі гэтай жывёлы. Так, паходжанне адзінкі *конь (кот) не валяўся (не качаўся)* ‘нічога не зроблена, не пачата, не падрыхтавана’ звязана са звычаем каня валяцца (качацца) перад тым, як даць надзець на сябе хамут або сядло, што затрымлівала работу [11, с. 295].

4. Колер, масць каня (кабылы, жарабца, жарабяці) ва ўстойлівых адзінках.

Сакральны змест выразаў *трызненне (мроя) сівой кабылы* ‘тое, што пазбаўлена ўсякіх падстаў; бяссэнсіца’, *Была б кабылка сівая, каб не белагрывая* ‘пра відавочную ісціну’, *Не ў тым дзіва, што кабыла сіва, а ў тым дзіва, што возу ні вязе, Не ў тым сіла, што кабыла сіва, а што воза не вязе, Мало цо, цо кабыла сіва, але чум яна не цягне?* ‘сутнасць рэчы і яе з’яву трэба бачыць не ў яе вонкавым выглядзе, а ў яе ўнутраных уласцівасцях і якасцях; выгляд не вызначае сілу, звязаны з міфалагемай «сівы» – змрок хтанічнага свету [12, с. 49–50]. Сівы конь – конь-пасярэднік, казачны вобраз раніцы, світанку, які мяжуе паміж небам і зямлёй, паміж верхам і нізам, паміж жыццём і смерцю.

Як ні дзіўна, але з белым канём, які ў першую чаргу ўспрымаецца як сімвал пераможца, ваяра, князя (*на белым кані быць, апынуцца, вярнуцца* ‘у выгадным становішчы, як пераможца’), у беларусаў ёсць таксама і негатыўныя асацыяцыі: *сесці на <белага> каня* ‘здурнець, паводзіць сябе па-вар’яцку’ і ‘знаходзіцца ў стане

крайняга раздражнення, злосці, раз'юшанасці' (параўнайце: *сесці на каня* 'звар'яцець, стаць псіхічна хворым', *пасадзіць на каня* 'моцна раззлаваць, угнявіць каго-н.'; коласаўскія фразеалагізмы *распярэзаць кабылку* 'нехта аказаўся ў стане некіруемасці' і *пасадзіць на кабылку* 'падвергнуць катаванню каго-небудзь'), *на белым кані* 'вельмі злосны, раз'юшаны хто-небудзь'.

Мы ведаем, што белы колер – гэта міфалагічны эквівалент дзённага святла, якое заўсёды ўспрымалася людзьмі як дабро; гэта эквівалент малака і семя – жыццятворных пачаткаў; гэта мадэль вады; белы колер – гэта таксама прыкмета вышэйшых сфер, паколькі ён звязаны з аблокамі, незямной чысцінёй і святлом. Таму за белым колерам ужо ў старажытныя часы замацоўваецца вобраз дабра, святасці [13, с. 19]. Негатыўныя ж адносіны да белага колеру ў вышэйназваных фразеалагізмах звязаны, хутчэй за ўсё, з гарэлкай, якая таксама белага колеру і злоўжыванне якой прыводзіць да парушэння псіхікі чалавека.

Але ж найперш адмоўныя ўяўленні звязаны з рабымі (стракатымі, пярэстымі) жывёламі: *Рабой кабыле сон расказваць*, *Казаў Халімон рабой кабыле сон*, *рабой кабылы сон* 'недарэчная, бязглуздая, бесталковая чыя-н. гаворка', *Ласка панская на рабым (дохлым) кані едзе* 'панскія абяцанні, спагада, лагоднасць ненадзейныя, не выклікаюць даверу', *Чытана, пісана, кабыла лысая, а жарабя рабоя, – з'еў воўк абоя* 'прыказваюць аб бяссэнсавым чытанні або пісьме, рыфме слоў без сувязі', *пасадзіць на рабенькага коніка* 'раззлаваць, вывесці з раўнавагі каго-небудзь' (але *Добраму малайцу і стракатая кабыла міла*!).

Вядомы беларускі даследчык фразеалогіі У.І. Коваль піша: «Што датычыцца рабых, пярэстых прадметаў (у тым ліку і жывёл такой масці), то яны ацэньваліся людзьмі з пункту гледжання псіхалагічных заканамернасцей успрымання колераў. Негатыўныя адзнакі пярэстасці вынікаюць з таго, што колеравая неаднароднасць, стракатасць асацыятыўна звязваюцца са зменлівасцю, ненадзейнасцю, хітрасцю, хлуснёй – з тым, што прыносіць гора, няшчасце» [8, с. 13].

Таксама рабы конь (рабая кабыла) атаясамліваецца са зменлівым (дрэнным) надвор'ем, якое часцей за ўсё бывае вясной і восенню: *Восень на рабым кані ездзіць*, *Вясна і восень на рабой кабыле ездзяць*, *Вісна і восень на рабой кабыля езьдзюць* (трэба ўлічваць таксама, што гэтыя поры года цяжкія ў жыцці селяніна: вясной скаціна худая, а восенню каровы перастаюць даваць малако), *Дзень на пярыстым кані едзе*.

Паходжанне ж запазычанага з рускай мовы фразеалагізма *мышыны жарэбчык* 'стары, які любіць заляцацца да маладых жанчын' вучоныя звязваюць з іменем М.В. Гогаля. Гэты выраз «упершыню ўжыты ў паэме «Мёртвыя душы» (1842 г.) – у разгорнутым параўнанні Чычыкава, які перабіраў ножкамі, са старэнькімі фарсунамі, што даволі спрытна бегаюць каля дам і называюцца мышынымі жарэбчыкамі. Відаць, Гогаль і аўтар гэтага выразу. Мышыны – колер мышы (пра масць каня), тут у сэнсе 'які пачынае сівець'» [10, с. 228]. (Параўнайце таксама: *Як была ў мяне кабылка мышастая, па вярсьце ў час шастала*).

5. Лічыцца, што конь з'ядае на пашы ад 25 да 100 кг травы ў суткі, а выпівае ў сярэднім 30–60 літраў вады летам і ад 20–25 літраў зімой. Корм для коней, звычайна авёс, называецца аброкам (параўнайце: *Бяжы, коніку, дастанеш аброку, – а не – то кія па боку*). «Звычайна селянін даглядаў свайго каня лепей, чым карову. Каню адводзілася больш утульнае і цёплае месца ў хляве (стайня), для яго нарыхтоўвалі і больш якаснае, мурожнае, сена, а таксама канюшыну, віку, авёс. У небагатай сялянскай гаспадарцы коней кармілі ячнай і аўсянай саломай» [14, с. 80]. Адсюль і паходжанне ўстойлівых адзінак: *Канюшына – каню сіла* 'пра канюшыну як найлепшы і дзейсны корм для каня'; *Конь сам сябе з'ядае (праядае)*, *Зімою конь каня з'есць* 'зімой каня трэба добра карміць, за зіму многа з'ядае – столькі, колькі сам каштуе'; *Каня накармі – з гразі вывезе, ворага*

накармі – у гразь утопча ‘не заўсёды чалавечая дабрыня тым жа адплачваецца’; *Сам не з’еж, а каню дай*; *Пакуль траўка падрасце, конік з голаду памрэ* ‘пакуль дачакаешся чаго-н. жаданага ці абяцанага, то будзе позна і прыйдзецца перанесці шмат гора, нядолі’; *Кабыла (конь) здыхае, а <за> траву хватае (хапае)*, *Кабыла здыхаець, а траву хапаець* ‘у якім бы стане ні знаходзіўся чалавек, яго думы і дзеянні звязаны з жыццёвымі, надзённымі інтарэсамі’.

Пра вялікі апетыт, ненаеднасць, ненасытнасць гавораць *конская ежа*; таго, хто многа, прагна, ненасытна есць, параўноўваюць са спісаным канём (*як спісаны конь* (есці), а калі ежа або пітво не ідуць на карысць каму-небудзь, адзначаюць *не ў каня корм* (фразеалагізм яшчэ мае значэнне ‘не падыходзіць; не можа быць ацэнена належным чынам’).

6. Назіранні за буйной свойскай жывёлай – *канём, кабылай, жарабцом* – прывялі да стварэння і цэлага шэрагу ўстойлівых параўнанняў.

6.1. Устойлівыя параўнанні з кампанентам-назвай *конь*: *валіць, як на каня* ‘многа’; *ведаць як аблупленага каня* ‘вельмі добра’; *гаруе (працуе) як конь грабежны*; *даць, уваліць як каню, даць, уваліць як каню сечкі* ‘не шкадуючы, вельмі моцна (пабіць, адлупцаваць каго-н.)’; *жджэ (чакае, шукае) як конь доўбні (абуха, даўбешкі)* ‘чаго-н. няпэўнага, трывожнага ці трагічнага’; *зарагатаў як конь, рагочуць як коні* ‘гучна, нястрымана’; *знаюцца, як лысыя коні*; *лыбіцца як конь на авёс*; *мяняць як (што) цыган коней, мяняе як цыган коні* ‘вельмі часта’; *набожны як конь падарожны* ‘зусім не (набожны)’; *перапаўся як конь рандарскі* ‘схуднеў’; *упарты (упірліў) як конь заценлівы*; *таргуецца, як за каня*; *хваліцца як цыган канём*; *як каню пернік, як каню тапкі* ‘без патрэбы’; *як конь на салядэру (на салідэру)* ‘прагна, сквапна (глядзець на што-н., каго-н.)’; *раве як конь, як конь раўці* ‘моцна, голасна плакаць’; *як конь па градах*; *як конь стаенны* ‘здаровы, моцны’; *як коньска смерць на выгане* ‘без справы, без сур’ёзнага занятку (хадзіць, лазіць і да т.п.)’; *як на каня* ‘безадказна (спіхваць, узвальваць); *як старому каню маці* ‘зусім не (патрэбны)’; *як стары конь мацеры* ‘зусім не (баяцца каго-н.)’ і ‘зусім не, ніколькі не (памагаць)’; *баюся <цябе> як стары конь сваёй маткі*.

Сярод устойлівых параўнанняў асобна хочацца выдзеліць індывідуальна-аўтарскія фразеалагізмы Я. Коласа: *як конь на току грымець* ‘гучна, моцна (грымець)’; *як малады неаб’езджаны конь панесціся* ‘з вялікай хуткасцю (пабегчы)’; *як спуджаны конь* ‘імкліва, шпарка, жвава’; *як той конь дзьмухнуць* ‘выказаць незадавальненне, чмыхнуць, фыркнуць’.

6.2. Устойлівыя параўнанні з кампанентам-назвай *кабыла*: *ведаць як аблупленую кабылку* ‘вельмі добра’; *гаруе (працуе) як грабежна кабыла*; *дзерці як воўк кабылу*; *захацелася, зажадалася як кабыле воцату, захацелася як кабыле аўсу* ‘вельмі моцна’; *зацяўся як наравістая кабыла*, *напінаецца як кабыла перад пропасцю, упёрся як кабыла ў дышла* ‘раптам прыпыніцца, уперціся’; *рагоча як кабыла* ‘гучна, нястрымана’; *уцякае што кабыла ад аўса* ‘зусім не (уцякае)’; *хваліцца, як цыган каслівай кабылай* ‘пра таго, хто непамерна хваліцца чым-н., кім-н., хто не заслугоўвае такой пахвалы’; *як з кабылаю пацеры мовіць* ‘пра немагчымасць дамовіцца’; *як кабыла на высеўкі* ‘моцна, уголас (смяяцца, рагатаць)’; *як кабыла Лейзарава* ‘без справы, без сур’ёзнага занятку (хадзіць, цягацца і да т.п.)’; *як цыган сляпую кабылу* ‘зусім не (любіць)’.

6.3. Устойлівыя параўнанні з кампанентам-назвай *жарабец*: *рагоча як жарабец* ‘гучна, нястрымана’; *як жарабец* ‘вольны, свабодны’.

7. У парэміялагічных адзінках з кампанентамі-назвамі *буйной свойскай жывёлы (конь, кабыла, жарабец, жарабя)* заключаны жыццёвыя парады, заўвагі і павучанні.

7.1. Парэміялагічныя адзінкі з кампанентам-назвай *конь*:

7.1.1. Павучанні: *Бойся каровы спераду, каня – ззаду, а дурня – з усіх бакоў*, *Бойся быка спераду, каня ззаду, а дурня з усіх чатырох бакоў*; *Жолаб да каня*

не ходзіць; *З бізуном і каня знаравіць можна*; *З дому фурман дарогу ведае, а дахаты і конь прывязе*; *З кішэні каня не накорміш*; *З коньмі робячы, пугі не забываюць*; *Каб конь ведаў сваю сілу, то ніхто б яго не ўзяў*; *Калі падаць, то з добрага каня*; *Конь дарогі не перастроіць*; *Конь па лецях, а чалавек па рабоце*; *На торзе кожны конь танцуе*; *Не конь, дык у сані не ўпрагайся*; *Не конь, што ў балота ўцягне, а з балота не выцягне*; *Час – не конь: не падгоніш і не прыпыніш*.

7.1.2. Жыццёвыя парады і заўвагі: *Ад работы і коні дохнуць*; *Быў конь (конік), ды з'ездзіўся*; *Вядзі каня на аборачцы, а злодзея на лунцугу*; *Гаварыў бы па-польску, ды язык па-конскі*; *Заціньваму каню пуга не дапаможа*; *Зранку і коні не п'юць*; *З чужога каня й у гразі сьсідаюць*; *Каню дай аброку да і бей яго па боку*; *На кані едзе, каня шукае*; *На кані едзе, а каня пытае*; *Лянога каня пугай ні спужаш*; *Жваваму каню пугі не паказвай*; *Каторы конь цягне, таго і паганяюць*; *Конь вырвецца – здагоніш і зловіш, а слова вырвецца – не зловіш*; *Конь не свой, паганяй, не стой*; *Конь старэе – у цане танее, вол старэе – цану набірае*; *На двух конях верхам не паедзеш, На двух каніскаx адзін не паедзеш*; *На лечаным кані далёка не паедзеш*; *На чыім возе (вазку, коніку) едзеш, таму і песню (песеньку, песенькі) спявай (пей, вядзі)*; *Не той дужы, хто коней стрымлівае, а той, хто сябе стрымлівае*; *Не гэта сіла, што ўтрымае пылкага каня, а гэта сіла, хто ўтрымае сваё пылкае сэрца*; *Ні па каню, ні па кабылі*; *Пажаніліся, як малады конь і стары вол спрэгліся*; *Панскае вока каня тучыць (гадуе)*; *Панская ласка на быстрым кані едзе; Панская ласка на дохлым кані едзе*; *Сабака сам сена ня есьць і каню не дае*; *Салавей, што за гарою коні душыць*; *Саломеным валом не аруць, а сенным канём не едуць, Саламяным валом не араць, а сянным канём не ваяваць*; *Сем жыдоў на воз, абы конь павёз*, *Сем седакоў – не воз, абы конь вёз*; *Стары вол (конь) баразны не псуе (не сапсуе); Стары конь баразны не псуе, ды не глыбока арэ*; *Суджанага і канём не аб'едзеш*; *Што каму суджана, <дык і пехотай> таго не абойдзеш і <з канём> не аб'едзеш*; *Суджанага і канём (валом) не аб'едзеш*; *Таго бяда, чый конь уграз*; *Умераць – не коні заварачаць*; *Усіх коней перагоніш – гадоў не дагоніш*; *Фурман добры, але коні не вязуць*; *Хвалі каня пасля дарогі, а пана – як выцягнуў ногі; Хвалі каняку пасля дарогі, а пана – як выцягне ногі*; *Каня хвалі пасля дарогі, а пана – як выцягнуць за ногі*; *Хлопіц на кані едзя, а дзяўчына родзіцца й яму згодзіцца*; *Худы конь скора абмульваецца*; *Цераз сілу і конь не цягне*; *Цераз сілу і конь не пацягне*; *Праз сілу й конь ні вязе; Через сілу і конь не ступіць*; *І конь праз (над) сілу ні возьме (ні пацягне)*; *І конь чэраз сілу не скочыць*; *Шануй каня дома, а ён цябе ў дарозе*; *Шануй каня ўдому, а ён цябе ў дарозе*; *Дагледзь каня дома, то ён цябе ў дарозе*.

7.2. Парэміялагічныя адзінкі з кампанентам-назвай *кабыла*: *А мая кабыла не ўсё забыла*; *Была кабылка, ды з'ездзілася*; *Выбірай кабылу гарбатую, а жонку лупатую*; *З табой гаварыць, як з кабылай пацеры: ты ёй: ойчэ наш, а яна табе: сена нямаш*; *З чужой кабылы трэба і ў балоце злезці*; *<І> я не я і кабыла не мая*; *Кабыла за дзелам, а жарабя бяз дзела*; *Кожны (усякі) цыган сваю кабылу хваліць*; *Мая кабыла ўгразла*; *Нарадзілася кабыла з лысінкай, дык і здохне, не сцёршы*.

7.3. Парэміялагічныя адзінкі з кампанентам-назвай *жарабец*: *На сытага жарабца не трэба дубца*.

7.4. Парэміялагічныя адзінкі з кампанентам-назвай *жарабя*: *Кабыла за дзелам, а жарабя бяз дзела*; *Хутчэй бусел жарабя ўродзіць*; *Як (калі) удасца жарабё (бычок) з лысінкай, дык і здохне (састарэе) такім (з лысінкай)*; *Лысае жарабя ўрадзілася, лысае і здохне*. (Як бачым, больш за ўсё «пашанцавала» парэміялагічным адзінкам з кампанентам-назвай *конь*).

8. У фразеалагізмах, устойлівых параўнаннях і парэміялагічных адзінках *конь, кабыла* супрацьпастаўлены:

а) *камару, мурашцы* (вялікае – малое): *рабіць (зрабіць) з камара каня*, *Людзям часта і мурашка здаецца за каня* ‘беспадстаўна перабольшваць што-н., надаваць чаму-н. нязначнаму вялікае значэнне’;

б) *жабе, раку* (старэйшы, вопытны – маладзейшы, нявопытны): *Гдзе конь з капытом, туды і жаба з клешнёю*; *Дзе каня куюць, там жаба падстаўляе свае клешні*; *Каваль каня куе – і жаба ногу дае*; *Каня куюць, а жаба ногі падстаўляе*; *Як каня куюць, то й жаба нагу настаўляе*; *Куды конь з капытом, туды і рак з клюшняй (з клюшнямі)* ‘за старэйшым і больш вопытным, пераймаючы яго, цягнецца і маладзейшы, нявопытны; часцей ужываецца як адмоўная ацэнка таго, хто пераймае чые-н. дзеянні, звычкі і пад.; таксама кажуць пра таго, хто сам напрошваецца на непрыемнасці’: *Не лезь, жаба, туды, дзе коней куюць* (зламоўнае пажаданне);

в) *свінні* (розум – глупства): *Прышла сьвіня да каня* ‘пра асоб, розных па разумовым і культурным ўзроўні’; *Прымеркавалася свіння да каня, але шэрсць не така* (павучанне); *Прыраўняў свінню к каню, раўня як свіння да каня* ‘розныя па ўзроўні’; *Сват едзе на кані, а гультай – на сьвіні* ‘павага да людзей залежыць ад іх заслуг, важнасці ў грамадстве’; *Чэшыся конь з канём, вол з валом, а сьвіня з углом*; *Конь з канём, вол з валом, свіння з вуглом* ‘пра ліхога чалавека, з якім ніхто не сябруе’;

г) *зайцу* (храбрасць, сіла – баязлівасць, слабасць): *даць як заяц кабыле* ‘зусім слаба, нямоцна (даць каму-н., ударыць каго-н.)’; *От даў пылі (духу) як заяц кабылі* ‘насмешка з таго, хто занадта сам сябе хваліць’; *памог як заяц кабыле* ‘зусім не (памог)’; *спужаўся (баюся) як заяц кабылы*;

д) *воўку* (адкрытасць – хітрасць, дужы супраць дужага): *Жартаваў воўк з канём, ды ў жмені зубы панёс* ‘пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны’; *Кабыла з ваўком цягалася, хвост ды грыва асталася*; *Кабыла з ваўком змагалася – хвост і грыва засталася* ‘перамагае ў якой-н. справе дужэйшы’; *патрэбны як стары конь воўку* ‘зусім не (патрэбны)’; *Пашкадаваў воўк кабылу <пакінуў хвост ды грыву>*; *Шкадаваў воўк кабылу: пакінуў хвост ды грыву* ‘кажуць пра таго, хто толькі на словах шкадуе каго-н., а на справе гатовы нашкодзіць яму; таксама падняволеныя прыказваюць прыгнятальніку’.

9. Частка парэміялагічных адзінак пабудавана на супрацьпастаўленні *конь, кабыла – баба, жонка, дзеўка*: *Баба з воза – каню (кабыле) лягчэй*, *Баба з калёс – калёсам (каню) лягчэй*; *Баба пеша – кабыле лехша* ‘калі хто-н. пакіне каго-н. ці адмовіцца ад чаго-н., то ад гэтага будзе толькі лепей’; *Кабылу не перабздзіш, бабу не пераспорыш* ‘іранічна пра што-н. неадольнае, чаго нельга перасіліць’; *Каню хваста не вяжы, а бабе праўду не кажы* ‘кажуць з незадавальненнем пра жанчыну, якая не можа трымаць тайну’: *Не вер каню ў дарозе, а жонцы дома*; *Не вер каню ў дарозе, а Янінке дома*; *Не вер каню ў дарозе, а жонцы ў двары*; *Не вер жонцы ў дому, кабыле ў дарозе*; *Ні вер каню запрагаючы, маладой жонцы ў дарогу выбіраючы*; *Не хвалі каня запрагаючы, а дзеўку – выбіраючы* ‘пра адсутнасць даверу жонцы; звычайна прыказваюць таму, каму жонка здрадзіла’.

Тлумачэнне такога стаўлення да жанчыны трэба бачыць у патрыярхальным ладзе жыцця нашых продкаў.

10. Конь і старажытнагрэчаскі эпас.

У беларускай мове існуе фразеалагізм-калька з грэчаскай мовы *траянскі конь* са значэннямі ‘ашуканства, хітры падман’ і ‘чалавек, які са здрадніцкімі намерамі дамагаецца чыйго-н. даверу, выдае сябе не за таго, кім з’яўляецца на самай справе’. «Паводле старажытнагрэчаскага эпасу, пасля дзесяцігадовай асады грэкі хітрасцю авалодалі горадам Троя. Яны сказалі, што пакідаюць горад. Падарылі траянцам вялізнага драўлянага каня і адплылі на суседні востраў. Каб уцягнуць каня ў крэпасць, траянцы разбурылі частку сцяны. Ноччу з каня выйшлі схаваныя там воіны-грэкі,

перабілі вахту, адчынілі гарадскія вароты і ўпусцілі войска, што вярнулася з вострава. Троя была ўзята і разбурана» [10, с. 366].

11. Конь і біблейская тэматыка.

Два фразеалагізмы – уласна беларускі *конь божы (ісусаў)* і запазычаны з польскай мовы *конь пана Езуса* – ужываюцца як эўфемізмы да слова *асёл* са значэннем ‘недалёкі, неразумны, тупы чалавек’ і маюць апасродкаваную сувязь з Бібліяй. «Паводле Евангелля, Ісус Хрыстос ездзіў па свеце на асле... Выраз узнік як перыфраза, як другая назва асла – пры адначасовым перанясенні назвы з зыходнага значэння слова *асёл* (‘жывёліна’) на другаснае, метафарычнае (‘тупы, неразумны чалавек’)» [10, с. 197].

Двух святых, двух заступнікаў мае конь – св. Юр’я і св. Ягорыя. «Асабліва цесна звязаны з канём св. Юры (Юрай, Юр’я), які лічыўся апекуном каня. Яго свята адзначалася 6 траўня н.ст., і лічылася, што ў гэты дзень св. Юры зацінае зубы ваўкам, каб яны не елі каня. Менавіта ўладальнікі каня асабліва шанавалі св. Юр’я, ад чаго пайшла і прымаўка: «Каня не маю – Юр’я не знаю, каня маю – Юр’я знаю» [7, с. 253]. Адсюль і ўстойлівае параўнанне *набожны як святога Юр’я конь*.

12. Канём называецца адна з шахматных фігур. Фразеалагізм *ход канём* са значэннямі ‘спрытны, абходны манеўр, разлічаны на поспех у чым-н.’ і ‘аб рашучым сродку, што выкарыстоўваецца для дасягнення поспеху ў якой-н. справе’ «ўзнік параўнальна нядаўна і ўвайшоў у літаратурны ўжытак з мовы шахматыстаў. Конь ходзіць не па прамой лініі ці дыяганалі, як іншыя фігуры, а літарай «Г», таму яго хады звычайна нечаканыя для праціўніка» [10, с. 396].

13. У складзе аналізуемых устойлівых адзінак мовы выкарыстоўваюцца і кампаненты, якія абазначаюць:

а) часткі цела жывёлы:

− галава: *Не вер конскай галаве і знайшоўшы на выгане – вазьмі ды закілзай*; *Хай (няхай) конь думае: у яго галава большая (вялікая)*, *Няхай конь думае, бо вяліку галаву мае*, *У кабылы большая галава, няхай сабе яна думае* ‘кажуць жартаўліва ці іранічна ў адказ таму, хто раіць падумаць пра што-н.’;

– зуб: *Дараванаму (дарованаму, дармоваму) каню ў зубы не глядзяць*, *У даронага каня зубоў не глядзяць* ‘тое, што лёгка дасталася каму-н., не павінна ім абмяркоўвацца ці прыдзірліва ацэньвацца; не рэкамендуецца выказваць незадаволенасці падараванай або дармавой рэччу’ (ад звычаю вызначаць узрост каня па зубах, ад чаго залежала і цана на яго);

– капыт: *Гдзе конь з капытом, туды і жаба з клешнёю*; *Куды конь з капытом, туды і рак з клюшняй (з клюшнямі)* ‘за старэйшым і больш вопытным, пераймаючы яго, цягнецца і маладзейшы, нявопытны; часцей ужываецца як адмоўная ацэнка таго, хто пераймае чые-н. дзеянні, звычкі і пад.; таксама кажуць пра таго, хто сам напрошваецца на непрыемнасці’;

– нага: *Конь на чатырох нагах <і то> спатыкаецца*; *У каня чатыры нагі, і той спатыкаецца*; *Конь на чатыры нагі, а спатыкаецца*; *Конь і на чатырох нагах, а спатыкаецца*; *Конь на чатырох нагах спатыкаецца, чалавек адным языком памыліцца (а чалавек на адном языку дзіво (не дзіво), што памыліцца* ‘кожны можа памыліцца, апынуцца ў цяжкім становішчы; кажуць у апраўданне чыёй-н. памылкі’; *Не цягні чалавечай нагі з балота, а цягні коньскую, бо коньская нага цябе вывезя з гразі, а чалавеча нага цябе ўтопча ў гразь*, *Не цяні чалавечай галавы з гразі, а лепей конскую, бо чалавек атплаціць злом, а лошадзь з гразі вывезе* ‘гавораць, калі нехта за зробленае дабро адплачвае свайму дабрадзею злом’;

– хвост (часцей за ўсё ў спалучэнні хвост + валасы жывёлы): *грэць у хвост і ў грыву, і ў хвост і ў грыву* ‘вельмі моцна (біць, паганяць каго-н., падаць каму-н.’) і ‘бязлітасна, непрымірыма (біць, лупіць, крыць і пад.)’; *Кабыла бясхвостая!*; *Кабыла*

з ваўком цягалася, хвост ды грыва асталася; *Кабыла з ваўком змагалася – хвост і грыва засталася* ‘перамагае ў якой-н. справе дужэйшы’; *Каню хваста не вяжы, а бабе праўду не кажы* ‘кажуць з незадавальненнем пра жанчыну, якая не можа трымаць тайну’; *каня з хваста брытаць (забрыт(ы)ваць)* ‘рабіць няўмела’; *Пашкадаваў воўк кабылу <пакінуў хвост ды грыву>*; *Шкадаваў воўк кабылу: пакінуў хвост ды грыву*; *прышый кабыле хвост*, *прычапі кабыле хвост* ‘зусім непатрэбны, лішні, не мае дачынення да чаго-н.’ і ‘пра каго-н., што-н. лішняе, непатрэбнае’; *Прышый кабыле хвост, – у яе свой ёсць; Прышый кабыля хвост, а ў яе й свой ёсьць; Прышый кабыле хвост, а ў кабылы свой ёсць; Прывяжы кабале хвост, а ёй свой урос* ‘гавораць, калі набылі непатрэбную рэч, якая будзе толькі замінаць’, *Хто не ўтрымаўся за грыву, таму і хвост не паможа* ‘пра непазбежнасць канца якіх-н. дзеянняў, учынкаў, спраў’;

– шыя: *Была б (абы) шыя, <а> хамут знойдзецца* ‘было б каму рабіць, а праца знойдзецца’;

б) вупраж, збруя:

– дуга (частка конскай вупражы з сагнутага тонкага ствала дрэва, якая змацоўвае аглоблі з хамутом): *сагнуць у дугу* ‘прымусіць быць пакорлівым’; *як конь з-пад дугі* ‘неасцярожна (глядзець)’; *як конь праз дугу глядзець* ‘незадаволена, нядобразычліва (глядзець на каго-н.)’;

– лейцы (вяроўкі, рамяні для кіравання коньмі ў запрэжцы): *адпускаць (папускаць) лейцы*, *адпусціць (папусціць) лейцы* ‘змяншаць кантроль, паслабляць увагу, пільнасць, патрабаванні да каго-н.’; *браць (узяць) лейцы ў <свае> рукі* ‘прымаць на сябе кіраванне чым-н.’; *выпускаць (выпусціць) лейцы з <сваіх> рук* ‘аслабляць кіраўніцтва чым-н., сілу ўлады над кім-н.’; *ляйчына пад хвост папала* ‘хто-н. вядзе сябе неўраўнаважана, праяўляе ўпартасць, самадурства’; *даваць (даць) лейцы ў рукі* ‘ставіць каго-н. на кіруючую пасаду’; *і лейцы ў рукі* ‘у каго-н. ёсць усе падставы быць кіраўніком чаго-н.’; *Даўшы пугу, трэба даць і лейцы* ‘даручыўшы каму-н. малую справу, трэба ўвесці яго ў курс усёй справы; калі бацька даручыў сыну выконваць працу па гаспадарцы, дык ён мусіць дазволіць яму і кіраванне ёю’;

– хамут («Хамут – частка вупражы, што надзяваецца на шыю каню. Гэта драўляны каркас – клешчы, абкладзеныя з унутранага боку мяккім лямцам (хамуцінай). Мае па баках гужы, за якія з дапамогаю дугі мацуюцца аглоблі. Хамуты бываюць рознай велічыні ў залежнасці ад аб’ёму шыі каня. Той, хто запрагае каня, павінен падбіраць хамут яму па мерцы, каб не нацерці шыю жывёле» [14, с. 56]): *біць у хамут* ‘упарціцца, рэзка рэагаваць’; *Была б (абы) шыя, <а> хамут знойдзецца* ‘было б каму рабіць, а праца знойдзецца’; *Вялікаму каню – вялікі хамут, Большаму каню большы хамут* ‘на чалавека з вялікімі здольнасцямі і магчымасцямі ўскладаюцца і значныя абавязкі; ужываецца як станоўчая ацэнка чыіх-н. выдатных здольнасцей’; *Калі будзіш міняць, дык будзя хамут гуляць*; *Хто міняя, таму хамут гуляя*; *Хто <коней> мяняе, у таго хамут гуляе*; *Хто часта коней мяняе, у таго хамут гуляе*; *Хто коні міняя, у таго хамут гуляе*; *Хто коней мяняець, у таго хамут гуляець*; *Хто коньмі мяняе, у таго хамут гуляе* ‘кажуць з асуджэннем пра таго, хто любіць перабіраць, мяняць каго-н. ці што-н.; ахвотнікі мяняць часта аказваюцца ашуканымі; папярэджанне таму, хто мае ахвоту мяняць коні з гандляром’; *Калі не хочаш цягнуць, не лезь у хамут*; *як конь у хамут* ‘неахвотна (лезці)’; *не па каню хамут* ‘якая-н. справа не адпавядае чыім-н. здольнасцям, магчымасцям’;

в) аглоблі (пара жардзін, прымацаваных канцамі да пярэдняй восі воза, у якія запрагаюць каня): *Кось-кось (кося-кося, косю-косю), пакуль (ды) у аглоблі*, *Кось-кось, пакуль за грыву* ‘кажуць з неадабрэннем пра таго, хто напачатку задобрывае каго-н., каб дасягнуць пэўнай мэты; гаворыцца, калі заўважаецца няшчырасць у чыіх-н. словах, учынках і пад.; кось-кось – воклік, якім падзываюць коней’; *«Кося, кося!»* –

пакуль злавіць давялося, а як злавіў, дык «стой, воўчы дух!» ‘калі дэспат або ліхвяр ласкава абыходзіцца з прастаком, пакуль у свае рукі не возьме; кося – ласкавая назва каня’; *не хочацца як ляному каню ў аглоблі*; *ні па кані ні па аглоблях*, *ні па каню, ні па галоблі* ‘не так, як каму-н. хочацца; ні за аднаго і ні за другога’; *не па кабыле, то па аглоблях*, *не па кані, а па аглаблі* ‘пра неўраўнаважанага чалавека, які гатоў спагнаць злосць на кім- або чым-н.’;

г) падкова (жалезная тоўстая дугападобная пласціна, якая прыбіваецца да конскага капыта для засцярогі ад пашкоджання і слізгацення): *з-пад каня падковы адарве*, *з-пад бягучага каня падковы паадарывае* ‘вельмі вёрткі, знаходлівы, зухаваты’; *як конь на падкову* ‘ў здзіўленні (глядзець)’.

14. Частка аналізуемых фразеалагізмаў не мае ў сваім складзе кампанентаў – назваў *конь (кабыла, жарабя)*, але мае сэнсавую сувязь з гэтай тэматычнай групай. Сярод іх:

– *біць у хамут* ‘упарціцца, рэзка рэагаваць’. Фразеалагізм «узнік у выніку пераасэнсавання адпаведнага свабоднага словазлучэння: запрэжаны наравісты конь, бывае, не вязе воза, на месцы пераступае з нагі на нагу, а потым, калі яго настойліва падганяюць, рэзка кідаецца наперад і б’е плячамі ў хамут» [10, с. 52];

– *і ў хвост і ў грыву* ‘вельмі моцна (біць, паганяць каго-н., пападаць каму-н.’) і ‘бязлітасна, непрымірыма (біць, лупіць, крыць і пад.)’. Узнік са свабоднага спалучэння слоў, якое першапачаткова ўжывалася, калі гаворка ішла пра каня [10, с. 181];

– *ляйчына пад хвост папала* ‘хто-н. вядзе сябе неўраўнаважана, праяўляе ўпартасць, самадурства’. «Пад канцом кораня конскага хваста ёсць вельмі адчувальнае, не пакрытае шэрсцю месца. Калі да яго дакрануцца ляйчынай, конь не знаходзіць сабе месца, імчыць, што ёсць духу» [10, с. 216];

– *можна ў плуг запрагаць* ‘хто-н. вельмі здаровы, моцны’. «У аснове выразу – гіпербалічнае супастаўленне з канём (паводле сілы, стану здароўя)» [10, с. 226];

– *станавіцца (стаць, уставаць, устаць) на дыбкі, стаць дубам* ‘рэзка пярэчыць, пратэставаць, выяўляць нязгоду’. «Узнік шляхам метафарызацыі адпаведнага свабоднага словазлучэння, якое ўжываецца ў дачыненні да каня, сабакі і некаторых іншых жывёл. *На дыбкі* [*дубам.* – Л.С.] азначае ‘на заднія ногі’. Параўн.: «Падкаваць жарабка сапраўды было цяжка: ён ірваўся з прывязі, справаў стаць на дыбкі, прысядаў, ад страху дрыжала на ім скура» (А. Рылько)» [10, с. 354];

– *у мыле* ‘змучаны напружанай работай’. «Склаўся праз супастаўленне чалавека, змучанага работай, з канём, які пасля працяглага бегу пакрываецца белай пенай, падобнай на мыльную (яе называюць мылам). Параўн.: «Конь быў увесь у мыле і цяжка дыхаў» (М. Лынькоў)» [10, с. 381];

– *у чорным целе* трымаць ‘надгаладзь, без дадатковага харчавання’ і ‘вельмі строга, сурова, абмяжоўваючы свабоду дзеянняў’. Запазычаны, відаць, з рускай мовы выраз першапачаткова «ўжываўся ў дачыненні да коней і абазначаў ‘у худым целе, сярэдне (трымаць)’. В.І. Чарнышоў прыводзіць урывак з «Рэгулы аб конях» (1725), дзе даецца інструкцыя «глядзець, каб халастыя кабылы былі ў чорным целе». Яшчэ адно значэнне развілося ў фразеалагізме пад уплывам выразаў *у цуглях, у абцугах* трымаць» [10, с. 389–390].

«Конскае паходжанне» маюць і наступныя прыказкі і прымаўкі: *Была б (абы) шыя, <а> хамут знойдзецца* ‘было б каму рабіць, а праца знойдзецца’, *Даўшы пугу, трэба даць і лейцы* ‘даручыўшы каму-н. малую справу, трэба ўвесці яго ў курс усёй справы; калі бацька даручыў сыну выконваць працу па гаспадарцы, дык ён мусіць дазволіць яму і кіраванне ёю’, *Хто не ўтрымаўся за грыву, таму і хвост не паможа* ‘пра непазбежнасць канца якіх-н. дзеянняў, учынкаў, спраў’, *Калі не хочаш цягнуць, не лезь у хамут*; *Не запрог – не кажы «ну»; Не запрогшы, не паедзеш* (павучанні).

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Аксамітаў, А. Прыказкі і прымаўкі : тлумач. слоўн. бел. прыказак і прымавак з архіваў, кафедр. збораў, рэд. выд. XIX і XX стст. / А. Аксамітаў. – Мінск : Беларус. навука, 2000. – 320 с.

2. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / склад. Ф.М. Янкоўскі ; прадм. Д.Я. Бугаёва. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 494 с.

3. Лепешаў, І.Я. Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы : у 2 т. / І.Я. Лепешаў. – Мінск : БелЭн, 1993. – 2 т.

4. Лепешаў, І.Я. Слоўнік беларускіх прыказак / І.Я. Лепешаў, М.А. Якалцэвіч. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 511 с.

5. Мілач, С.В. Слоўнік фразеалагізмаў з кампанентамі-заонімамі (на матэрыяле беларускай і нямецкай моў) / С.В. Мілач ; Брэсц. дзярж. ун-т. – Брэст : БрДУ, 2010. – 256 с.

6. Фразеалагічны слоўнік мовы твораў Я. Коласа: / уклад. А.С. Аксамітаў [і інш.]; пад рэд. А.С. Аксамітава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 655 с.

7. Беларуская міфалогія : энцыкл. слоўн. / С. Санько [і інш.] – Мінск : Беларусь, 2004. – 592 с.

8. Коваль, У.І. Чым адгукаецца слова: Фразеалогія ў павер'ях, абрадах і звычаях / У.І. Коваль. – Мінск : Нар. асвета, 1994. – 48 с.

9. Дыялектны слоўнік Брэстчыны / Аляхновіч М.М. [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 294 с.

10. Лепешаў, І.Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І.Я. Лепешаў. – Мінск : БелЭн, 2004. – 448 с.

11. Бирих, А.К. Словарь русской фразеологии. Историко-этимологический справочник / А.К. Бирих, В.М. Мокиенко, Л.И. Степанова. – СПб : Фолио-Пресс, 2001. – 704 с.

12. Маслова, В.А. Преданья старины глубокой в зеркале языка / В.А. Маслова. – Минск : Пейто, 1997. – 128 с.

13. Миронова, Л.Н. Цветоведение / Л.Н. Миронова. – Мінск : Выш. шк., 1984. – 286 с.

14. Іванова, С.Ф. Слоўнік беларускіх прыказак, прымавак і крылатых выразаў : Лінгвакраязн. дапам. / С.Ф. Іванова, Я.Я. Іваноў. – Мінск : Беларус. Фонд Сораса, 1997. – 262 с.

Stankievich L.F. **Verbal Set Expressions Including Components Referring to Domestic Animals (Horse, Stallion, Mare, Colt)**

The article focuses on the ethno linguistic aspect of verbal set expressions (phraseological units, proverbs and comparisons) that belong to the theme group «horse, stallion, mare, colt». The etymology and semantics of verbal set expressions are under analysis.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 17.05.2011

УДК 821.161

М.І. Мішчанчук

СТАРОНКА АДРАДЖЭННЯ: З НАЗІРАННЯЎ ПРА ПАЭМУ М. ГУСОЎСКАГА «ПЕСНЯ ПРА ЗУБРА», ЯЕ ПЕРАКЛАДЫ

У артыкуле на прыкладзе «Песні пра зубра» М. Гусоўскага паказваецца ўзмацненне суб'ектыўнага фактару ў літаратуры перыяду Адраджэння, што сталася вядучай прыкметай мастацтва слова часу выпрацоўкі прыёмаў модульнага пісьма, параўноўваюцца на змястоўным, жанрава-стылявым і мікравобразным узроўнях пераклады старадаўняга лацінамоўнага помніка на сучасную беларускую мову Я. Семяжона, У. Шатона, Н. Арсенневай.

Такім чынам, можна адзначыць, што пры перакладзе тэрміналагічнай лексікі іншамоўнага паходжання сферы справаводства ў слоўніку С. Серады выкарыстоўваліся розныя эквіваленты: дыялектныя словы (вариант – *адменьнік*, кассир – *скарбнік*, процент – *адсотак*, юрисконсульт – *праварадца*), размоўна-гутарковыя (библиотека – *кніжня*, пресс-папье – *прыціскач*, юрист – *праўнік*), новаўтварэнні (биография – *жыцьцяпіс*, бюллетень – *абвесьнік*, каталог – *кнігасьпіс*, экземпляр – *паасобнік*), інтэрнацыянальная лексіка (адресат – *адрасат*, архив – *архіў*, виза – *віза*, календарь – *каляндар*, комиссия – *камісія*, копия – *копія*, параграф – *параграф*, резолюция – *рэзолюцыя*, текст – *тэкст*, телеграмма – *тэлеграма*), а таксама безэквівалентны, апісальны спосаб перакладу (нетрудоспособность – *няздольнасьць да працы*; обусловливать – *ставіць умовы*; телеграфировать – *падаць тэлеграму*; штаты – *расклад пасадаў*). У пачатку XX ст. у гэтым працэсе перавага аддавалася беларускім словам, часцей за ўсё вузкім дыялектызмам або штучным словам. Але такія словы не вытрымалі выпрабаванне часам. Калі ж такіх адпаведнікаў не было ў жывой народнай мове, укладальнікі слоўнікаў выкарыстоўвалі запазычанні з іншых моў або ўтваралі новыя словы. Сферу справаводства жывая народная мова не магла забяспечыць неабходным моўным матэрыялам, і таму пры адсутнасці адпаведнікаў утваралі неалагізмы. Але няўдалы пераклад іншамоўных тэрмінаў прыводзіў да падмены паняццяў, страты дакладнага значэння, асабліва ў заканадаўчай сферы, да ўтварэння тэрмінаў з празрыстай унутранай формай, што недапушчальна для тэрміналогіі, да зацямнення сэнсу і скажэння сутнасці. Таму працэс інтэрнацыяналізацыі навуковай тэрміналогіі выявіў вялікую ўстойлівасць.

Улічваючы ўсё вышэйсказанае, неабходна, аднак, адзначыць, што частка слоў у слоўніках пачатку XX ст., у тым ліку і ў слоўніку С. Серады, была перакладзена ўдала і замацавалася ў актыўным лексічным складзе сучаснай беларускай літаратурнай мовы (безответственность – *безадказнасць*; бесспорный – *бясспрэчны*; годовщина – *угодкі, гадавіна*; государственный – *дзяржаўны*; делопроизводитель – *справавод*; доверитель – *давернік*; должностной – *службовы*; заведующий – *загадчык*; личный – *асабісты, асабовы*; надзор – *нагляд*; обобщать – *абагульняць*; общий – *агульны, супольны*; отчет – *справаздача*; помощь – *дапамога, помач*; правительство – *урад*; правоспособный – *праваздольны*; председатель – *старшыня*; предшественник – *папярэднік*; сотрудничество – *супрацоўніцтва* і шмат іншых). Прычым многія з перакладзеных слоў у сучаснай беларускай мове не толькі захавалі, але і пашырылі сваё значэнне (у тэксце пазначаны курсівам): вывод – вывад, вынік, *вывядзенне*; выписка – выпіска, *выпісванне*; выплата – выплата, *выплачванне*, *выплат*; гражданский – грамадзянскі, *цывільны*; должность – пасада, *служба, абавязкі*; исключать – выключаць, *выводзіць, знімаць*; обращение – зварот, *пераварочванне, ператварэнне, схіленне, абарачэнне, абарот, абыходжанне, паводзіны, карыстанне, адозва, зваротак*; отпуск – адпачынак, *водпуск*; приложение – дадатак, *прыкладанне, прыкладванне, дастасаванне, дастасоўванне, дапасоўванне, прымяненне, прыдатак*; расписка – расьпіска, *распісванне, размалёўванне, размалёўка*; сообщать – паведамляць, *перадаваць, надаваць*; срок – тэрмін, *час*; устав – статут, *звычай, устаў*.

Такім чынам, можна сказаць, што ў пачатку XX ст. была праведзена вялікая работа па ўнармаванні беларускай літаратурнай мовы і стварэнні тэрміналагічнай сістэмы. А сёння мы можам адзначыць жыццяздольнасць тых ці іншых тэрмінаў і мэтазгоднасць гарманічнага развіцця тэрміналогіі з апораю на ўласныя рэсурсы пры спалучэнні з выкарыстаннем інтэрнацыянальнага матэрыялу.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Шакун, Л.М. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы : вучэб. дапам. для філал. фак. вну / Л.М. Шакун. – Мінск : Універсітэцкае, 1984. – 319 с.

2. Крамко, І.І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы : у 2 т. / І.І. Крамко, А.К. Юрэвіч, А.І. Яновіч ; пад рэд. А.І. Жураўскага. – Мінск : Навука і тэхніка, 1968. – Т. 2. – 340 с.

3. Аніськова, С.М. Навукова-тэхнічная тэрміналогія: ля вытокаў станаўлення / С.М. Аніськова // Праблемы развіцця, функцыянавання і нармавання лексікі беларускай мовы: зб. навук. арт. міжнар. навук.-метад. канф., Гомель, 22–23 кастрычніка 2004 г. / Гомельскі дзярж. ун-т; рэдкал.: Д.Д. Паўлавец [і інш.]. – Гомель, 2004. – С. 3–5.

4. Бушлякоў, Ю. Нармалізацыя беларускай літартурнай мовы ў паслякастрычніцкі перыяд (да 1930 г.) / Ю. Бушлякоў // Известия ГГУ им. Ф. Скорины: Беларуская мова. – 2000. – № 2 (25). – С. 45–49.

5. Станкевіч, А.А. Зпазычванне лексікі іншамоўнага паходжання як адна з крыніц папаўнення тэхнічнай тэрмінасістэмы / А.А. Станкевіч // Праблемы развіцця, функцыянавання і нармавання лексікі беларускай мовы: зб. навук. арт. міжнар. навук.-метад. канф., Гомель, 22–23 кастрычніка 2004 г. / Гомел. дзярж. ун-т; рэдкал.: Д.Д. Паўлавец [і інш.]. – Гомель, 2004. – С. 67–71.

6. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыяніраванне / Л.А. Антанюк. – Мінск. : Навука і тэхніка, 1987. – 240 с.

7. Серада, С. Дзелавод. Узоры офіцыяльных папер, слоўнік тэхнічна-канцэлярскіх выразаў і іншыя, патрэбныя ў дзелаводстве веды / С. Серада; пад рэд. М. Красінскага. – Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1926. – 136 с.

Belka L.G. **The Formation of Paper Work Terminology of the Belarusian Language at the Beginning of the XX Century (on the Basis of S. Sereda's «Delovod»)**

The article is dedicated to the problems of the history of development and formation of the paper work vocabulary. As the result of the research the author notices that translating terminological vocabulary of the paper work sphere different equivalents were used. They are: dialectical informal words, new word formation, international vocabulary and non-equivalent way of translating. The analyzed lexical material proves that the process of scientific terminology internationalization is very steady, as it is caused by the specific character of the words that have foreign origin.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 14.02.2011

УДК 82-1(476)=124=161.3

Г.М. Праневіч

АД «ПРУСКАЙ ВАЙНЫ» ЯНА ВІСЛІЦКАГА ДА «ПЕСНІ ПРА ЗУБРА» МІКОЛЫ ГУСОЎСКАГА: КАНТРАПУНКТЫ ВАЙНЫ І МІРУ

У артыкуле на матэрыяле «Прускай вайны» Я. Вісліцкага і «Песні пра зубра» М. Гусоўскага даследуюцца праблемы вайны і міру з пункту гледжання рэнесансавага ідэала гаспадара і здольнасці дынастыі Ягелонаў як уладароў Вялікага Княства Літоўскага забяспечыць бяспеку і нацыянальныя інтарэсы дзяржавы.

Праблема вайны і міру – стрыжнёвая, вызначальная ў летапісах і паэтычным эпасе Беларусі XII–XVII стст. Росквіт і ўздым жыцця, заняпад і гібель людзей і народаў канцэнтравана змешчаны, набываюць і страчваюць сэнс у парадыгме дачыненняў, што вызначаюць гэтыя два перманентныя станы чалавечага існавання. «Мир стоит до рати, рать до мира», – так характарызаваў крохкую раўнавагу паміж мірам і вайною ў сярэднявечных грамадствах знакаміты Нестар, складальнік першага агульнаславянскага летапіснага зводу ўсходніх славян «Аповесці мінулых гадоў».

У кантэксце гэтага выказвання значэнне і веліч перамогі ў Грунвальдскай бітве 1410 года вымяраецца найперш тым фактам, што мір з немцамі трываў амаль 500 гадоў – да Першай сусветнай вайны, калі на пачатку XX стагоддзя зноў аднавілася нямецкая экспансія на славянскія і балтыйскія землі. Дзіўна, але публічнае ўсведамленне і прызнанне фенаменальнай па сваіх выніках перамогі ў Грунвальдскай бітве прыйшло да тагачаснага беларуска-ліцвінскага грамадства не адразу, а, калі быць дакладным, цягам стагоддзя. Калі ў Польшчы гісторыя Грунвальдскай бітвы знайшла даволі падрабязнае адлюстраванне ў каралеўскай «Хроніцы канфлікта Уладзіслава, караля Польшчы, з крыжаносцамі ў год Хрыстовы 1410», лістах Ягайлы да каралевы Ганны і пазнанскага епіскапа Альберта (1410 г.) [2, с.177–181], «Летапісах, альбо Хроніцы слаўнага Каралеўства Польскага» (1455–1480 гг.) Я. Длугаша, у шматлікіх вершах і калектыўнай паэме «Перамогі каралеўства, атрыманыя над крыжакамі» (1511 г.), напісанай прафесарамі Кракаўскага ўніверсітэта [1, с. 65], дык у ВКЛ да пачатку XVI стагоддзя яе не зафіксаваў ні адзін з беларуска-літоўскіх летапісаў. Нават знакамітая «Пахвала Вітаўту», створаная напярэдадні каранацыі Вітаўта, ні словам не згадвае пра вялікага князя як пра пераможцу тэўтонцаў. Толькі праз 100 гадоў на фоне катастрафічнага абвастрэння адносін з усходнім і паўднёвымі суседзямі, няўдалай вайны 1507–08 гг. і здачы Смаленска (1514 г.) Масковіі, а затым дзівоснай, фантастычнай па сваіх выніках перамогі пад Оршай (1514 г.) прыйшло ўсведамленне эпахальнасці падзеі, што адбылася на Грунвальдскім полі ўлетку 1410 года.

Выдатны ўклад у мастацкую распрацоўку і асэнсаванне падзей стагадовай даўніны ўнёс паэт-лацініст Ян Вісліцкі, які ў 1515 г. стварыў, а ў 1516 г. выдаў у Кракаве ў друкарні Яна Галера свой лацінамоўны зборнік з аднайменнай паэмай «Пруская вайна», у якой знайшлі адлюстраванне падзеі Грунвальдскай бітвы 1410 г. і вобразы яе галоўных герояў – Ягайлы і Вітаўта, знакамітая Аршанская бітва 1514 г., гісторыя каралеўскай дынастыі Ягайлаў, пачынаючы ад шлюбу караля з беларускай княжной Соф'яй Гальшанскай і да сучаснага валадара Жыгімонта I Старога і інш.

Даследчыкі па-рознаму тлумачаць амаль стагадовае забыццё, а затым нечаканае ўзрастанне цікавасці ў літаратуры ВКЛ першай паловы XVI стагоддзя да падзей

стагадовай даўніны, вынікам чаго стала з'яўленне паэмы Я. Вісліцкага, а праз некаторы час, у другой чвэрці XVI стагоддзя, – летапісных згадак аб Грунвальдскай бітве 1410 г. у «Хроніцы Быхаўца».

Сам Я. Вісліцкі, як вядома, тлумачыў сваю ўвагу да падзей Грунвальдскай бітвы неабходнасцю захаваць памяць аб славутых падзеях для нашчадкаў, «каб з апісаннем яе з'явілася якая-небудзь занатаваная памяць, якая б нават па прашэсці часу палымнела для ворагаў яшчэ больш сурова і жорстка, мацуючыся імкненнем да славы Радзімы» [1, с. 106].

На думку Я. Парэцкага, паэт «быў перш за ўсё заклапочаны тым, што вялікая гістарычная бітва, выйграная Ягайлам і Вітаўтам супраць ордэна крыжаносцаў, заставалася ў цені, забывалася. Патрыятычныя пачуцці паэта абражала недаацэнка сучаснікамі ўрокаў, паднесеных гісторыяй, яго абураў настрой польскіх магнатаў, якія шукаюць на ўсходзе лёгкую здабычу, раўнадушша знаці да справы перашкоды шляху германцам на ўсход, яе зацікаўленасць пераняць прыклад крыжаносцаў» [7, с. 50].

Новы аспект пытання закранае Ж. Некрашэвіч-Кароткая, якая лічыць, што зварот да Грунвальда адлюстраваў зацікаўленасць аўтара асобай «героя-манарха, ад якога залежыць ход гісторыі, які робіць вялікі ўплыў на ўмацаванне дзяржавы, адыгрывае значную ролю ў жыцці яе народаў». Пры гэтым даследчыца звярнула ўвагу на тое, што паэт вырашаў праблему ўладара традыцыйна, у духу сярэднявечнай родава-дынастычнай парадыгмы «дзяды – унукі»: «Такім быў кароль і вялікі князь Ягайла, які апяваецца ў паэме «Пруская вайна». Такім жа прадстаўляе паэт і яго ўнука, караля і вялікага князя Жыгімонта, які ўславіў сябе велічнымі ратнымі дзеямі, і найслявуцейшая з іх – перамога пад Оршай» [1, с. 43].

Такім чынам, ў творы Я. Вісліцкага, несумненна, мелі месца і апалагетыка родавай дынастыі Ягайлавічаў, і прамыя гістарычныя паралелі і аналогіі паміж героямі і падзеямі стагадовай даўнасці, і вера ў тое, што Аршанская бітва 1514 г. стане такім жа пралогам да канчатковай перамогі над ваяўнічымі суседзямі, як і колішняя пераможная бітва пад Грунвальдам над крыжакамі.

Няцяжка заўважыць, аднак, што прычынна-выніковы шэраг далёкіх і блізкіх падзей айчыннай і еўрапейскай гісторыі, звязаных з урокамі і прыкладам Грунвальдскай бітвы 1410 г., падпарадкаваны ў «Прускай вайне» вырашэнню адной скразной праблемы – праблемы вайны і міру, якая стала ідэйным стрыжнем і іншых літаратурных твораў, створаных ураджэнцамі альбо выхадцамі з ВКЛ на пачатку XVI стагоддзя. Гаворка, у прыватнасці, пойдзе пра «Песню пра зубра» М. Гусоўскага, напісанную на этапе, калі стала відавочным, што калісьці магутная і дужая еўрапейская дзяржава, якой яна была ў часы Вітаўта, уступіла ў пару працяглага крызісу і пачала хіліцца да свайго заняпаду.

Менавіта таму праблема захавання міру, стварэння эфектыўнай сістэмы бяспекі па ўсёй дузе знешніх межаў Княства і Кароны з ваяўнічымі суседзямі (Прускім герцагствам на паўночным захадзе, Масковіяй – на усходзе, крымскімі татарамі і туркамі – на поўдні) не толькі вызначыла змястоўную ідэйную лінію абодвух твораў, але адлюстравала розныя падыходы і стаўленне дзяржаўна-палітычных і інтэлектуальных элітаў абедзвюх краін да іх вырашэння.

У чым сыходзяцца аўтары, дык гэта ў агульнагуманістычным пафасе непрыняцця і адмаўлення войнаў як сродка вырашэння канфліктаў і спрэчак паміж дзяржавамі і народамі. Так, свае адносіны да войнаў у сувязі з ваеннай кампаніяй 1409–1411 гг. Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага супраць Тэўтонскага ордэна, а таксама сучаснымі Жыгімонту I падзеямі, звязанымі з намаганнямі Прускага герцагства Альбрэхта Гогенцолерна вызваліцца ад васальнай залежнасці, Я. Вісліцкі, напрыклад, выказаў у паэме «Пруская вайна» наступным чынам:

…Я ж разважаю, што часта
Войны грымяць бессэнсоўна, дзіўлюся, чаму так упарта
Сталі да Марсавай звады імкнуцца народы, у змову
Супраць дзяржавы тваёй уступіўшы, між імі – дружына
Рэйнцаў адборных, а з імі – саюзнікі ў страшным злачынстве:
Раці паўночнага племя, таксама цымбрыйцы.
…Так спадзяваўся той сход вераломны германскага люду
Знішчыць кляйноты славутыя польскіх усіх самадзержцаў,
Род іх святы скасаваць, насадзіўшы ліхія законы,
І авалодаць стырном той вайны, каб сабе падначаліць [1, с. 117].

Справядлівая вайна Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага супраць Тэўтонскага ордэна разглядаецца аўтарам як вымушаная, выкліканая пагрозай для свабоды і мірнага жыцця народаў дзяржавы. Я. Вісліцкі ўдакладняе таксама, што вайна як бесчалавечная і антыгуманная з'ява пярэчыць міралюбнай, напоўненай любоўю натуры Ягайлы, гатовага да кампрамісаў і пошукаў міру, аднак кароль вымушаны прыняць выклік ворага.

Вось міласэрны кароль, не жадаючы кровапраліцця,
Смела кіруе паслоў, каб стрымаць тую прагу да войнаў:
Можа б з народамі ўсімі ў ваенны саюз уступілі,
Можа, згадзіліся б жыць з імі вечна ў сяброўскіх стасунках?
Ды адхіляюць яны караля прапановы аб міры,
Шлюць у адказ грозны знак: два мячы, што абмыты крывёю,
З імі загады пыхлівыя, словы ганебных пагрозаў.
Толькі кароль гэтых слоў не пужаецца: выклік прыняўшы,
Кліча на бітву прыхільных да Марса. І вораг тым часам
Войска склікае, з гатоўнасцю ў лютую сечу імкнецца [1, с. 137].

Гэтак жа рашуча і бескампрамісна выступаў супраць войнаў М. Гусоўскі. У паэме «Песня пра зубра» паэт стварае сапраўдны гуманістычны трактат супраць войнаў, у якім мабілізуе цэлы шэраг канкрэтных аргументаў і фактаў з гісторыі і лёсу сваёй радзімы – Вялікага Княства Літоўскага, народы якога пакутуюць ад бясконцых нападаў татараў, туркаў і маскавіцян, якія спрабуюць навязаць народу паднявольнае жыццё, усталяваць свае парадкі.

Войны! Злачынная справа – вайна выклікае
Гнеў мой, і слёзы, і боль. Без падтрымкі, бясконца
Войны вядзем мы адзін на адзін за свяшчэнны
Братні саюз хрысціянства з навалай з усходу [3, с. 80].

Выйсце з цяжкога становішча паэт, як і яго мецэнат Эразм Цёлак, бачыў у стварэнні калектыўнай сістэмы еўрапейскай бяспекі праз заключэнне саюза хрысціянскіх дзяржаў супраць татараў і туркаў – ворага, які «ў імя нам чужацкага бога // Лад свой агнём і мячом усталёўвае ў землях // Іншага веравызнання і іншых парадкаў».

Памкненні да міру, аднак, не выключаюць, а хутчэй прадугледжваюць пастаянную гатоўнасць да вайны, паэтызацыю і захапленне воінскай доблесцю герояў, умелай палітыкай уладароў, здольных спалучаць у палітычнай дзейнасці міралюбную палітыку з гатоўнасцю да вайны і пагрозай ужывання вайсковай сілы. Менавіта такім і паўстае са старонак «Песні пра зубра» Вітаўт.

Ён паміж войнамі ў шапку не спаў і дружыны
У дзікіх аблавах на звера прывучваў змагацца
Так, як у бітвах з татарамі, і гартаваў іх
Сілу і дух у нягодах няспынных паходаў.
Ён, двуадзіны ў асобе вялікага князя –

Факельшчык войнаў са слабым, а з дужым анёл-міратворац,
Ставіў аголены меч свой, як слуп пагранічны,
Перад нашэсцямі ворагаў з поўдня і ўсходу [3, с. 94].

Вайна і мір паўстаюць у паэтаў у хісткай раўнавазе дзвюх сваіх сутнасцяў і мэтаў – вайна як неабходны сродак абароны і забеспячэння міру; і вайна як спосаб падпарадкавання і ўладарання над іншымі народамі і дзяржавамі. Грань паміж гэтымі паняццямі вельмі ўмоўная і цяжка адрозная, паколькі сама вайна разглядаецца як непазбежнае зло, а шлях да міру, як правіла, ляжыць цераз пераможную вайну. Па прызнанні М. Гусоўскага, «Мірны перыяд між войнамі быў перадышкай, // каб адпачыць, падвучыцца і, страты пакрыўшы, // Рушыць у новы паход.» [3, с. 96].

Тое ж назіраем і ў «Прускай вайне» Я. Вісліцкага, дзе ўрачыстая песня і пахвала міру як бы вырастаюць у канцы трэцяй кнігі з апафеозу вайны, гучаць як гімн уладаранню і воінскай сіле Жыгімонта I Старога, як пафасны заклік да ўсталявання верхавенства караля над варожымі народамі. Пры гэтым нельга не адзначыць у творы Я. Вісліцкага пэўныя праявы імперскага мыслення.

Выйдзі з суровай вайною да земляў далёкіх і блізкіх,
Што амываюцца водным бязмежжам глыбокага мора, –
Чорны індус, назамон – пагроза на моры, парфянін
І македонец, яшчэ егіпцянін абходзяць там нівы;
Ты прывядзі іх да ўлады сваёй, а другія дзяржавы
Хай дасылаюць галіну аліўкі табе са спагадай,
Дзіўныя хай гарады для цябе адчыняюць вароты,
Плешча няхай у твой гонар фракійскі Басфор невычэрпны,
Каб авалодаць ты мог зямлёй візантыйскай, якую
Вельмі даўно святары захапілі з турэцкай дзяржавы.
<…>
Мір усталюецца шчасны тады, век Сатурна настане… [1, с. 169–171].

У 20-х гг. XVI стагоддзя ў шэрагу надзённейшых задач забеспячэння міру стала таксама выразна ўсведамляцца неабходнасць умацавання ўнутранага духоўнага і сацыяльна-палітычнага адзінства народа і кіруючых магнацка-шляхецкіх эліт, пошук саюзнікаў і, галоўнае, спадзяванні на *эфектыўнага ўладара*, які б мог забяспечыць рэалізацыю важнейшых нацыянальных задач, што паўставалі перад абедзвюма дзяржавамі на рубяжы стагоддзяў, у эпоху карэнных перамен і абнаўлення ўсёй сістэмы каштоўнасных каардынат і арыенціраў, звязаных з фарміраваннем і ўсталяваннем новага гуманістычна-рэнесансавага погляду на праблему ўлады і ўладара (прыгадаем, што менавіта на гэты перыяд прыпадае з'яўленне знакамітага трактата Нікало Макіявелі «Гаспадар» (1513 г.). Карацей кажучы, дзяржаве патрабаваўся мудры і цвёрды ўладар, дзяржаўны муж, які здолеў бы абараніць краіну, усталяваць справядлівыя законы, з'яднаць народ перад тварам смяротнай пагрозы з паўночнага захаду, усходу і поўдня.

Апошняя задача выглядае асабліва актуальнай, калі прыняць пад увагу дваістасць і традыцыйна хісткае становішча Ягелонаў як уладароў Польшчы і ВКЛ, якія цягам стагоддзяў забяспечвалі саюз абедзвюх (досыць адрозных у нацыянальна-рэлігійным і дзяржаўна-палітычным плане) дзяржаў шляхам палітычных кампрамісаў, пагадненняў альбо персанальных уній, якія грунтаваліся на сумяшчэнні ў адной персоне пасадаў караля і вялікага князя. Апошні пры гэтым вымушаны быў пастаянна лавіраваць, абапірацца на тыя ці іншыя магнацкія групоўкі альбо шляхецкія эліты ў Кароне або Княстве, задавольваць іх інтарэсы, каб утрымліваць абедзве дзяржавы ў стане раўнавагі і грамадзянскага міру.

Вядома, напрыклад, што ў цэлым узгодненыя пазіцыі караля і вялікага князя Жыгімонта I Старога і тагачаснага канцлера і ваяводы ВКЛ Мікалая Радзівіла (1470–

1521) падчас Венскіх кангрэсаў 1515 і 1518 гг. адносна Прускага герцагства, Масковіі, крымскіх татар і Турцыі ўсё ж мелі пэўныя разыходжанні: Жыгімонт бачыў асноўную пагрозу з боку Прусіі, канцлер жа Мікалай Радзівіл, выяўляючы волю і памкненні ліцвінскай шляхты, быў схільны падтрымліваць пазіцыю імператара Максіміляна Габсбурга, які ініцыяваў стварэнне антытурэцкай кааліцыі і жадаў удзелу ў ёй Жыгімонта [8, с. 204]. Даследчыкі адзначаюць, што асноўная сфера геапалітычных інтарэсаў на гэты момант для Польскай Кароны «палягала ва ўсталяванні кантролю над Нямецкім Ордэнам, а для ВКЛ у кантролі над сваімі ўсходнімі межамі і барацьбе за гегемонію ва ўсходнеславянскім рэгіёне» [8, с. 196].

Адсюль, напрыклад, разбежнасць аўтарскіх падыходаў і ацэнак ролі Ягайлы, Вітаўта і сучаснага аўтарам Жыгімонта І Старога ў «Прускай вайне» Я. Вісліцкага і «Песні пра зубра» М. Гусоўскага, вобразы якіх зазналі ў творах складаную кан'юнктуру грамадска-палітычных, нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў, асабістых сімпатый і антыпатый, нарэшце, адлюстравалі салідарную пазіцыю аўтараў і іх патронаў, апекуноў і мецэнатаў. Такімі для Я.Вісліцкага былі Павел Русін з Кросна і Жыгімонт І Стары; для М. Гусоўскага – Эразм Цёлак і, відавочна, канцлер ВКЛ Мікалай Радзівіл (згадаем, што менавіта да апошняга звяртаўся Эразм Цёлак з просьбаю прыслаць чучала зубра, каб падараваць яго папе Лявону Х).

Так, калі Я. Вісліцкі лічыў пагрозу з боку Прускага герцагства надзвычай рэальнай і найбольш небяспечнай на фоне пагроз і пастаянных войнаў з Маскоўскай дзяржавай, крымскімі татарамі і Залатой Ардой, дык М.Гусоўскі, наадварот, якраз у апошніх бачыў найбольш небяспечных і страшных ворагаў, якія пагражаюць самому існаванню народа, падрываючы духоўныя асновы яго існавання, спрадвечны лад і парадак.

Вораг страшэнны адольвае нас і зламысна
Рэжа пад корань наш род і вучэнне Хрыстова
Ў душах народаў на ўсіх заняволеных землях,
Ён, спадцішка ўварваўшыся ў нашы ўладанні,
Цэламу свету нахабна сцвярджае: ваюю
Не за прастору сабе, а за лад у прасторы.
З верай сваёй ён ідзе і ў імя нам чужацкага бога
Лад свой агнём і мячом усталёўвае ў землях
Іншага веравызнання і іншых парадкаў.[3, с. 120]

Калі Я. Вісліцкі ўслаўляў у асобе Ягайлы і Жыгімонта дынастыю Ягелонаў як патомных уладароў абедзьвух дзяржаў, з'яднаных асобаю прадстаўнікоў дынастыі ў адзінае цэлае, дык у паэме М. Гусоўскага фактычна ўпершыню выразна адлюстраваўся крызіс даверу шляхецкіх колаў ВКЛ да кіруючай дынастыі, у алегарычнай мастацкай форме ўвасоблена мара аб асобным, самастойным уладары для Княства, узор якога бачыўся аўтару ў асобе Вітаўта Вялікага.

Аналіз мастацкага зместу і дэшыфроўка алегарычных вобразаў твораў выразна фіксуюць гэтае прынцыповае разыходжанне ў ідэйнай пазіцыі аўтараў, як і ў цэлым палемічны характар «Песні пра зубра» ў дачыненні да зместу і мастацкіх прынцыпаў «Прускай вайны» Я. Вісліцкага.

Так, Я. Вісліцкі, які засведчыў аб сабе, што ён «нарадзіўся ў самым цэнтры далёкага краю», відаць, сапраўды паходзіў з беларускіх земляў, але ягоны рэгіяналізм, на нашу думку, не заключае ў сабе нейкіх відочных прыкмет ліцвінскага патрыятызму. Апісваючы Грунвальдскую бітву, паэт услед за Я. Длугашам не толькі аддае першынство Ягайлу, але ўсюды падкрэслівае васальную і духоўна-сакральную залежнасць Вітаўта ад караля. Калі Ягайла, напрыклад, увасабляе ў творы наканаваную Боскім Промыслам місію міраносца, дык мужны і змагарны Вітаўт – толькі выканаўца, меч вайны ў руках Боскага караля. Просьбіт, якому належыць пакорліва чакаць волі багоў,

таямніцай якой нібыта валодае Ягайла. У адказ на папрокі і просьбу Вітаўта, «каб і палякі твае супраць ворага рушылі ў бітву», утрапёны ў малітву, Ягайла гаворыць:

«Браце шаноўны! Стрымай ты шалёны парыў свой душэўны,
Мірам дазволь жыватворным цяпер суцяшацца ў спакоі.
Не замінай жа, малю, мне каля алтара служыць Богу,
Ты пачакай заканчэння ўрачыстай імшы ў яго гонар.
Толькі тады, – не раней, – калі скончыцца богаслужэнне,
Я загадаю, каб разам з табою і нашы палякі
У бітву ўступілі, аддам я загад і прышлю дапамогу.
Зараз жа рэшту збяры сваіх вояў і лагер ахоўвай,
Ды пастарайся стрымаць наступленне імклівых тэўтонцаў».
Вітаўт у гневе загады прыняў, зноўку рынуўся ў сечу [1, с. 141].

Як вынікае з твора Я.Вісліцкага, мір для Ягайлы – справа сакральная, боская, здабыць яго можна пранікнёнай малітвай, сакральнай лучнасцю з Богам. Вітаўт жа мысліць і ўспрымае мір як з'яву рэальную, канкрэтна-гістарычную, якая залежыць ад намаганняў людзей, волі, учынкаў, умеласці і мужнасці самога чалавека.

Такой жа пазіцыі, як памятаем, прытрымліваўся і аўтар «Песні пра зубра», які дэкларава ў актыўнае стаўленне да рэчаіснасці, верыў у мажлівасць яе пераўтварэння ў адпаведнасці з ідэаламі і памкненнямі самога чалавека.

Твой абавязак – і справу сваю і бяспеку
Сам барані, бо сваімі ж рукамі трымаеш
Дзіду ці лук ды і лёс. Не ўтрымаеш – загінеш. [3, с. 84]

Трэба прызнаць, што ў апісанні і трактоўцы падзей Грунвальдскай бітвы і яе галоўных герояў Я. Вісліцкі, як «выхаванец Польскай Айчыны», цалкам ідзе ўслед за Я. Длугашам, які аддаваў прыярытэт у перамозе палякам, а пра адступленне ліцвінаў пісаў, што ўцякаючае літоўскае войска «ахапіў такі страх, што большасць іх прыпыніла ўцёкі, толькі дасягнуўшы Літвы» [4, с. 102]. Хоць, напрыклад, ужо М. Стрыйкоўскі ў сваёй «Хроніцы польскай, літоўскай, жмудскай і ўсёй Русі» прыўносіў у апісанне Я. Длугаша значна больш аб'ектыўную і прыхільную ў дачыненні да ліцвінаў трактоўку і тлумачэнне гэтага эпізода бітвы, звяртаючы ўвагу на тое, што менавіта харугвы ВКЛ, якія першыя ўступілі ў бой, прынялі на сябе галоўны ўдар адборных рыцарскіх кагорт тэўтонцаў, сабраных у харугвах маршала Ордэна Фрыдрыха фон Валенрода. І хоць не здолелі ўстаяць супраць ворага ў пачатковай фазе бою, цаною вялікіх страт і ахвяр (загінула амаль палова войска ВКЛ) і стойкасцю смаленскай, віленскай, троцкай і гарадзенскай харугваў на чале з Вітаўтам, якія не пакінулі поля бою, унеслі вялікі ўклад у перамогу над ворагам. Пры гэтым хроніст дае зразумець, што прарыў і разгром рыцарамі Валенрода часткі ліцвінскага войска былі справакаваны здрадай чэха Яна Жарноўскага і ўцёкамі з поля бою ўзначальваемай ім галаўной харугвы святога Юрыя, у якой былі сабраны наёмныя рыцары-чужаземцы, прыданыя ліцвінам.

Lecz zbrojnym Niemcom ręcznej bitwy nie wytrwali,
Tylko z łuków uffy ich z boku przerywali,
Część ich w pole pierzchnęła, aż do samej Litwy
Powiedając przegranej szkutek bitwy.
Lecz nie trzeba dziwować, gdyż na pierwszym czele,
Potkali się dość mężnie i czynili śmiele,
I wszystek gwałt na sobie zbrojnych zatrzymali,
Musielić biedni wytchnąć, gdy się spracowali.
Smolensczanie Russacy czyście zastawili,
Z Wilnowcami, z Troczany sławy poprawili,
Pod trzemi chorągwiami udeżyli z boku,

A krzyżacki walny uff wnet ustąpił kroku.
Czym wieczną cześć od sławy wzięli nieśmiertelnej,
Pomagając Polakom z uprzejmości wiernej;
Zaś Czech Zarnowcki pierzchnął wnet z cudzoziemcami,
W pierwszym potkaniu zmowę miał zdrajca z Niemcami [6, т. 2, с. 133–134].

Дарэчы, падкрэсліванне, акцэнт, які робіць Я. Вісліцкі і даследчыкі ягонай творчасці на ліцвінска-беларускім паходжанні пачынальнікаў новай дынастыі (Ягайлы і ягонай трэцяй жонкі Соф'і Гальшанскай), наўрад ці можна разглядаць як нейкую праяву з боку аўтара ліцвінскіх сімпатый. На наш погляд, гэтыя акцэнты толькі замацоўвалі ў грамадскай свядомасці дынастычнае права каралёў Польшчы на валоданне балтыйскімі і ўсходнеславянскімі землямі, з'яўляліся як бы ідэалагічным абгрунтаваннем польскага «сарматызму». Я. Вісліцкі нездарма агаворваецца ў пачатку першай кнігі «Прускай вайны»:

Слаўная тая зямля пад мядзведзіцаю Лікаонскай,
Што ахапіла прастору бязмежную і валадарства,
Многія землі ў сабе замыкае з адрозным найменнем.
Тытул даўнейшы – Сарматыя – даў ёй сусед, бо не ведаў:
Лёсам прызначана ёй па заслугах Палоніяй звацца.
Люд, што сябе на мове спрадвечнай палякамі кліча,
Тут свае нівы абходзіць, і шмат гарадоў знакамітых
Служаць кароне тваёй і законам тваім, Жыгімонце! [1, с. 119].

Іншая справа М. Гусоўскі, ліцвінскі патрыятызм якога не выклікае сумнення. Калі для Я. Вісліцкага Жыгімонт I Стары – спадкаемца і нашчадак славы Ягайлы, «пераможца славуты, айцец нашай польскай айчыны», які пад Оршай «адолеў шматлікае войска // Скіфскага князя», дык у паэме М. Гусоўскага «Песня пра зубра» Жыгімонт праяўляе сваю рыцарскую доблесць у паляванні на зубра, загнанага хітрыкамі ў пастку-пасынак, у чым нельга не ўбачыць скрытай іроніі.

Тут і кароль; ён бясстрашна ўразаецца першы
У пекла пабоішча. Прыкладам храбрасці ўласнай
Дух падымае ў дружыны. І гэта адвага –
Строгі разлік, бо з дружыны ніхто б не памкнуўся
Зрушыцца з месца, калі б ён камандаваў ззаду [3, с. 84–85].

Іншых прыкладаў доблесці ўладара, якія б адпавядалі грамадскім і палітычным ідэалам аўтара, як і часу, каб уславіць ягоныя велічныя справы, пра якія ён упамінае похапкам і вельмі ў агульным плане, у паэта не знайшлося. Пэўны скрыты падтэкст, які мяжуе з выклікам, адчуваецца і ў абяцанні падданага іншым разам, пры адпаведнай нагодзе, апяяць справы караля.

Хіліць пяро маё ўбок, каб табе, Сігізмундзе,
Бацька Кароны і ўдзелаў Літоўскага княства,
Славу прапець і ўхваліць твае поспехі ў справе
Дома вялікай, за межамі краю – не меншай.
Гэта не лёгка, бо тут мне дарадцаў не будзе:
Выпадзе час – паспрабую; як мудрыя кажуць:
Будзе на свеце спакой, дык і песенька будзе [3, с. 85].

Працытаваная страфа, і асабліва заключны радок у ёй, відочна ўтрымлівае двухсэнсоўнасць – папрок Жыгімонту, які не здолеў забяспечыць мір і бяспеку на ўсходзе і паўднёвых межах ВКЛ. Абяцанне «славу прапець» у такім выпадку сапраўды уяўляецца справай нялёгкай. Асабліва калі ўлічыць, што гэтую задачу ўскладняў для М. Гусоўскага яшчэ і той факт, што менавіта Жыгімонт I, у выніку разнагалоссяў з мецэнатам паэта Э. Цёлкам, вызваліў апошняга ў 1521 г. ад абавязкаў

пасла ў Ватыкане, фактычна адмовіўшыўся ад ідэі стварэння кааліцыі хрысціянскіх дзяржаў супраць татараў і турак, што азначала для ВКЛ працяг кровапралітнай вайны. Неўзабаве пасля гэтага Э. Цёлак памёр. У тым жа 1521 г. не стала ваяводы і канцлера ВКЛ Мікалая Радзівіла. Так што М. Гусоўскаму, які завяршаў працу над паэмай, давялося самому вызначаць сваю пазіцыю ў дачыненні да Жыгімонта Старога: «Гэта не проста, – прызнаваўся паэт у паэме, – бо тут мне дарадцаў не будзе». Наколькі смелай і самастойнай аказалася пазіцыя паэта, можна меркаваць па тым, што адпаведная статусу ўладара песня ў гонар Жыгімонта І у паэме так і не з'явілася. Больш за тое, як заўважыў У. Калеснік, «ідэалам дзяржаўнага ўладара Гусоўскі аб'явіў не Сігізмунда і некаго іншага з Ягелонаў, а Вітаўта – пазіцыя прынцыповая і незалежная. Думаць так недыпламатычна, знаходзячыся ў складзе дыпламатычнай місіі, мог толькі сапраўдны паэт і смелы грамадзянін» [5, с. 171].

Выбар Вітаўта ў якасці галоўнага героя і ідэальнага ўладара быў, такім чынам, выяўленнем свядома акрэсленай палітычнай тэндэнцыі, якая заключалася ў фарміраванні ў асяроддзі патрыятычнай ліцвінскай шляхты апазіцыйных настрояў у дачыненні да дынастыі Ягелонаў як праваднікоў польскай экспансіі на землях ВКЛ.

М. Гусоўскі, відаць, прыйшоў у Рыме да сумнага для сябе вываду, што дынастыя Ягайлавічаў больш не з'яўляецца гарантам і выразнікам суверэнных правоў і інтарэсаў Літоўскай дзяржавы. І ў выніку нават паставіў пад сумненне сам дынастычны прынцып перадачы ўлады па спадчыне, апелюючы да эпохі Вітаўта, які калісьці ў адкрытым спаборніцтве з Ягайлам і ягоным стаўленнікам у Літве князем Скіргайлам даказаў сваё права валодаць Княствам талентам мудрага палітыка, воляй і мужнасцю спрактыкаванага воіна.

Ва ўсякім выпадку, карціна бітвы зброў за права стаць на чале зубрынага статка, на нашу думку, не толькі заключае ў сабе алегарычны падтэкст, але і відочна карэлюе з вядомымі падзеямі, апісанымі ў «Летапісе вялікіх князёў літоўскіх».

І ў пушчах, і ўсюды на свеце
Моцныя гэтага свету за права на ўладу
Б'юцца на злом галавы....
<…>
Дужы са слабым уладай дзяліцца не стане;
Права царова ў чародах на пашы і ў спрэчках
Даў яму вопыт, набыты магутнаю сілай.
Бой разгарыцца смяротны, і ў ім пераможа
Той, хто мацнейшы. Пад сонцам ніводнай хвіліны
Без барацьбы не было на зямлі і не будзе [3, с. 67–68].

У выніку эпоху валадарання Вітаўта, які, па словах аўтара, «сілу радзіме вярнуў, княства вялікім зрабіў», М. Гусоўскі назваў «залатой», звязаўшы з ягоным праўленнем росквіт і дзяржаўную веліч краіны, увасобіўшы ў вобразе вялікага князя Вітаўта свой ідэал нацыянальнага ўладара.

М. Гусоўскі, несумненна, быў знаёмы з паэмай Я. Вісліцкага «Пруская вайна». І хоць паэт нідзе непасрэдна не прыгадвае твор свайго земляка і не ўступае з ім у прамую палеміку, у «Песні пра зубра» выразна адчуваецца скрытае апаніраванне ідэйнай пазіцыі і поглядам Я. Вісліцкага як песняра дынастыі Ягелонаў. Гэта выяўляецца найперш у разрыве аўтара з папярэдняй традыцыяй пафаснага ўсхвалення Ягелонаў як бацькоў Княства і спадкаемцаў еўрапейскай Сарматыі, што было характэрна для «Прускай вайны» Я. Вісліцкага. Узяўшы на сябе абавязак «пець толькі праўду», М. Гусоўскі тым самым паставіў пад сумненне і многія ідэйныя і творчыя падыходы свайго папярэдніка.

Звяртае на сябе ўвагу найперш той факт, што ў творы М. Гусоўскага цалкам адсутнічае «грунвальдскі» аспект палітычнай і ваеннай біяграфіі Вітаўта, як і не згадваецца нідзе ні Ягайла, ні іншыя прадстаўнікі дынастыі Ягайлавічаў, за выключэннем Жыгімонта І Старога. Вытлумачыць гэта можна не толькі тым, што такія моманты біяграфіі герояў ужо згадваліся ў паэме Я. Вісліцкага. М. Гусоўскі як дыпламат быў добра дасведчаны ў праблемах, звязаных з канфліктам Жыгімонта І з Альбрэхтам Гогенцолерам. Згадаем, што як дарадчык свайго мецэната паэт ў 1518 г. у Аўсбургу браў удзел у перамовах Эразма Цёлка з цэсарам Максімілянам на прадмет роспуску Ордэна крыжакоў і вяртання Польшчы паморскіх земляў, таму ён добра разумеў, што канфлікт гэты блізкі да вычарпання, мае палітычны характар і не заключае ў сабе ні той пагрозы, ні той вастрыні і актуальнасці, якімі характаравалася сітуацыяй напярэдадні Грунвальдскай бітвы, у чым імкнуўся пераканаць свайго чытача Я. Вісліцкі ў паэме «Пруская вайна». Больш за тое, у 1521 г. крыжакі самі заключылі мір з Жыгімонтам. «Неспакойна было – адзначае У. Калеснік, – толькі ад татар, не наступала прымірэння з Маскоўскай дзяржавай з-за Смаленска» [5, с. 168].

Такім чынам, заключэнне ў 1521 годзе міру з Прускім герцагствам – леннікам Польскага каралеўства – і адмова ў тым жа годзе ад ідэі стварэння кааліцыі хрысціянскіх дзяржаў супраць татараў і туркаў, за якімі паследавала вызваленне Э. Цёлка ад абавязкаў пасла ў Ватыкане, азначалі мір для Кароны і працяг кровапралітнай вайны на ўсходзе і поўдні для Вялікага Княства Літоўскага. Не дзіўна, што такая пазіцыя Жыгімонта І была ўспрынята і расцэнена паэтам-дыпламатам як неадпаведная і нават здрадлівая ў дачыненні да нацыянальных інтарэсаў ВКЛ. Нездарма апісанне палявання на загнанага хітрыкамі ў пастку-пасынак зубра месцамі набывае ў творы адценне злавеснай алегорыі.

Стаў: не пад сілу бар’ер. Дзе ж знайсці паратунак?
Позіркам зырыць наўкола, шукаючы лоўчых,
А з-за камлістых дубоў, як куслівыя шэршні,
Стрэлы і дроцікі – дзын! – і ўпіваюцца ў цела.
Ярасць кіпіць унутры, наліваюцца бельмы
Чырванню мутнай, і кроў то цурком, то па кроплях
Сочыцца з поўсці, і пеняцца свежыя раны [3, с. 86–87].

Пры гэтым паэт не проста адмаўляецца пяяць Жыгімонту славу як нашчадку Ягайлы ці пераможцу ў Аршанскай бітве (што рабіў Я. Вісліцкі), але ўвогуле ставіць свой намер стварыць песню у гонар караля ў залежнасць ад таго, ці здолее манарх забяспечыць мір на найбольш небяспечным для Княства напрамку на ўсходзе і поўдні ВКЛ, адкуль зыходзіла пагроза дзяржаве з боку маскавіцян, татараў і туркаў.

Іменна пагэтаму «імперскай кампетэнцыі» (Ж. Кароткая-Некрашэвіч) Жыгімонта І, які паўстае ў творы Я.Вісліцкага «найперш уладаром Сармацкай Еўропы» і «Польскай айчыны», М. Гусоўскі ў «Песні пра зубра» супрацьпастаўляе вобраз Вітаўта – нацыянальна арыентаванага лідэра, заклапочанага выключна інтарэсамі абароны і ўмацавання сваёй дзяржавы – Вялікага княства Літоўскага.

Такім чынам, адкрытая апалагетыка Я. Вісліцкім у справах вайны і міру, валадарання землямі Кароны і Вялікага княства дынастыі Ягелонаў і, наадварот, узвелічэнне М. Гусоўскім у процівагу ім постаці Вітаўта засведчылі, што ў 20-х гг. XVI стагоддзя палітычная эліта ВКЛ перажывала востры крызіс даверу да кіруючай дынастыі Ягелонаў. У сувязі з гэтым у «Песні пра зубра» М. Гусоўскага актуалізуецца ідэя самастойнага, асобнага гаспадара для ВКЛ, здольнага забяспечыць мір і бяспеку народу і дзяржаве. Узорам такога ўладара выступае асоба Вітаўта.

Падобны вывад пацвярджаецца таксама дэшыфроўкай асобных алегарычных вобразаў паэмы М. Гусоўскага «Песня пра зубра» як твора ў значнай ступені палемічнага ў дачыненні да «Прускай вайны» Я. Вісліцкага.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Visliensis, Joanis. Bellum Prutenum = Вісліцкі, Ян. Пруская вайна / Joanis Vislien-sis / Ян Вісліцкі ; на лац. і беларус. мовах ; уклад., перакл., камент. Ж. Некрашэвіч-Кароткай. – Мінск : Прапілеі, 2005. – 234 с.

2. Гагуа, Р.Б. Грюнвальд в источниках : «Хроника конфликта Владислава, короля Польши, с крестоносцами в год Христов 1410 : монография / Р.Б. Гагуа. – Пинск : ПолесГУ, 2009. – 208 с.

3. Гусоўскі, М. Песня пра зубра / М. Гусоўскі. – Мінск : Маст. літ., 1980. – 192 с.

4. Длугош, Я. Грюнвальдская битва / Я. Длугош. – М. – Л. : Изд.-во АН СССР, 1962. – 216 с.

5. Калеснік, У. Тварэнне легенды : літаратурныя партрэты і нарысы / У. Калеснік. – Мінск : Маст. літ., 1987. – 431 с.

6. Kronika polska, litewska, żmódzka i wszystkiej Rusi Macieja Stryjkowskiego : w 2 t. – Warszawa : Nakład Gustawa Leona Glucksberga, Księgarza, 1846. – T. 2. – 561 s.

7. Парэцкі, Я.І. Ян Вісліцкі / Я.І. Парэцкі. – Мінск : Універсітэцкае, 1991.– 112 с.

8. Скеп'ян, Н.А. Удзел двара ВКЛ і канцлера ВКЛ у Венскім кангрэсе1515 г. / Н.А. Скеп'ян // Ягелоны: дынастыя, эпоха, спадчына : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Гальшаны-Навагрудак, 8–10 верас. 2006 г. НАН Беларусі, Ін-т гісторыі ; рэд. кал. : А.А. Каваленя (адказ. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2006. – С. 195–206.

Pranevich H.M. **From Jan Vislicki's «Prussian War» to Mikola Gusouski's «The Song about a European Bison»: Counterpoints of War and Peace**

In the article which is based on the material of J.Vislicki's book «Prussian war» and N. Gusouski's book «The song about a European bison» problems of war and peace from the point of view ofrenaissance ideal of a sovereign and abilities Jagelona's dynasty as owners of Great Duchy of Lithuania in providing of security and national interests of the country is studied.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 19.08.2011

УДК 378.147 : 81’255

Л.М. Лещёва

ИНТЕРАКТИВНЫЙ КОМПЬЮТЕРНО-ОПОСРЕДОВАННЫЙ СПОСОБ ФОРМИРОВАНИЯ ОСНОВ ПЕРЕВОДЧЕСКОЙ КОМПЕТЕНЦИИ

Анализируются основные методические парадигмы в процессе обучения иностранному языку. Подчеркивается, что метод обучения должен соответствовать цели. Автор развивает мысль о том, что господство коммуникативного метода в настоящее время практически полностью, но незаслуженно и преждевременно вытеснило традиционный метод перевода, особенно в обучении специалистов неязыкового профиля. Рассматриваются некоторые уникальные характеристики переводного метода обучения, которые являются значимыми для формирования профессиональной иноязычной компетенции современного специалиста. Предложена концепция электронного интерактивного пособия, призванного во внеаудиторное время на основе компьютерно-опосредованной коммуникации формировать у студентов неязыкового вуза основы переводческой компетенции.

Введение

Цель, содержание и методы обучения иностранному языку в неязыковом вузе достаточно четко определены программными документами. Вместе с тем если модуль социально-бытового и общественно-политического иноязычного общения является общим для студентов всех специальностей, то модуль профессионального и научного общения является идиосинкразическим для каждого вуза, факультета и специальности. Содержание, задачи профессионально-ориентированного иноязычного обучения, а также используемые методы и технологии в значительной степени определяются на местах кафедрами иностранных языков и советами вузов и остаются предметом научных дискуссий и поисков. В статье рассматриваются вопросы целесообразности обучения студентов неязыкового вуза основам переводческой компетенции и механизмы реализации этой задачи в условиях ограниченного количества аудиторных часов по дисциплине «Иностранный язык».

В поисках оптимального метода обучения иностранному языку всех категорий обучающихся в прошлом столетии разрабатывалось невиданное ранее количество теоретических концепций, методов и приемов: недаром двадцатый век именуют иногда веком методик обучения иностранным языкам. Каждых из методов, учитывая острый спрос на новый и более совершенный метод и отвечая новым потребностям общества, быстро завоёвывал в свое время главенствующее положение, но также быстро и уступал его следующему. Это был век, в котором долгое господство переводного метода окончательно сменилось доминированием прямого, сознательное обучение уступило место интуитивному; последовательное обучение элементам, уровням языковой структуры и видам речевой деятельности заместилось целостным, или холистическим, взаимосвязанным обучением.

В каждой стране своя история смены методических парадигм. В нашей стране до 70-ых годов школьники обучались иностранному языку, главным образом, на основе переводного метода, причем, не грамматико-переводного, требующего последовательного обучения грамматике, а текстуально-переводного в его худшем варианте, предполагающего простое чтение и перевод небольшого учебного текста. В некоторых школах практиковалось также заучивание наизусть составленного учителем небольшого текста на определенную тему.

В лингвистическом университете в 1970-ые годы при обучении студентов использовался комплекс методов главным образом структурного, аудио-лингвального и сознательно-сопоставительного. Причем при обучении структурным элементам языковой системы весьма значимой в то время была роль теории.

В неязыковых вузах при обучении иностранному языку иноязычной речи, практически, не обучали; основы внимание уделялось чтению и переводу специальной литературы. Результаты такого обучения были в целом неплохими, учитывая преследуемую цель: практически все специалисты в своих анкетах на вопрос о владении иностранным языком писали, что могут читать и переводить иноязычный текст со словарем.

Особенно строгой в эти годы была школьная методика: от учителя требовался жестко детерминированный комплекс упражнений на каждом этапе урока: объяснения, закрепления материала и т.д.

В это же время и чуть позже, в 1980-е годы, стали появляться на платной основе многочисленные курсы, на которых слушателей обучали с помощью загадочного суггестопедического метода и возникших на его основе многочисленных интенсивных экспресс-методик. На прилавках магазинов появились также пособия по обучению иностранному языку на структурно-функциональной основе. На курсах повышения квалификации педагогов обучали приемам максимальной активизации обучаемых в ходе занятий, создания в аудитории коммуникативных ситуаций, близких к реальным, формирования навыков устного иноязычного общения, как того требовал новый коммуникативный метод.

В настоящее время возможности для использования активных методик иноязычному обучению на коммуникативной основе резко возросли. В связи с развитием информационных технологий выросло количество новых средств обучения и изучения иностранного языка. Сейчас помимо книг, журналов, газет, учебных пособий, имеются разнообразные аудиоматериалы, в том числе аудиокниги, фильмы на DVD с оригинальной звуковой дорожкой и субтитрами, доступны также в неограниченном объеме материалы интернета (новости, тематические сайты, форумы и др.).

Перспективы возможностей реального или даже виртуального, опосредованного компьютером, иноязычного общения отодвинули практически все предшествующие методы обучения иностранному языку, кроме коммуникативного, на задний план. Особенно резко сдал позиции метод перевода как способ изучения современного иностранного языка, который сегодня, кажется, навсегда ушел в прошлое. В современной методической литературе, описывая современные методы и технологии обучения, авторы всячески подчеркивают, что они не имеют ничего общего с устаревшим и неэффективным переводным методом.

Отрицание методического наследия привело в определенной степени даже к кризису самой методологии обучения. Многие теоретики и практики стали весьма критично высказываться о роли методики в современном процессе обучения иностранному языку, даже поспешили объявить, что эра методики закончилась и что понятие «метод» мертво [1–5].

Однако следует заметить, что так называемый кризис метода в значительной степени связан с уделением бóльшего внимания, чем это было раньше, субъекту процесса обучения, его личностным, когнитивным характеристикам, индивидуальному стилю обучения, мотивации и цели изучения иностранного языка. В этой связи стало особо отчетливо ясно, что универсального способа обучения иностранного языка попрежнему нет.

Следует еще раз подчеркнуть, что метод обучения должен соответствовать прежде всего цели обучения, а ею не всегда или, по крайней мере, не исключительно во всех случаях является обучение устному коммуникативному общению.

Как известно, главной целью современного обучения иностранным языкам в неязыковом вузе является формирование у будущего специалиста интегративной коммуникативной иноязычной компетенции, которая должна позволить ему использовать иностранный язык как средство социально-бытового и профессионального общения. Типовая программа по дисциплине «Иностранный язык» предусматривает также формирование у студентов неязыкового вуза целого ряда частных компетенций и умений. Наряду с главным умением – вести устное общение социокультурного и профессионального характера в объеме, предусмотренном программой, – а также умениями чтения, аудирования и письма, в ней постулируется требование формирования умения переводить литературу по специальности обучаемых, которое проверяется на экзамене в устной и/или письменной форме [6].

Важность формирования у студента неязыкового вуза умения переводить специальную литературу не вызывает никаких сомнений. Современный специалист обязан уметь правильно понимать и переводить литературу по специальности. Эта компетенция не менее важна, чем компетенция устного иноязычного общения. Чтение специальной литературы предполагает адекватное понимание аутентичного текста, а, в свою очередь, самым надежным критерием такого понимания является правильный перевод на родной язык. Перевод важен также для того, чтобы специалист смог верно донести смысл прочитанного своим коллегам, мог пользоваться данными в научных и практических дискуссиях и т.д.

Однако в настоящее время в процессе обучения иностранному языку студентов неязыковых вузов предпочтение отдается коммуникативным методикам, и в аудитории используется, как правило, только так называемый педагогический перевод – вид упражнений, целью которых является контроль усвоения лексико-грамматического материала или проверка понимания прочитанного текста. Настоящий же перевод, направленный на формирование переводческой компетенции и ориентированный на адекватную передачу содержания текста оригинального иноязычного текста средствами родного языка, больше в наших аудиториях, практически, не используется. Причиной тому является серьезнейшая критика переводного метода, организованного методистами разных направлений, начиная от сторонников бихевиоризма, проповедовавших обучение тренировочным упражнениям типа «стимул – реакция» и кончая сторонниками коммуникативного метода, подчеркивающих примат речи.

Рациональное зерно в критике переводного метода как главного средства обучения иностранному языку, несомненно, есть: переводной метод занимает слишком много драгоценного времени на занятии, он не может обеспечить беглость иноязычной речи, последовательного обучения коммуникативным стратегиям, возможность «думать» на иностранном языке, не обращаясь к родному, и т.д.

Вместе с тем навыки перевода литературы по специальности не могут быть сформированы на основе превалирующего сегодня в обучении коммуникативного метода, даже если он сможет охватить все виды речевой деятельности: говорение, аудирование, чтение и письмо. Переводческая компетенция – это особая коммуникативная компетенция, не сводящаяся к навыкам в области перечисленных видов речевой деятельности, но которая так пригодится будущему специалисту.

Однако специального обучения переводу в вузе нет, умения и навыки перевода у студентов в современном неязыковом вузе обычно не формируются. Преподаватели, имеющие большой стаж работы в неязыковом вузе, отмечают, что «исключение перевода и вообще родного языка не даёт овладения языком на когнитивном уровне, т.е. глубинного понимания логики и структуры языка, формирует внешний, косметический пласт: усваиваются сленговые выражения, заучиваются наиболее употребитель-

ные фразы, формируются мимика и жестикуляция, сопровождающие речь, т.е. усваиваются лишь коммуникативные навыки» [7].

В результате сегодняшний выпускник вуза, пожалуй, еще в меньшей степени, чем это было в советское время, обладает умениями перевода специальной литературы. Об этом, например, свидетельствуют данные опроса, проведенного А.К. Фридзон среди специалистов - выпускников технических вузов, который показал, что они редко используют иностранный язык в своей профессиональной деятельности. При этом, как указали сами опрошенные, основная причина слабого использования иностранного языка кроется не в отсутствии ситуаций для его применения, а в низком уровне их языковых знаний, навыков и умений. Опрос выявил, что только 11 % специалистов умеют свободно читать иностранную литературу по специальности [8].

Подготовить специалиста, умеющего адекватно переводить, – это сложнейшая задача, требующая больших материальных затрат, высококвалифицированных обучающих специалистов, хорошей материальной и учебно-методической базы, особой атмосферы, в которой происходит обучение, наличия сложившихся традиций обучения и т.д. Обучение различным видам перевода осуществляется, как правило, только в языковых вузах или на специальных факультетах. Насколько же реальна возможность сформировать у студентов неязыковых вузов необходимое умение перевода специальной литературы?

Представляется необходимым более внимательно посмотреть еще раз на потенциал переводного метода, который можно использовать в неязыковом вузе в целях обучения студентов тщательной работе над текстом, извлечения нужного смысла и адекватного перевода его на русский язык.

Обучение иностранному языку на базе переводного метода содержало многие важные и интересные моменты, которые позволяли обучающимся глубоко проникать в сущность изучаемого иностранного языка. Так, учебная литература по иностранным языкам, в частности, по классической латыни и греческому, включала не только правила грамматики и глоссарии. Она содержала также отрывки из литературных и философских произведений великих людей Древнего мира: Вергилия и Геродота, Гомера и Горация, Платона и Аристотеля, Цезаря и Цицерона. Кроме того (и это весьма важно) тексты в пособиях, особенно, в XIX веке, содержали подробные комментарии, составленные известными филологами. Все это позволяло изучающим иностранный язык глубже понять содержание текста, лучше усвоить его грамматический, лексический и культурологический материал, ознакомиться с нравственными позициями его автора и обогатиться интеллектуально и духовно.

Еще одним важным достижением этого метода следует считать тщательно продуманное использование родного языка в качестве средства раскрытия значения слов и форм и требование рационального использования родного языка. Это требовало от студентов больших усилий, но именно так изучение древних языков превращалось в гимнастику ума. Некоторые из студентов впоследствии становились замечательными профессиональными переводчиками. Как указывается в одной статье из интернета, «по статистике все гениальные переводчики учились именно по этому методу» [9].

Учитывая ограниченное количество аудиторных часов по дисциплине «Иностранный язык», современные тенденции к личностно-ориентированному обучению, представляется важным создавать пособия, позволяющие студентам в значительной мере самостоятельно во внеаудиторное время с определенной поддержкой и помощью преподавателя формировать необходимые навыки перевода на базе уже имеющихся знаний и умений в области иностранного языка. Современные технологии позволяют обучать различным умениям и навыкам с помощью специальных электронных пособий в интерактивном режиме. Примером может служить электронное пособие по переводу

для самостоятельной контролируемой интерактивной работы студентов Академии управления при Президенте Республики Беларусь.

В качестве материала для перевода были выбраны известные афоризмы и изречения по государственному управлению. Данный вид текста представляет собой интересный материал прежде всего с точки зрения лингвистики перевода, поскольку на таких текстах, компактных по объему, законченных по характеру и насыщенных богатым стилистическим, лексическим, грамматическим и страноведческим материалом, достаточно удобно организовывать процесс обучения. Тематические афоризмы и изречения интересны также с точки зрения общего гуманитарного образования, страноведения и профессионально-ориентированного иноязычного обучения.

Важно еще раз подчеркнуть, что интерактивная работа и интерактивный перевод понимается здесь не как разновидность машинного перевода, позволяющая переводить предложения и целые сайты с одного языка на другой, а как опосредованная компьютером диалоговая (интерактивная) работа с преподавателем в рамках электронного пособия по переводу.

Машинный (компьютерный) перевод на сегодняшний день не способен заменить этот специфический, чисто человеческий вид коммуникативной деятельности. Для машины невозможно разработать правила правильной интерпретации текста и выбора средств в другом языке для адекватного перевода, поскольку невозможно передать машине всю сумму общих знаний, позволяющих человеку ориентироваться в окружающем мире и делать оптимальный выбор.

Рассмотрим варианты интерактивного (компьютерного) перевода, например, следующего англоязычного афоризма:

A civil servant is sometimes like a broken cannon – it won't work and you can't fire it. – George S. Patton (1885–1945), a United States Army officer.

Данный афоризм средствами шести использованных нами автоматических переводчиков переводится на русский язык следующим образом:

1) **гражданского служащего, иногда как BROKEN пушка – это wonвЂ™t работы и You Can' t пожара. – Джордж S. Патон (1885–1945), Соединенных Штатов армейский офицер* (*http://translation.babylon.com*)

2) *Государственный служащий иногда, как сломанная пушка – она не будет работать, и вы не можете ели Е она. – Джордж С. Паттон (1885–1945), армия Соединенных Штатов офицер (http://www.ackuna.com)*

3) *Государственный служащий иногда походит на сломанное орудие - это не будет работать, и Вы не можете запустить это. – Джордж С. Паттон (1885–1945), Армейский чиновник Соединенных Штатов* (*http://www.promt.com*)

4) *Государственный служащий иногда походит на сломанное орудие - это не будет работать, и Вы не можете обстрелять это. – Джордж С. Паттон (1885–1945), Армейский чиновник Соединенных Штатов* (*http://radugaslov.ru/promt.htm*)

5) *Государственный служащий иногда, как сломанная пушка – она не будет работать, и вы не можете уволить его. – Джордж С. Паттон (1885–1945), армия Соединенных Штатов офицер* (переводчик на *google.ru*)

6) *Государственный служащий иногда походит на сломанное орудие - оно не будет работать, и ты не можешь запустить его. – Джордж С. Паттон (1885–1945), офицер Соединенных Штатов* (*http://www.prof-translate.ru*)

Таким образом, перевод – это не только следование определенным правилам и приемам, которые можно исчислить и которым можно придать определенный алгоритм (в противном случае эту функцию успешно бы выполняли современные компьютерные программы по переводу). Процесс перевода предполагает также интерпретацию смысла исходного текста переводчиком и создание на языке перевода *нового* текста,

максимально достоверного оригиналу, соответствующего нормам языка перевода и внеязыковой действительности, предельно понятного для представителей иной культуры. Новый, созданный путем перевода текст должен также отражать стиль, ритм, музыку текста оригинала, а также заложенный в нем культурологический смысл и интенцию автора. Нет идеального перевода, есть только определенные акценты, сделанные переводчиком при прочтении им оригинального текста, и определенные находки переводчика, позволяющие ему передать некоторые смыслы текста оригинала.

В этой связи в разрабатываемом пособии предлагается вариант перевода, выполненного преподавателем, который появляется на экране после того, как студент предложил свой вариант перевода и «сдал» его на проверку преподавателю, нажав соответствующую кнопку на экране (в процессе перевода он может пользоваться всеми доступными лексикографическими источниками, в том числе, электронными). Далее студент может прослушать или прочитать лингвистический комментарий к переводу, в котором описывается переводческий прием определенного языкового явления, имеющего место в афоризме и обычно представляющего трудность при переводе (сравнения, метафоры, зевгмы, многозначности, фразеологизма, интертекстуальности и т.д.). У студента также имеется возможность получить от преподавателя оценку-комментарий своего перевода, прослушать афоризм на языке оригинала и в переводе, у преподавателя и студента имеется калькулятор, подсчитывающий процент выполненной работы от заданного объема. Электронное пособие позволяет студенту и преподавателю работать как в оперативном (on-line), так и в автономном (off-line) режимах.

Подобное пособие, на наш взгляд, может стать для студента «домашним репетитором» по переводу. Предоставленная в комментариях лингвистическая информация будет легче усваиваться студентом, нежели информация лекций, поскольку, самостоятельно выполняя перевод, он только что столкнулся с его сложностями. Толкование преподавателем своего способа перевода будет своевременным, так как это происходит на реальных занятиях; теория перевода при этом будет теснейшим образом связана с практикой: обучение теории перевода носит практико-ориентированный характер. Как говорит китайская поговорка, «слышу и забываю, я вижу и запоминаю, я делаю и понимаю».

Выполняемый таким образом перевод, на наш взгляд, не только способствует формированию переводческой компетенции, но и является важным способом обучения и изучения языка в целом, поскольку он базируется на использовании технических средств, обеспечивающих применение нескольких методов, ранее использованных для обучения иностранному языку. Например, как и в случае применения классического текстуально-переводного метода, в этом случае студенту предлагается для перевода текст (короткий по форме, образцовый по стилю, воспитывающий или расширяющий кругозор по содержанию). В процессе использования всех доступных видов словарей и справочников, в том числе электронных, студент приобретает важные навыки работы с лексикографическими источниками.

Как и в случае применения другого классического метода обучения иностранному языку – структурного, в процессе работы с пособием студент имеет возможность достаточное время уделить отдельным лексическим, грамматическим, фонетическим или стилистическим явлениям, вызывающим трудности перевода в связи с разной структурной организацией двух языковых систем.

В процессе работы над пособием используются элементы аудио-лингвального метода: студенту предлагается прослушивание оригинального текста, причем, прослушивание и имитация текста могло повторять много раз.

В нем можно также проследить элементы суггестопедического метода: в своей самостоятельной работе с имеющимися подробными ключами к заданию студент освобождается от прессинга, имеющего место в аудиторной работе и сдерживающего его

интеллектуальный потенциал. Пособие дает возможность свободно работать в свойственном ему образовательном стиле, темпе и режиме. Студент даже может выполнять работу над переводом под любимую музыку, что дополнительно снимает напряжение и помогает реализовывать имеющийся потенциал к изучению языков.

Большое внимание уделяется использованию сознательно-сопоставительного метода, позволяющего не только сконцентрировать внимание на сложных явлениях в изучаемом языке, но и объяснить их, а тем самым вооружить студентов метаязыком, дающим возможность лучше понять явления, лучше хранить полученные знания, эффективнее передавать их другим и вообще продуктивнее думать.

Элементы функционально-коммуникативного и деятельностного подхода к обучению иностранному языку в процессе работы над пособием просматриваются в том, что задание по переводу, выполняемое студентом, не является искусственным; оно максимально приближено к потребностям реального мира, что стимулирует всю его образовательную деятельность. Кроме того, материал, с которым студент сознательно и тщательно поработал в сопоставительном аспекте для адекватного перевода, может быть использован для дальнейшей работы в аудитории в процессе монологических иноязычных высказываний и дискуссий.

Вопрос о том, следует ли использовать метод перевода в настоящее время при обучении иностранному языку, вновь ставится на повестку дня, в том числе зарубежными исследователями [10]. Переводной метод обеспечивает выполнение ряда функций, не свойственных современным активным методикам иноязычного обучения, например:

1) быть «гимнастикой ума» (обеспечивать интенсивное выполнение когнитивных операций сознательного запоминания; вспоминания иноязычных структур и правил; процедур анализа и синтеза, дедукции и индукции);

2) обеспечивать нравственное и культурологическое образование (приобщать к идеям гуманистов, моралистов, воспитателей) и тем самым делать процесс обучения иностранному языку и процес воспитания неразрывным:

3) давать глубокое филологическое образование, которое может стать надежной базой для дальнейшей самостоятельной работы студента над языком;

4) формировать устойчивые навыки перевода, в том числе профессионально-ориентированной литературы.

Заключение

Студентоцентричность сегодняшнего обучения иностранным языкам заставляет пересмотреть сущностные характеристики известных методов и приемов обучения, чтобы максимально удовлетворить запросы обучающихся. Методы, используемые в настоящее время при обучении, становятся все более комбинированными, методики и технологии – более разнообразными. Учитывая острую необходимость у студентов неязыковых вузов – будущих специалистов-переводческой компетенции, наряду с компетенциями устного и письменного общения, а также чтения (в социально-бытовой и профессиональной сфере), представляется необходимым разрабатывать соответствующие пособия на базе современных технологий, которые позволят студентам в процессе самостоятельной работы под системным руководством преподавателя освоить главные приемы перевода. Проведенный в работе анализ позволяет заключить, что переводной метод еще далеко не изжил себя и в сочетании с современными технологиями и методиками он может использоваться, в первую очередь, для формирования основ переводческой компетенции, причем и во внеаудиторное время. Кроме того, метод перевода является эффективным при организации самостоятельной работы студентов, способствует более глубокому овладению ими языковым кодом. В этой связи он может

стать важным дополнением к коммуникативному методу в процессе формирования иноязычной коммуникации будущего специалиста.

СПИСОК ЛИТЕРАТУРЫ

1. Richards, Jack C. Beyond Methods / Jack C. Richards // The Language Teaching Matrix / Jack C. Richards. – Cambridge : CUP, 1999. – P. 35–49.

2. Brown, Douglas. Principles of Language Learning and Teaching / Douglas Brown / – Pearson ESL, 2006. – P. 410.

3. Kumaravadivelu, B. Toward a Postmethod Pedagogy / B. Kumaravadivelu // TESOL QUARTELY. – 2001. – 35. – P. 537–560.

4. Bell, David. Method and Postmethod: Are They Really So Incompatible? / David Bell // TESOL QUARTERLY. – 2003. – 37: 2. – P. 325–336.

5. Bell, David. Do Teachers Think that Methods Are Dead? / David Bell // ELT Journal. – 2007. – 61 (2). – P. 135–143.

6. Иностранный язык: типовая учеб. программа для высш. учеб. заведений / сост. Л.В. Хведченя, И.М. Андреасян, О.И. Васючкова. – Минск : РИВШ, 2008. – 32 с.

7. Кожевникова, Е.В. Роль родного языка в обучении иностранному / Е.В. Кожевникова, Н.В. Родионова // Перевод и метод параллельных текстов. – Саратовский гос. ун-т им. Н.Г. Чернышевского. [Электронный ресурс] – Режим доступа: www.sgu.ru/files/nodes/13579/Kozev.doc. – Дата доступа: 1.03. 2011.

8. Фридзон, А.К. Организационно-педагогические условия формирования готовности будущих инженеров к использованию иностранного языка в профессиональной деятельности : дис. ... канд. пед. наук: 13.00.08 / А.К. Фридзон. – Калуга, 2005. – 204 л. [Электронный ресурс] Содержимое электронного каталога российских диссертаций. – Режим доступа: http://disserr.ru/contents/118397.html. – Дата доступа: 22.02.11.

9. Изучаем английский язык с помощью конкретных методик [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.oksanaenglish.ru/articles/32.html. – Дата доступа: 18.02.11.

10. Vermes, Albert. Translation in Foreign Language Teaching: A Brief Overview of Pros and Cons / Albert Vermes // Eger Journal of English Studies. – 2010. – X. – P. 83–93.

Leshchova L.M. **Interactive Computer-Mediated Technique for Translation Competence Fundamentals Formation**

The major methodological paradigms in teaching a foreign language are analyzed. It is stressed that the method of teaching should correlate with its goal. The author argues that the domineering communicative method in our days almost completely undeservedly and prematurely forced out the traditional translation method especially in teaching non-linguistic students. Some unique features of translation method valuable in forming professional foreign language competence of a modern specialist are considered. A conception of a computer-mediated interactive textbook designed for independent study to form fundamentals of translation competence in non-linguistic university students is suggested.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 11.04.2011

УДК 808.26 – 08 + 882.6 – 08(075)

І.А. Бароўская

ВОБРАЗНА-СТЫЛЁВЫЯ ПОШУКІ БЕЛАРУСКАЙ ПЕСЕННАЙ ЛІРЫКІ

На шырокім фактычным матэрыяле (М. Башлакоў, У. Пецюкевіч, Л. Дранько-Майсюк) у артыкуле аналізуецца працэс творчага пошуку сучаснай беларускай песеннай лірыкі, вынікам якога сталі новыя сродкі і прыёмы вобразнага выяўлення. Заканамерным можна лічыць з'яўленне араторый, кантат, песенных альбомаў, музычных казак, што сведчыць аб якасных зменах у традыцыйных формах класічнай песні.

На дадзеным этапе беларуская прафесійная песенная лірыка знаходзіцца ў пэўным творчым пошуку і, безумоўна, мае велізарныя поспехі, бо беларуская паэзія нараджалася з песні (невыпадкова ў XIX – пачатку XX ст. амаль усе паэты называлі сябе песнярамі, музыкамі, а ў загалоўках паэтычных зборнікаў найчасцей прысутнічалі слова *песня* або назвы музычных інструментаў). Песенныя традыцыі былі вызначальнымі ў развіцці нацыянальнай паэзіі ў даваенны перыяд і, асабліва, у час Вялікай Айчыннай вайны. Да формы песні звярталіся практычна ўсе вядучыя беларускія паэты канца XX ст. Песенная лірыка – адметная састаўная частка нацыянальнай культуры нашага народа.

Празмерная эксплуатацыя пэўных вобразаў, тэм, моўна-выяўленчых сродкаў нараджает несвядомыя і свядомыя паўтораы, што стварае ілюзію другаснасці, пераймання і прыводзіць ў выніку – згубу аўдыторыі. Адчуўшы гэта, паэты вымушаны шукаць новыя сродкі і прыёмы вобразнага выяўлення. Найбольш перспектыўным трэба адзначыць стварэнне пэўных цыклаў песняў, аб'яднаных адзінай задумай. Цыкл твораў, прысвечаных адзінай тэме, вытрыманых у адзіным стылі, значна ўзмацняе агульнае гучанне і дазваляе раскрыць задуму і ідэю аўтараў. З'яўленне араторый, кантатаў, песенных альбомаў, музычных казак сведчыць аб якасных зменах у традыцыйных формах класічнай песні.

Мэтай нашага артыкула выступае аналіз, вызначэнне шляхоў пошуку новага ў стылі, формах і вобразах беларускай песеннай лірыкі.

Вакальна-інструментальным паэтычным творам (або цыклам вершаваных твораў) узнёсла-ўрачыстага гучання з'яўляецца *кантата* (ад лацінскага *canto* 'спяваю') [1, с. 152]. У склад выканаўцаў уваходзяць спевакі-салісты, хор і сімфанічны аркестр. Асобныя часткі кантаты аб'ядноўваюцца агульнай тэмай, зместам, сюжэтам. У гісторыі беларускага музычна-песеннага мастацтва былі некаторыя спробы стварэння кантат. Так, у гады Вялікай Айчыннай вайны да кантаты, асноўнай тэмай якой была тэма вайны, вялікай народнай бітвы, гераізм і мужнасць савецкіх людзей на франтах і ў тыле, нянавісць да фашыстаў, звярталіся кампазітары розных узростаў і нацыянальнасцей былога Савецкага Саюза. Так, беларускі кампазітар А. Багатыроў сваімі творамі ўнёс значны ўклад у развіццё гэтага жанру. У 1941–1942 гадах ён стварыў кантату «Беларускім партызанам», паэтычны тэкст якога быў напісаны славутым Янкам Купалам пад Масквой у верасні 1941 года. Словы імкліва распаўсюджваліся па ўсёй тэрыторыі Беларусі, перадаваліся з рук у рукі, расклейваліся лістоўкамі, друкаваліся ў партызанскіх газетах. Паасобныя інтанацыйныя абароты набліжаюць кантату да традыцыйных беларускіх народных, асабліва рэкруцкіх, песень. Акрамя А. Багатырова, кантаты на творы Я. Купалы стварылі Р. Пукст і І. Лучанок («Курган»).

Асобнае месца кантата займае ў творчасці Міхася Башлакова. Дзве кантаты на вершы паэта выконвае хор Белдзяржтэлерадыё пад кіраўніцтвам В. Роўды. Музыку да іх склаў Генадзь Ермачэнкаў. У першую кантату пад назвай «Дні залатыя» ўвайшло 7 частак: «Нібы сон», «Музыка дажджу», «Вяселле», «Не знікай з небасхілу майго», «Адзінокай свечкай стыне», «Прыцярушыў сняжок», «Дні мае залатыя». Трагічнай ўспрымаецца гучанне кантаты «Радзіма надзей і трывог», чатыры часткі якой («Вандроўнік», «Крыжы-абярэгі», «Птушкі белыя», «Я прайду па Палессі») паказваюць пошукі лірычным героем сваёй Радзімы, птушкі якой пачарнелі, крыжы-абярэгі не ратуюць:

Я прайду на Палессі,
Як песня...
Застануся я
Ў сэрцах людскіх...
Тут увесь я,
Увесь я
У зіхценні
Вячэрняй ракі...

Пад усхліпы
Чарнобыльскіх ветраў,
Пад усплёскі
Атручаных вод
Я паплачу
Ў цішы гэтых нетраў
Па табе,
Па табе,
Мой народ...

І ў асветленых поўняй
Дубровах,
Дзе надрыўна
Крычаць жураўлі,
Я пакіну
Апошняе слова
На апошняй
Славянскай зямлі...

Божа светлы,
Як мала прапета...
А душа
Паплыла, як лісток...,
Ірванецца,
Падхоплены ветрам,
Мой апошні Палескі радок. («Я прайду па Палессі») [2, с. 80].

Не менш трагічна-журботна гучыць кантата Уладзіміра Пецюкевіча «Дарога-сцяжына матулі і сына» (музыка Дзмітрыя Даўгалёва) [3, с. 21]. Паэт сцвярджае, што замест песняў з галубінаю пяшчотай павінна прыйсці музыка нябесная, што кліча да палёту. А словы *з перапёлчынай смагай* павінны саступіць *гукам перуновым.* Уся кантата аўтара ўвасоблена ў лепшых класічных традыцыях. Так, даволі складаны

па задуме і канструкцыі твор «Матчына бласлаўленне» вытрыманы ў фальклорным стылі (паўторы, звароты, паралелізмы):

Ты – уцеха мая і журбота мая,
Мілы клопат ад ранку да ранку,
Я малюся штодня, каб дарога твая
Асвяцілася Божай заранкай.

Бласлаўляю цябе, бласлаўляю цябе
На шчаслівую долю, сыночак,
Ты расці, як вярба, будзь здароў, як вада,
І прыгожы, як сінь-васілёчак! [3, с. 22].

Народныя традыцыі абумовілі паэтыку большасці песняў, што ўвайшлі ў цыкл. Гэта заўважана ў зваротах да месяца (*Месяц мой спагадны, месяц мой лагодны, / Як табе я рады ў старане бязроднай!*), язміну (*А тут яшчэ – ах, чарадзей! – / Язмін цвіце, язмін цвіце*), матулі (*Да цябе вяртаюся я марай, / У лагодны твой, матуля, спеў*), сына (*Наказала маці сыну: / Не забудзь, мой сын, сцяжыны*). Разам з тым мы маем справу не з простай фальклорнай кантамінацыяй, а адраджэннем класічных традыцый у новых умовах жыцця.

Яшчэ ў больш яркай ступені праявіліся падобныя пошукі ў араторыі Уладзіміра Пецюкевіча «Зорка Палын» (музыка Дзмітрыя Даўгалёва):

Тут шуміць, гудзе Курапацкі бор,
Карканне варон, смутак і жуда,
Аняменне душ, пацямненне зор…
Зоркаю Палын узышла Бяда [3, с. 14].

У апошнія гады многія пісьменнікі выкарыстоўвалі алюзіі з «Апакаліпсіса», беларускі паэт таксама не абыходзіць такую форму ўвасаблення:

Узняўся белы птах з палыну горкага,
Святло запальвае святым крылом.
Няўжо ды збудзецца мой сон вясёлкавы –
Спаўзе халодны змрок у буралом? («Узняўся белы птах») [3, с. 12].

Белы птах узнімаецца над усёй краінай, дзе лунае дух волатаў-асілкаў, пад велічнымі курганамі спяць нашы славутыя продкі, што дазваляе паэту павесці гаворку пра традыцыі і перспектывы бытавання нацыі. Паэт нават свядома ідзе на выкарыстанне алюзіі і ў песні «Шляхам палыновым» [3, с. 13], амаль літаральна перафразуе славуты зварот бессмяротнага «А хто там ідзе?»: *А хто такі там ідзе ў немалой грамадзе..?* Як і ў Купалы, улюбёныя вобразы магутных курганоў становяцца помнікамі на шляху народа ў будучыню, бо падобныя да званоў, якімі трэба ўзрушыць неба: *Курганы, курганы, курганы… / Насыпае іх сёння Чарнобыль* («Курганы») [3, с. 20]. Аўтар больш не чуе галасоў птушак:

Перастала зязюля лічыць,
Сціхла сіваваронка, не крача («Курганы») [3, с. 20],
Знямелі салаўі, знямела ціша ў гаі,
Зязюльчына «ку-ку» не чуецца ў бары,
На возеры сівым адны вятры гуляюць,
І вёслы – напалам, і човен – дагары… («Знямелі салаўі») [3, с. 12].

Паэт просіць прабачэння ў роднай зямлі за ўсіх людзей, што стварылі Чарнобыль, пыл якога зрабіў чорнымі палі, сады, буслоў і нават людзей:

Зямля пакутная, душа балесная,
Даруй, што я цябе не засцярог,
Ды, можа, крышачку сагрэю песняю,

Хоць і яна з тугі тваіх дарог. («Даруй, зямля мая») [3, с. 15].

На гэтую зямлю не вернецца азёрнай чайкай-чаіцай легендарная Яраслаўна («Мая князёўна»):

Плач Яраслаўны над зямлёй
Калышуць хвалі слынныя.
Не зводзься горкаю тугой,
Мая князёўна мілая [3, с. 16].

У творах падобнай накіраванасці арганічна гучаць нават пафасна-ўзнёслыя выразы. Надзвычай арганічна ўспрымаюцца звароты да вышэйшых сілаў і асабліва Малітва – форма, якая з часоў Купалы амаль не распрацоўвалася выяўленчымі сродкамі песеннай лірыкі («Споведзь збуджанага», «Божа, малітву паслухай»):

Божа мой, даруй нам, кволым,
Сілы дай расправіць плечы
І вярні, вярні нам голас
Векавечны, чалавечы.
Амін… («Малітва») [3, с. 19].

Зусім у іншай, нават антанімічнай танальнасці вытрыманы цыклы песень для дзяцей. Паэты-песеннікі доказна паказалі, што тут чакаюцца сапраўдныя знаходкі і адкрыцці. У. Пецюкевіч разам з кампазітарам Д. Даўгалёвым стварылі дзіцячую музычную казку «Птушыны кірмаш», якая ўяўляе сабой сольныя песні Жаўрука, Вераб'я, Сарокі, Вароны, Глушца, Дзятла і іншых птушак. У «Песні-Уступе» і «Песні-Фінале» збіраюцца і спяваюць усе ўдзельнікі кірмашу:

Тук-тук-тук, ча-ча-ча, чык-чырык, курлы,
Дзінь-дзінь, глю, чуф-чуф, кар,
Добры дзень, сябры!

Вас вітае, сонцам свеціць,
Непаўторны наш,
Самы лепшы ва ўсім свеце
Песенны кірмаш. («Песня-Уступ») [3, с. 117].

Паэт паказаў сябе майстрам перадачы птушыных спеваў, у якіх прасочваюцца ўяўленні і паводзіны галоўных герояў. Яго ўлюбёны Жаўрук спявае двойчы, бо яго срэбны галасочак, падобны званочку, з'яўляецца своеасаблівым камертонам да ўсёй гукавой палітры канцэрта-выставы:

Палі жытнёвыя люблю,
Лугі, азёры, рэкі.
Вясновы гімн зямлі пяю,
Душою з ёй навекі. («Другая песня Жаўрука») [3, с. 126].

Цікава ўспрымаецца песня Вераб'я, які вельмі хоча паказаць сябе. Сарока (*Сіньярыта Сарочыні*) і Індык (*Сіньёр я Індычыні*) з'яўляюцца на гэтым балі гасцямі: Індык нагадвае Паўліна, у якога настолькі прыгожы рознакаляровы хвост, наколькі брыдкі голас, якім можна толькі напалохаць. Індык уяўляе сябе каралём – і такая неадпаведнасць памкненняў і здольнасцяў выклікае іранічную ўсмешку:

Лясныя птахі, глю-глю-глю!
Чаго маўчком пасталі?
Спявайце мне, як каралю,
Я ацаню ваш талент. («Песня Індыка») [3, с. 122].

Не менш парадыйным вобразам выступае і Глушэц, які запрашае ўсіх, хто хоча славы, у свой хор:

Чуф-чуфы, чуфа-чуфом –
Тут няма сакрэту:
Хто мяне заве глушцом –
Сам глушэц адпеты («Песня Глушца») [3, с. 123].

Песні Жураўля ўносяць у гул аркестра адпаведную мінорнасць і лёгкі сум, якія надаюць музыцы словаў разнастайнасць і поліфанічнасць.

Падобныя вобразы ствараюць неабходную атмасферу весялосці, карнавальнасці, нават гратэску, нібы на балі цацак у славутага Эрнста Гофмана «Шчаўкунок, ці Мышыны Кароль».

Незвычайнай і цікавай з'явай усёй беларускай песеннай спадчыны выступіла «Цацачная крама» Л. Дранько-Майсюка (музыка Зміцера Вайцюшкевіча). Аўтар упэўнены, што «весялосць – нацыянальнае багацце беларусаў, таму ў «Цацачнай краме» шмат смеху, жартаў, дасціпнасці, радаснага настрою, салёных слоўцаў, народных выразаў, часам – горкай іроніі» [4, с. 4]. Вытокі падобнага дзейства можна ўбачыць у батлейцы, у скамарошніцтве, у традыцыйных фэстах-кірмашах са славутым выпускніком смаргонскай акадэміі вучоным мядзведзем, што працуе за цэлы цырк. Бо з даўніх часоў беларус з дзяцінства звык да таго, што з ім нараўне можа гаварыць конік, зайчык, ліска, нават воўк. Для дзіцяці – гэта своеасаблівы працяг гульні, казкі, сваёй, роднай. Менавіта таму ва «Уступнай песеньцы Гаспадара» паэт спрабуе даць ключ для спасціжэння адметнага цыкла, які, як падкрэсліваецца, перш за ўсё ўяўляецца забаўкай:

Цацкі ж не абы-якія;
Не гліняныя – пустыя;
Не драўляныя – глухія…
Цацкі ўсе як ёсьць – жывыя! [4, с. 12].

Цацкі закліканы ўздзейнічаць эмацыянальна, абуджаць адпаведныя пачуцці і разлічаны ў першую чаргу на знешняе ўздзеянне. Цыкл песняў дасягае сваёй мэты – слухач адразу трапляе ў сусвет чароўных гукаў, дзе дамінуе забаўна-ўсхваляваны маналог галоднага Ваўка, які, аказваецца, зусім не шкодны, не бандыт, нават не дробны хуліган, а проста – галоднае Божае стварэнне, якое просіць даслаць ежы. Воўк даволі сучасны: ён ведае, што існуе гуманітарная дапамога: *Шліце ежу мне з-за мора, / Каб не спруцянеў!* Поруч з галодным, крыху наіўным Воўкам жыве разумная Варона, баязлівы Барсук, памяркоўны Мядзведзь. Пра дзяцінства апошняга паэт апавядаў у песеньцы «Два мядзведзікі» (гэты ўлюбёнец дзятвы палез спаць на сасну, у той час як яго разумнейшы брацік спаў у пасцелі і бачыў у сне салодкую маліну). Згадае дапытлівы маленькі слухач і працавітага Каня, і задаваку Пеўня, і злога Сабаку, і незалежнага Зубра. Па сутнасці, дзіця трапляе ў карагод з гэтымі добра вядомымі па казках героямі, а таму такімі пазнавальнымі, блізкімі, роднымі. Падчас яны падсвечваюцца новымі гранямі, рысамі характару. Звяры не вінаваты, што трапляюць у «чалавечыя» ўмовы. Казёл скача на стол, бо яго не пускаюць за стол, Мядзведзь гатоў прадацца ў любы цырк за лыжку мёду. Маленькі слухач з задавальненнем паслухае казачку, у якой дакладнае слова з умела падабранай музыкай мае выразныя дыдактычныя ўстаноўкі. Цыкл значна ўзбагачае дзіцячую песенную лірыку на якасным узроўні.

Разам з тым у той жа «Уступнай песеньцы Гаспадара» поруч з заклікам таргавацца ёсць намёк, што забаву цацкі даюць і дарослым, якім варта купіць іх не толькі для дзяцей, але і для саміх сябе. У кожнага з цацачных герояў вылучана адна, дамінуючая рыса характару, што дазваляе творы аднесці да алегарычна-ўмоўнага жанру (байкі і прытчы). Невыпадкова заключная «Песня Гаспадара» сцвярджае сілу ўздзеяння цацкі на чалавека:

Каб вы маглі адчуць
У цацак столькі сілы,
Што ад калыскі йдуць
За намі да магілы! [4, с. 120].

А яе выразны алегарызм падкрэслівае прыпеў:

Людзі, людзі дарагія,
І малыя, і старыя,
Вы нібы, як цацкі тыя
Завадныя і жывыя [4, с. 121].

Тады зусім па-іншаму глядзіш на насельнікаў крамы. І ўжо не дзіцячыя асацыяцыі ўзнікаюць у свядомасці, а цацачная крама вырастае да межаў дарослага жыцця, у якім кожны робіць свой выбар. Адразу ўяўляецца вобраз сучаснага мужчыны, які моцна абкружаны жаночай увагай, губляецца як Мужчына і становіцца падобным да задаволенага Пеўня, што не здольны на сапраўднае Каханне, а ўсе адносіны зводзіць да звычайнай фізіялогіі: *Я тапчу курэй усмак / І ня знаю меры*, ці рэфрэн *Мудрасць простая мая: Будуць куры – буду й я!* [4, с. 36]. Перад дарослым чытачом паўстае шэрае будзённае жыццё, дзе кожны выбірае свой шлях і навек застаецца Варонай, якая здольная адмовіцца ад розуму, калі ёй гэта патрэбна, злым Сабакам, што брэша на ўсіх, *гуляшчай* Кошкай, якая заўсёды ліжа твар свайму гаспадару, а гаспадыні – *дык тое, чым садзіцца.* Ці ўсё ж сказаць усяму «Не!» і жыць, як незалежны Зубр, памяркоўны Мядзведзь? Каб паказаць пэўныя аналогіі, аўтар нават свядома выкарыстоўвае алюзію на славутыя вобразы баек К. Крапівы. Няма адзінага прачытання «Цацачнай крамы», і гэта вельмі добра, бо кожны чытач (слухач) мае ўласны жыццёвы вопыт і выбар, таму знойдзе ў радках нешта сваё.

Вобразна-выяўленчая палітра песеннай лірыкі Л. Дранько-Майсюка абумоўлена адметнасцю тэматыкі твораў. Зразумела, што для песень, вытрыманых у рамантычна-ўзнёслай традыцыі, неабходны і адпаведны ўзнёслы настрой, які вымалёўваецца з дапамогай адпаведных лексем (*замак, прынц, ружа, лілея, Версаль, Парыж, крышталь, срэбра*). Па-майстэрску Л. Дранько-Майсюк стварае неабходную атмасферу суму, лёгкай журбы, прадчування трагедыі, дзеля чаго выкарыстоўваюцца амаль зрокавыя апісанні адпаведных з'яў прыроды (*дождж, туман, ноч*). Выразным кантрастам да рамантычна-ўзнёслай лексікі з'яўляецца выкарыстанне слоў нізкага стылю, падчас нават вульгарызмаў: *бздзік, бздура, прыдуркі, зусім дурны.* Як чалавек, які надзвычай тонка адчувае музыку, Л. Дранько-Майсюк выключную ўвагу надае гукавому афармленню кожнага радка і слова. Менавіта гукавыя паўторы пераўтвараюць мову ў злітнае цэлае і прымушаюць успрымаць іх як своеасаблівую рытмічную метафару [5, с. 156]. Найбольш яскравыя ўзоры – гукаперайманне «гаворкі» Ваўка, у прыпеве якога чуваць адно завыванне: *Я ня шкодны Воўк, / Я галодны воўк… / У-у-у*. Найбольшы стылістычны эфект гукаперайманне дае ў тым выпадку, калі гукавое збліжэнне слоў падкрэслівае іх вобразнасць, падмацоўвае змест фразы [6, с. 177]. Так, паўтор [а] часта заўважаецца з паўторам [у], [о], прычым паўторы галосных спалучаюцца з прыёмам анаматапеі, што дапамагае перадаць шырыню, працягласць гучання, падкрэсліць, выдзеліць асаблівыя, характэрныя рысы вобраза. Маналог Вароны прасякнуты варыяцыямі яе спецыфічнага «р» – гука рытмічнага і рэзкага, паўтор якога іншы раз выкарыстоўваецца для выразнай зніжанасці стылю, а побач з гукаперайманнем *кар-р-р!* стварае ў радку дакладны вобраз разумнай Вароны: *Добра ведаю я – кар-р-р! / Дзе рубель, а дзе даляр…. / Дзе гандляр, а дзе махляр… / Дзе таварыш, дзе спадар* [4, с. 24]. Такое выключна ўважлівае стаўленне не толькі да зместу, але і да гучання твораў у значнай ступені і тлумачыць цікавасць кампазітараў да песенных тэкстаў Л. Дранько-Майсюка. А таленавітая спроба спалучэння

нацыянальных і агульнаеўрапейскіх традыцый сведчыць аб тым, што на гэтым шляху аўтара чакаюць новыя поспехі.

Такім чынам, у заключэнні можна зрабіць высновы, што ў цэлым беларуская прафесійная песенная лірыка знаходзіцца ў творчым працэсе, у выніку якога адбываюцца зрухі ў стылі (нездарма яшчэ ў старажытнасці гаварылі *saepe stilum vertas iterum quae digna legi sunt scripturus* – часцей паварочвай стыль, калі хочаш напісаць нешта годнае для перачытвання), формах і вобразах. Вельмі хочацца, каб і надалей адбывалася развіццё і рабіліся новыя адкрыцці на глебе пашырэння цікавасці і прыцягнення да сябе ўвагі не толькі беларускамоўнага, але і замежнага слухача.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапаможнік / В. Рагойша. – Мінск : БелЭн., 2001. – 384 с.

2. Башлакоў, М. Матчыны грыбы перабіраю : Вершы / М. Башлакоў. – Мінск : Ураджай, 2000. – 86 с.

3. Пецюкевіч, У. Узняўся белы птах. Песні. Вершы. Балады. / У. Пецюкевіч. – Вільня, 2004. – 561 с.

4. Дранько-Майсюк, Л. Цацачная крама : кніжка для вялікіх і малых / Л. Дранько-Майсюк. – Минск : Медисонт, 2008. – 128 с.

5. Тынянов, Ю.Н. Проблемы стихотворного языка / Ю.Н. Тынянов. – М. : Советский писатель, 1965. – 304 с.

6. Голуб, И.Б. Стилистика русского языка : учебное пособие / И.Б. Голуб. – М. : Рольф : Айрис-пресс, 1997. – 448 с.

Borovskaya I.A. Figurative-Stylistic Searches of Belarusian Lyrics of a Song

On wide actual material (M. Boshlakov, V. Petjukevich, L. Dranko-Majsjuk) the author analyses the process of creative search of Belarusian song lyrics at the present stage as the result of which the poets have to look for new means and ways of figurative receptions. It is natural to consider the occurrence of oratorios, cantatas, an album of songs, musical fairy tales that testifies qualitative changes in traditional forms of a classical song.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 19.06.2010

УДК 398

І.А. Швед

ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ДАСЛЕДАВАННЯ КОЛЕРАВЫХ СІМВАЛАЎ МІФАПАЭТЫЧНАГА МЫСЛЕННЯ БЕЛАРУСАЎ

Артыкул прысвечаны вызначэнню тэарэтыка-метадалагічных асноў сістэмнага вывучэння колеравых сімвалаў міфапаэтычнага мыслення беларусаў. Глыбокае сістэмнае даследаванне колеравых сімвалаў магчыма толькі ў межах адпаведнага кода; пры гэтым яго гісторыка-генетычнае вывучэнне павінна дапаўняцца функцыянальна-семантычным. Сістэмны аналіз кода прадугледжвае разгляд шырокай сінтагматычнай спалучальнасці колеравых сімвалаў і выяўленне іх парадыгматычных сувязяў. Даследаванне павінна праводзіцца на матэрыяле сістэмы традыцыйных жанраў фальклору і формаў беларускай культуры з выхадам на славянскі культурны субстрат, з улікам дасягненняў розных дысцыплін.

Уводзіны

Колеравыя сімвалы, утвараючы адмысловы культурны код, выступаюць у якасці праграм тэкстаў і сюжэтаў (пераважна міфалагічных у сваёй аснове), выконваюць ролю «семіятычнага кандэнсатара» (Ю. Лотман). Яны, як і іншыя архаічныя сімвалы, назапашваюць, арганізуюць, генерыруюць, трансліруюць (дакладней – узнаўляюць) калектыўны вопыт у дыяхранічным і сінхранічным асяродку традыцыйнай культуры [1]. Важнай з метадалагічнага пункту погляду з'яўляецца перспектыўная тэндэнцыя гуманітарных навук трактаваць вербальны сімвал, паэтычны вобраз, код ва ўзаемасувязі з працэсамі чалавечага мыслення, пазнання, працы свядомасці, з канцэптуальнымі сістэмамі, светапоглядамі канстантамі. Пры вызначэнні генезісу колеравага кода міфапаэтычнага мыслення беларусаў зыходнымі з'яўляюцца палажэнні, выказаныя такімі рознымі ў сваіх даследчыцкіх і практычных установах вучонымі, як Р. Прайс, В. Вунт, Ф. Буслаеў, А. Патабня, А. Весялоўскі, В. Фрэйдэнберг, якія ў этнаграфіі, этналогіі, фальклярыстыцы, лінгвістыцы прыйшлі да агульных высноў пра сутыкненне паэзіі ў яе «перадгісторыі» з пачаткамі мовы і міфа, дзе слова мае сакральны статус, анталагічную важкасць і выступае не сімвалам прадмета, а яго рэальнай часткай [2, с. 181–182]. Яно з'яўляецца мастацкім вобразам, выкліканым жывым пачуццём, якое «прырода і жыццё ў чалавеку ўзбудзілі» [3, с. 20].

У распрацоўцы пытанняў семантыкі і функцыянавання элементаў колеравага кода істотнае значэнне мае тэорыя кодаў, распрацаваная К. Леві-Стросам. Вучоны звярнуў увагу на такія важныя заканамернасці міфапаэтычнага мыслення, як дэдуцыраванне (эмпірычная і «трансцэндэнтальная дэдукцыя», якая ўзнікае праз пасрэдніцтва міфалагічнага поля), а таксама выкарыстанне аналогій, і ўказаў на лішак абазначальнікаў у адносінах да таго, што абазначаецца. Апошняе прыводзіць да размеркавання міфалагічных уяўленняў па разнастайных узроўнях і кодах, якія ўтвараюць своеасаблівую «рашотку» [4, с. 13, 17]. Прычым коды ў разуменні Леві-Строса – сістэмы функцый, якімі кожны міф надзяляе свае інварыянтныя ўласцівасці, – адрозніваюцца між сабой субстанцыяй плана зместу (касмалагічны код, харчовы, аграрны і інш.). Прыкметы, паводле якіх дыферэнцыруюцца коды, як адзначае А. Байбурын, «адносяцца да сферы рэальнасці, што «адлюстроўваецца», апісваецца ці выкарыстоўваецца тэкстамі» [5, с. 242] (адрозніваюцца коды могуць, акрамя субстанцыі плана зместу, субстанцыяй плана выяўлення, формай плана выяўлення, формай плана зместу [5]).

У дачыненні да абраду [5] і фальклору *паводле субстанцыі плана зместу* вылучаюцца такія коды, як колеравы, лікавы, прыродна-ландшафтны, дэндралагічны, саматычны, метэаралагічны, зааморфны, антрапаморфны, прадметна-рэчавы, касмалагічна-астранамічны і пад. Яны абумоўліваюць пераемнасць, цэласнасць фальклору, культурнай традыцыі ўвогуле, вызначаюць нацыянальныя і арэальныя межы культуры, спецыфіку яе светапоглядна мадэлі, забяспечваюць у ёй наяўнасць агульнай «мовы» (у яе семіятычным асэнсаванні), устойлівых каналаў зносін, а таксама магчымасць разумення і пазнання чалавекам свету, іншых людзей і сябе. І гэтым уздзейнічаюць на стан сучаснай цывілізацыі. Як слушна адзначае І. Чарота, «канчаткова і надзейна акрэсліць спецыфічныя беларускія ідэйна-вобразныя ўстоі можна будзе толькі з часам, у выніку сур'ёзных рознабаковых даследаванняў. Але подступы да іх – бясспрэчна існуючых – неабходна шукаць ужо зараз» [6, с. 104].

Даследаванне колераваў сімволікі традыцыйнай духоўнай культуры павінна абапірацца на тэорыю сімвала, распрацаваную Ю. Лотманам, які слушна ўказваў, што сімвал ніколі не належыць якому-небудзь аднаму сінхроннаму зрэзу культуры – ён заўсёды пранізвае гэты зрэз па вертыкалі, прыходзячы з мінулага і адыходзячы ў будучае; памяць сімвала заўсёды старажытнейшая за памяць яго несімвалічнага тэкставага акружэння. Адным з вызначальных пры даследаванні семантычных сувязей колеравых сімвалаў, прадстаўленых у абрадавых комплексах і вуснай паэтычнай творчасці, з'яўляецца палажэнне, выказанае Ю. Лотманам адносна функцыянавання колеравых і геаметрычных (кола, крыж, паралельныя лініі, трохкутнік) сімвалаў у вуснай культуры. Вучоны справядліва настойваў на істотным адрозненні гэтых знакаў ад іерогліфаў ці літар, бо апошнія маюць вызначаную семантыку і набываюць сэнс толькі ў сінтагматычным радзе, утвараючы ланцугі знакаў. Першыя ж маюць значэнне размытае, часта ўнутрана супярэчлівае, набываюць сэнс у адносінах да рытуалу і вусных тэкстаў, мнеманічнымі знакамі якіх з'яўляюцца. Адметная іх прырода раскрываецца пры супастаўленні фразы (ланцуга моўных сімвалаў) і арнаменту (ланцуга магіка-мнеманічных і рытуальных сімвалаў) [1, с. 351–352].

Гэтыя асаблівасці функцыянавання сімвалаў у традыцыйнай духоўнай культуры вымагаюць пры іх даследаванні рэалізацыі парадыгматычнага падыходу, у аснове якога знаходзіцца трактоўка культуры як іерархічна арганізаванай сістэмы кодаў, г.зн. другасных складаных семіятычных сістэм, якія выкарыстоўваюць розныя фармальныя і матэрыяльныя сродкі для перадачы пэўнага зместу. Гэты змест зводзіцца ў цэлым да міфапаэтычнай карціны свету. Акружэнне чалавека (у першую чаргу прадметна-атрыбутыўнае, якое дадзена чалавеку ў бальшыні выпадкаў у колеравым успрыманні і якое выступае як «апрадмечаны светапогляд») з'яўляецца складанай знакавай сістэмай. Яе колеравыя элементы і ўтвараюць адзін з самых архаічных кодаў – колеравы код.

Традыцыя ўпарадкавання аб'ектаў навакольнага свету паводле іх колераў, як сведчаць шматлікія даследаванні [7; 8], узыходзіць да глыбока архаічнага мыслення. Разам з паняційнымі абгуртаваннямі класіфікацыі і катэгарызацыі, мелі месца і слабыя ўзаемадзеянні плана выражэння і плана зместу. Мысленне архаічнага чалавека, якое патрабавала ўпарадкавання і асэнсавання свету, але якое яшчэ не было ўзброена паняційнымі формамі, усталёўвала і замацоўвала гэтыя слабыя сувязі ў колерава-семантычных класіфікацыях. Іншымі словамі, колеравыя ўніверсаліі аб'ядноўваюць аб'екты, якія маюць для суб'екта падобны эмацыйны тон, і дапамагаюць упарадкаваць іх, пабудаваць простыя абагульненні і вылучыць пэўныя заканамернасці, што дазваляе арыентавацца ў свеце. У колеры ў «знятым» выглядзе выяўляюцца адносіны чалавека да з'яў навакольнай і ўласнай прыроды. У колеравых канцэптах заключаны каштоўнасныя архетыпавыя (глыбінна значныя, звязаныя з выжываннем віду

і працягам роду) характарыстыкі чалавека, прыроды і грамадства. У сувязі з гэтым адзначаецца, што семантыка колеравых універсалій фіксавалася сусветнай культурай для адэкватнай адаптацыі і ўзнаўлення чалавека на ўзроўні генетычна і сацыяльна абумоўленай мэтазгоднасці [8, с. 21–22]. Папярэдні разгляд месца і ролі колеру ў культуры дазваляе заключыць, што колер выступае ў якасці змястоўнага першаэлемента культуры, пры дапамозе якога характарызуюцца людзі, жывёлы, расліны, міфалагічныя істоты, сістэматызуюцца прадметы, а таксама сацыяльныя ўстанаўленні і маральна-этычныя паняцці. Найбольш поўна семантыка і сімволіка архаічных колеравых сімвалаў адлюстравана ў фальклоры.

Вывучэнне паасобных колеравых сімвалаў па-за рамкамі кода, у межах якога яны функцыянуюць, і часта па-за кантэкстам традыцыйнай культуры не дазваляла ўсебакова раскрыць сутнасць сімвалаў міфапаэтычнага мыслення. Усведамленне таго, што ў аснове функцыянавання розных складнікаў традыцыйнай культуры знаходзіцца агульная змястоўная база, якая можа быць зведзена да комплексу даволі ўстойлівых уяўленняў пра светабудову і месца чалавека ў ёй, непасрэдна звязана з перспектыўнай тэндэнцыяй да збліжэння асобных народазнаўчых і іншых навук. Бясспрэчна, на цяперашні момант патрэбна інтэграцыя набыткаў развіцця розных навук, у прыватнасці фалькларыстыкі, кагнітыўнай антрапалогіі, культуралогіі, філасофіі, этналінгвістыкі, этнапсіхалогіі, палеаэтналогіі, мастацтвазнаўства і інш. Таму мы павінны не пагадзіцца з ідэяй, выказанай У. Анікіным адносна вывучэння з’яў фальклору. Яно, на думку вядомага рускага фалькларыста, не прадугледжвае «выхад за межы філалогіі і ўваходжанне ў вобласць такіх сумежных з фалькларыстыкай навук, як этнаграфія, народазнаўства…» [9, с. 5]. Культуралагічны катэгарыяльны апарат, велізарны фактычны матэрыял, навуковыя ідэі, выпрацаваныя прадстаўнікамі названых і блізкіх да іх дысцыплін, даюць магчымасць распрацоўкі новых, сінтэзуючых ідэй і метадаў, падказваюць крытэрыі інтэрпрэтацыі розных з’яў культуры, дапамагаюць адэкватна вызначыць тыя змястоўныя, структурныя, псіхалагічныя элементы сімвалатварэння і функцыянавання сімвалаў і кодаў, якія дагэтуль асобна не вылучаліся або не разглядаліся ўвогуле. Толькі акрэсленая інтэграцыя дае магчымасць асэнсаваць фальклорныя творы як сінкрэтычныя ўтварэнні, пераадолець непаслядоўнасць ужывання адпаведнай тэрміналогіі, а таксама ўсебакова даследаваць навуковыя праблемы, звязаныя са старажытным светапоглядам, семіятызацыяй рэчаіснасці, функцыянаваннем фальклорных кодаў, у прыватнасці колеравага кода, праз пасрэдніцтва якога мадэліруюцца складнікі традыцыйнай міфапаэтычнай карціны свету. Вынікам уліку сістэмнай прыроды фальклорных з’яў выступае ўсведамленне неабходнасці інтэгратыўнага бачання, цэласнага аналізу такога феномена фальклору і традыцыйнай культуры, як колеравы код.

Перанос акцэнтаў з эмпірыка-канстатуючага апісання фальклорнай вобразнасці, разгляду асобных сімвалаў беларускага фальклору ў рамках літаратурнай эстэтыкі на комплекснае даследаванне традыцыйнай карціны свету і сродкаў яе знакавай фіксацыі, у тым ліку колеравых сімвалаў, актуалізуе эўрыстычную каштоўнасць сістэмнага падыходу. У дачыненні да вывучэння колеравага кода такі падыход разумеецца як ідэнтыфікацыя неабходнага і дастатковага комплексу характарыстык (якія ў сукупнасці вызначаюць існаванне колеравага кода як цэласнага феномена) і рэканструкцыя працэсу і вынікаў семантызацыі колераў. Даследаванне генезісу і функцыянавання колеравага кода павінна грунтавацца на ўяўленні пра інтэгральнасць, самадастатковасць традыцыйнай культуры, сістэмную прыроду фальклорных з’яў, важную ролю не толькі (ці не столькі) утылітарных, але і сімвалічных каштоўнасцей (свет традыцыйнага фальклору – гэта свет сімвалаў, якія з’яўляюцца і стылістычнымі, і светапоглядамі катэгорыямі), выкарыстанне традыцыяй у семіятычных мэтах «мовы

рэальнасці», адзінства і агульнасць міфапаэтычнай семантыкі, дыяхранічнае «разгортванне» сімвала ў фальклорную форму, сэнс якой заўсёды адстае ад яе актуальнай рэалізацыі.

Сістэмны падыход вызначае неабходнасць даследавання колеравага кода міфапаэтычнага мыслення беларусаў у адпаведнасці з наступнымі прынцыпамі: вывучэнне не ізаляваных сімвалаў, а іх сукупнасці (акрэсленай сістэмы адносін), якая і ўтварае код, прычым цэласнасць тут – вызначальная ўласцівасць; сінтэз тэарэтычных (гісторыка-генетычных і функцыянальна-семантычных) уяўленняў пра колеравы код; вылучэнне фактараў, якія надаюць колераваму коду ўстойлівасць; акцэнт на сэнсе ўзаемасувязі складнікаў-сімвалаў. Паколькі колеравыя сімвалы – «вынік супрацоўніцтва» мастацкіх і немастацкіх утварэнняў у праекцыі істотных, стэрэатыпных уяўленняў пра колеры, навуковае апісанне гэтых сімвалаў прадугледжвае вызначэнне іх кагнітыўнага зместу, зварот да адметных канцэпцый карціны свету і мадэлі свету.

Карціна свету – гэта «ўніверсальныя» калектыўна набытыя вопыт-веды, вынік першаснай апрацоўкі інфармацыі ў сістэме «чалавек – свет», дынамічная канцэнтраваная сістэма панарамнага апісання (а не аналізу) свету з «уключаным» суб'ектам. У вышэйшай ступені касмалагічная і разам з тым антрапамарфічная і антрапацэнтрычная карціна свету характарызуецца рознай ступенню ўсвядомленасці яе фрагментаў, рознай ступенню іх адэкватнасці быццю і знаходзіць сваё сэнсавае канструяванне згодна з пэўнай логікай светаразумення ў мадэлі свету.

Мадэль свету – усеагульная шматузроўневая сістэма стэрэатыпаў, сімвалаў, кодаў, якія прадстаўляюць розныя фрагменты карціны свету (аб'екты, з'явы, падзеі і ўласцівыя ім прасторава-часавыя і якасна-колькасныя вымярэнні); рэпрэзентацыя (прасторава-часавая, якасная, колькасная, прычынная, этычная, персанажная), прынцып, структура карціны свету, усеагульная арганізацыя яе «карціннасці» (у якой элементы не зафіксаваны, а сувязі слаба вызначаны). Мадэль свету, з аднаго боку, сама стала вынікам асэнсавання свету чалавекам, а з другога, у аспекце анталагічных прынцыпаў, абстракцый, – з'явілася падмуркам фарміравання сімвалаў і кодаў фальклору, выступіла ўмовай інтэрпрэтацыі свету міфапаэтычным мысленнем, сродкам арганізацыі шырокага спектра парадыгмальнага разумення рэчаіснасці на аснове асобых пазнаваўчых аперацый.

Акрамя «карціны свету» і «мадэлі свету», фундаментальнымі паняццямі катэгарыяльнага апарату сістэмнага даследавання генезісу і функцыянавання колеравага кода беларускай традыцыйнай духоўнай культуры з'яўляюцца паняцці «код» і «сімвал».

Код – сістэма абазначэнняў для перадачы, апрацоўкі і захавання інфармацыі ў форме канцэптуальных утварэнняў, корпус аднатыпных знакаў, які мае сваю парадыгматыку і сінтагматыку. Кожны код вызначаецца ўласнай сістэмай рэлевантных прыкмет, якія выяўляюцца ў наборы і суадносінах адзінак гэтага кода. *Колеравы код* трактуецца намі як сродак традыцыйнага мадэліравання свету на аснове яго пазнання, ацэнкі і апісання праз колеравыя сімвалы, якія ўтвараюць сістэму парадыгматычных і сінтагматычных адносін. Колеравы код можа разглядацца як падкод атрыбутыўнага кода – кода якасцяў і прыкмет, у які ўваходзяць маркіраваныя міфапаэтычным мысленнем уласцівасці і здатнасці чалавека і жывёл (рысы фізічнага аблічча – колер валасоў, вачэй, лысы, голы і г.д.; звышнатуральныя ўласцівасці – дурное вока, абарачальнасць, яснабачанне і г.д.); лічбы і парадак (1, 2, 3, 4, 7, 9, 12, 40, 77 і г.д.; першы, другі, апошні, цотны, няцотны і г.д.); іншыя прыкметы, што ўтвараюць бінарныя апазіцыі тыпу «свой/чужы», «левы/правы», «верх/ніз», «мужчынскі/жаночы», «стары/малады», «сыры/вараны».

Фарміраванне і развіццё колеравага кода беларускага фальклору адбывалася на аснове славянскай архаічнай карціны свету. Разам з тым яго сімвалы неабходна разглядаць як сродкі знакавай фіксацыі фрагментаў карціны свету ў мадэлі свету. Вырашэнне замкнёнага ў «герменеўтычнае кола» тэзіса «цэлае дадзена ў частках, часткі пазнаюцца праз прызму цэлага» адкрываецца пры ўмове анталагічнай спалучальнасці, узаемнай скіраванасці карціны свету, мадэлі свету, кодаў, сімвалаў.

С*імвал* – сінтэтычны вобраз, які ў працэсе інтэлектуальна-мастацкага асваення рэчаіснасці, «апрадмечвання каштоўнасці» акумулюе глыбінныя сэнсы традыцыйнай духоўнай культуры, мадэлюючы вызначаныя феномены ў пачуццёва-канкрэтнай форме, выклікае ўстойлівыя асацыяцыі на падставе традыцыйных сэнсавых атаясамліванняў. *Вобраз* (міфапаэтычны) пры гэтым разумеецца як вынік і ідэальная форма пачуццёва-канкрэтнага, цэласнага, эмацыянальнага адлюстравання прадметаў і з'яў, мадыфікаванага ў адпаведнасці з законамі прадуцыравання пэўных міфа-фальклорных тэкстаў. Функцыянаванне вобраза як сімвала звязана з набыццём змястоўнай глыбіні, сэнсавай перспектывы, каштоўнасці, замацаваных традыцыяй.

Заключэнне

У заключэнне адзначым, што пры вырашэнні задач, звязаных з сістэмным аналізам колеравых сімвалаў беларускага фальклору, гісторыка-генетычнае даследаванне колеравага кода павінна дапаўняцца функцыянальна-семантычным. Прадуктыўным з'яўляецца выкарыстанне функцыянальна-семантычнага, структурна-тыпалагічнага і параўнальна-гістарычнага метадаў. Прымяненне функцыянальна-семантычнага метаду дасць магчымасць высветліць, што іменна ў генезісе колеравага кода абумоўлена пазафальклорнымі сувязямі і як гэтыя сувязі прадстаўлены ў ім, а таксама ўстанавіць месца колеравага кода ў беларускім фальклоры. Структурна-тыпалагічны метад дазволіць раскрыць механізмы ўпарадкавання семантычных сувязей колеравага сімвала, інтэрпрэтаваць колеравыя сімвалы беларускай духоўнай традыцыйнай культуры, прадставіўшы іх у межах цэласнага ўтварэння, якое функцыянуе разам з іншымі кодамі. Пры дапамозе параўнальна-гістарычнага метаду магчыма высветліць генезіс колеравага кода, вызначыць паралелі вывучаемай з'явы ў міжнацыянальных маштабах.

Перспектыва даследавання сімвалічнай «мовы колераў» звязана з усведамленнем цэласнасці традыцыйнай культуры. Мэтай даследаванняў, звязаных з колеравым кодам фальклору пэўных славянскіх традыцый, можа стаць аб'ёмная інтэгральная рэканструкцыя кодаў славянскай культуры як асобнай макрасістэмы, сістэмнае вывучэнне карціны свету, мадэлі свету старажытных славян, рэканструкцыя традыцыйнага мыслення ў цэлым, супастаўленне славянскай фальклорнай традыцыі з традыцыямі іншых народаў, перадусім тых, з якімі славяне ўступалі ў цесны кантакт. Такая праца павінна быць комплекснай як паводле спалучэння розных метадаў і прыёмаў апісання, так і паводле ўключэння фалькларыстычнай праблематыкі ў больш шырокае кола культуралагічных праблем.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Лотман, Ю.М. Внутри мыслящих миров. Человек – текст – семиосфера – история / Ю.М. Лотман. – М. : Языки русской культуры, 1996. – 464 с.

2. Фрейденберг, О.М. Миф и литература древности / О.М. Фрейденберг. – М. : Наука, 1978. – 605 с.

3. Буслаев, Ф.И. Народный эпос и мифология / Ф.И. Буслаев. – М. : Высш. шк., 2003. – 400 с.

4. Леви-Строс, К. Путь масок / К. Леви-Строс ; пер. с фр., сост. А.Б. Островского. – М. : Республика, 2000. – 399 с.

5. Байбурин, А.К. Код(ы) и обряд(ы) / А.К. Байбурин, Г.А. Левинтон // Кодови словенских култура. Број 3 : Свадба. – Београд : CLIO, 1998. – С. 239–257.

6. Чарота, І.А. Пошук спрадвечнай існасці : Беларуская літаратура XX стагоддзя ў працэсах нацыянальнага самавызначэння / І.А. Чарота. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 159 с.

7. Тэрнер, В. Символ и ритуал / В. Тэрнер ; пер. с англ., вступит. ст. В.А. Беймана. – М. : Наука, 1983. – 277 с.

8. Серов, Н.В. Семантика цвета в универсалиях культуры / Н.В. Серов // Великие преобразователи естествознания. Блез Паскаль : тезисы докл. XIX Междунар. чтений, Минск, 26–27 ноября 2003 г. / БГУИР. – Минск, 2003. – С. 20–22.

9. Аникин, В.П. Теория фольклора : курс лекций / В.П. Аникин. – М. : КДУ, 2004. – 432 с.

Shved I.A. **Theoretical and Methodological Basis of the Research of Colour Symbols of Mytho-Poetical Thinking of the Belarusians**

The article deals with theoretical and methodological basis of the research of colour symbols of mytho-poetical thinking of the Byelorussians. Colour symbols can be thorough investigated only in the limits of untrue code. Historic-genetic research of the colour code of the Belarusian folklore is supplemented by function-semantic research. The paper studies various syntagmatic combinability of colour symbols, reveals their deep paradigmatic connections. It is based on the material of various folklore genres and of forms of Belarusian folk culture and Slavonic cultural substratum in general. It's also based on the achievements in such spheres.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 12.02.2011

ПЕДАГОГІКА

УДК 373.3.018

Г.В. Сегенюк

СИСТЕМНЫЙ ПОДХОД К ВЗАИМОДЕЙСТВИЮ ШКОЛЫ И СЕМЬИ В ПЕДАГОГИЧЕСКОМ НАСЛЕДИИ В.А. СУХОМЛИНСКОГО

В статье освещен системный подход к взаимодействию школы и семьи, обусловливающий эффективность данного процесса. Представлены основные направления и формы педагогического взаимодействия с семьей из опыта работы Павлышской школы, которые целесообразно использовать в современных общеобразовательных учреждениях.

Введение

Одним из направлений педагогической деятельности является взаимодействие школы и семьи, модернизация которого предполагает обращение не только к научным исследованиям по данной проблеме современных отечественных и зарубежных ученых, но и изучение историко-педагогического наследия тех педагогов, которые заложили основы школьно-семейного воспитания. Одним из них является В.А. Сухомлинский, который в 60-е годы XX в. инициировал идею «содружества семьи и школы», реализовал ее посредством инновационных форм, показал влияние совместной деятельности педагогов и родителей на результативность учебно-воспитательного процесса, на развитие его субъектов.

Направления и формы взаимодействия школы и семьи

Актуальность проблемы педагогического взаимодействия школы и семьи связана с тем, что, по мнению современных ученых (Н.И. Дереклеева, Л.И. Маленкова, М.П. Осипова, Т.А. Фалькович, В.В. Чечет и др.), этот альянс способствует выработке единого взгляда на сущность воспитания как процесса организации жизнедеятельности ребенка, созданию максимально приемлемых условий для его развития, определению целей и задач воспитания, выработке единого подхода к их достижению, эффективной расстановке сил, установлению эмоционально положительных взаимоотношений участников педагогического процесса (учителей, учащихся, родителей).

На сегодняшний день по проблеме педагогического взаимодействия с семьей определены его принципы (Е.И. Сермяжко, Н.Е. Щуркова и др.); раскрыты типы педагогического взаимодействия (К.А. Альбуханова-Славская, Л.В. Байбородова и др.); разработаны организационные формы работы школы с семьей (Н.И. Дереклеева, Т.А. Фалькович и др.); раскрыты основные подходы к процессу развития педагогической культуры родителей, направления и формы ее повышения (В.И. Гребенников, М.П. Осипова, В.В. Чечет и др.); разработаны основы профессиональной подготовки будущих учителей к осуществлению позитивного взаимодействия с семьей учащегося на компетентностной основе (Е.Д. Осипов) и др.

Немаловажную роль для развития современных исследований в этой области сыграло наследие педагогов прошлого. Значительный вклад в разработку теоретико-методических основ взаимодействия школы и семьи внес украинский советский педагог В.А. Сухомлинский (1918–1970). Заслуга В.А. Сухомлинского заключается прежде всего в том, что когда к 1960-м годам (наиболее плодотворный период его деятельности в качестве руководителя средней школы в с. Павлыш Кировоградской области)

в СССР сложилась тенденция приоритетности общественного воспитания над семейным, когда массовое распространение получили школы интернатного типа, он одним из первых в стране поднял вопрос об ответственности семьи за воспитание детей. Обращая внимание на неправильное, одностороннее представление о сущности общественного воспитания, которое породило дух потребительства, иждивенчества (и это проникло в воспитательную работу школы), этот дальновидный педагог высказал идею принятия соответствующего закона, установления строгого порядка, «в силу которого родители не имеют права передавать своих детей кому бы то ни было на воспитание, если только они здоровы во всех отношениях» [2, с. 449]. Такие документы, возлагающие на родителей как материальную, так и моральную ответственность за воспитание рожденного ребенка и снижающие тем самым проблему социального сиротства, действуют сегодня в Республике Беларусь.

В.А. Сухомлинскому первому принадлежит теоретическое обоснование, методическое обеспечение и реализация концепции школьно-семейного воспитания, в основе которой – принцип сотрудничества как высшей формы педагогического взаимодействия. Раскрывая суть и значение этого принципа, под которым понимал взаимодействие между детьми, между педагогом и детьми, а также единство школы и семьи в воспитании, он писал: «Наиболее полноценное общественное воспитание – это, как известно, школьно-семейное… Без воспитания детей, без постоянного участия отца и матери в жизни школы, без постоянного духовного общения и взаимного духовного обогащения взрослых и детей невозможна сама семья как первичная ячейка общества, невозможна школа как важнейшее учебно-воспитательное учреждение и невозможен моральный прогресс общества» [3, с. 11–12].

Сотрудничество с родителями учащихся в практике Павлышской школы отличалось системностью: осуществлялось не только по разным направлениям воспитания (умственное, трудовое, нравственное, эстетическое, воспитание на национальных традициях и др.), но и через многообразные формы, которые соответствовали характеру педагогической деятельности сотруднечество определялось теми факторами, от которых зависит эффективность педагогического процесса.

Первый и главный фактор эффективности педагогического процесса, с точки зрения В.А. Сухомлинского, – знание ребенка, его силы и слабости, понимание его мыслей, переживаний, его физического и душевного состояния. Считая знания самой главной точкой, где сходятся все нити педагогического руководства школьным коллективом, он, как директор, ввел в своей школе регулярные психологические семинары (проводились примерно раз в полтора месяца), посвященные обстоятельной педагогической характеристике конкретного ученика, а не абстрактного ребенка. В этой характеристике на первом месте среди условий его всестороннего развития стояло здоровье, физическое развитие. Особое внимание уделялось характеристике умственных особенностей ребенка, анализу интеллектуальной жизни семьи (речевому фону семьи, наличию в ней книг, журналов, газет и т.п.), а также моральным отношениям, в которых находится ребенок в семье с раннего детства, эстетической, эмоциональной культуре родителей. Естественно, для такой характеристики требуются разные формы изучения семьи, начиная с ее посещения, а также с индивидуальных бесед с родителями, прежде всего, со стороны классного руководителя. И не только его. Эта же задача ставилась в Павлышской школе и перед директором, завучем, ибо только в единстве всего педагогического коллектива видел Сухомлинский его воспитывающую силу, а ребенка – в центре внимания всех педагогов. Примечательно, что сам директор знал каждого ученика своей школы, как и его родителей, с которыми встречался ежедневно больше 30 лет. Сотрудничество с родителями было на таком уровне, что учителя не шли к ребятам домой – их отцы и матери сами шли в школу.

Особое внимание в Павлышской школе уделялось изучению малоспособных к обучению детей, анализу особенностей их восприятия, мышления, речи, памяти, внимания. С этой целью была образована специальная методическая (ее называли психологической) комиссия из числа учителей, имеющих наиболее основательную теоретическую подготовку по психологии и дефектологии, а также опыт практической работы. Обязательным условием участия в психологической комиссии являлось умение учителя понимать духовный мир ребенка. «Если вы хотите, чтобы руководство школой было построено на научной основе, чтобы практическая работа обогащала теоретические знания каждого учителя, чтобы по мере приобретения практического опыта повышался уровень его педагогической культуры, – убеждал В.А. Сухомлинский молодых директоров школы, – начинайте с психологии и дефектологии. Создайте психологическую комиссию, сами займитесь изучением ребенка, исследуйте, наблюдайте, пробуждайте коллективную мысль» [5, с. 63]. Без такого научно-исследовательского индивидуального подхода к изучению личности ребенка и коррекции его отклонений в развитии, осуществляемого сегодня школьным психологом и дефектологом, уже не мыслится качественный педагогический процесс. Но то, что делалось в Павлышской школе под руководством В.А. Сухомлинского в 1960-е годы, было, безусловно, новаторством. Новаторским являлось и участие родителей в отдельных заседаниях психологической комиссии, цель которого педагог видел в повышении их психологической культуры, считая это одной из животрепещущих школьных проблем.

Психологический семинар как форма взаимодействия школы и семьи в наследии В.А. Сухомлинского являлся для учителей подготовкой к занятиям родительской школы – основной формы повышения педагогической культуры отцов и матерей и одного из самых важных участков работы руководителей школы.

«Школа для родителей», а по сути родительский университет (курс лекций составлял 250 часов), представляла собой целенаправленную систему психолого-педагогического просвещения родителей на протяжении 12–13 лет. В нее записывались оба родителя за два года до поступления ребенка в школу и регулярно посещали занятия вплоть до ее окончания (любой пропуск допускался лишь с разрешения директора или классного руководителя). Именно системность занятий (два раза в месяц по полтора часа), разнообразие их тематического содержания, сочетание как теоретических, так и практических форм («не провозглашают лозунги и призывы, к которым, к сожалению, иногда сводятся родительские собрания, а дают деловые советы отцам и матерям»), дифференциация занятий со слушателями по группам в зависимости от возраста их детей – все это являлось условиями эффективности работы по повышению педагогической культуры родителей.

Слушатели были разделены на следующие группы: молодожены, у которых еще нет детей; родители дошкольников (дети 4–6 лет); родители учащихся 1–2 классов; родители учащихся 3–4 классов; родители учащихся 5–8 классов; родители учащихся 8–10 классов; родители учащихся с особенностями психофизического развития. Так, на занятиях молодоженов – будущих родителей – разговор велся главным образом о культуре взаимоотношений супругов, об умении управлять своими желаниями, чувствами, об общественной значимости дела воспитания детей и ответственности родителей.

На занятиях с родителями дошкольной группы рассказывалось о значении семьи в нравственном воспитании ребенка, о роли для него детской книги, сказки; родителям, дети которых уже поступили в школу и учились в 1–4 классах, рассказывали, как развивать умственные способности и речь детей, воспитывать чувства (темы: «Отец и сын», «Мать и дочь», «Семья как школа человеческих взаимоотношений», «Первые нормы нравственной культуры детей» и др.) [1, с. 434]. Заботясь о понимании родителями своей ответственности в воспитании тончайших сфер духовной жизни ребенка

дошкольного и младшего школьного возрастов (период от 2 до 7 лет Сухомлинский считал самым важным в развитии человека), учителя проводили с родителями беседы о том, как вводить детей в мир природы, красоты, искусства, книги как воспитывать культуру поведения, как организовать режим труда, питания, отдыха и др.

Для родителей старшеклассников проводились занятия следующей направленности: рассматривались проблемы трудового воспитания и профориентации, гражданского становления, воспитания правового сознания, полового воспитания, подготовки юношей и девушек к созданию семьи. Подготовку старшеклассников к браку, к рождению и воспитанию детей В.А. Сухомлинский считал настолько важным, что предлагал ввести соответствующий предмет «Семья, брак, любовь, дети» в учебный план старших классов средней школы как обязательный (в школе уже несколько лет читался факультативный курс «Культура взаимоотношений в семье», на котором юношей и девушек учили, как морально готовиться к браку и жить семейной жизнью, в чем состоит культура человеческих взаимоотношений, как воспитывать своих детей).

Исключительное значение в родительской школе придавалось работе с группой отцов и матерей учащихся, имеющих недостатки в умственном развитии. Весь спектр тематических занятий в этой группе был направлен на помощь родителям данной категории детей в развитии их умственных способностей как главной, по мнению В.А. Сухомлинского, задачи школьно-семейного воспитания. При этом важным условием контакта педагогов и родителей на занятиях являлось избегание разговора о неурядицах и конфликтах в отдельных семьях. Обо всем трудном, об ошибках и неудачах конкретных родителей говорилось только в индивидуальных беседах с ними.

Для осуществления единых требований школы и семьи в воспитании детей, выработки единого общественного мнения родителей педагогический коллектив Павлышской школы поставил перед собой задачу организовать дружный целеустремленный родительский коллектив, который вел бы постоянную работу, помогая школе (под сотрудничеством подразумевалась не только односторонняя помощь школы семье, но и активное творческое участие родителей в жизни и деятельности школы). «Прежде всего мы должны были, – писал В.А. Сухомлинский, – определить роль и место родительского коллектива в решении главной задачи, стоящей перед школой, – в повышении качества знаний учащихся» [4, с. 422]. В то же время деятельность родительского коллектива посвящалась и другим вопросам: идейно-политическому воспитанию в семье, постановке политехнического образования в школе и др.

Характерно, что в создании родительского коллектива как действенной формы педагогического сотрудничества В.А. Сухомлинский руководствовался принципами системности и последовательности. Так, первым этапом являлась родительская конференция по обсуждению методов контроля за выполнением учащимися домашних заданий, построенная на результатах предварительного исследования педагогами этого вопроса (посещено было 45 семей). На конференции совместно вырабатывались требования к составлению оптимального расписания уроков; родители знакомились с рациональными способами выполнения детьми домашних заданий. Второй шаг в организации родительского коллектива – «День родителя» (День открытых дверей). Как форма педагогического взаимодействия (в ней участвовали не только педагоги и родители, но и дети) «День родителя» проводился во всех классах. В присутствии детей классные руководители беседовали с родителями об успеваемости, о ее зависимости от правильно организованной подготовки к урокам; в специально оборудованной комнате делалась выставка ученических работ и изготовленных ребятами наглядных пособий; родительским комитетом выпускался специальный номер стенной газеты «Семья и школа».

Одним из этапов работы с коллективом родителей являлось систематическое (два раза в неделю) посещение педагогами учеников на дому в часы выполнения ими

домашних заданий, причем в первую очередь тех учеников, которые не умели работать самостоятельно, часто не выполняли домашних заданий. Цель этих посещений – не только контроль за самостоятельностью и регулярностью работы, но и педагогическая помощь детям и родителям (еженедельно каждый учитель наведывал две семьи). Главное, что на этом этапе собирались достоверные сведения, прояснявшие дальнейшую работу с родителями по выработке единых требований всех родителей к школьникам в организации их учебной деятельности. Поэтому вторая родительская конференция по данной проблеме носила действительно научный характер (пропагандировалось учение И.П. Павлова, наследие А.С. Макаренко и др.) и отличалась активным участием родителей в обсуждении вопросов домашней учебной работы. При этом родителей волновали успехи не только собственных детей, но и других, т.е. работа всей школы.

В целом системность работы родительского коллектива Павлышской школы заключалась в следующем: проведение один раз в четверть конференции родителей по важнейшим вопросам воспитания детей; ежемесячный выпуск стенной газеты (орган родительского комитета); наличие для родителей передвижной библиотечки; регулярные консультации педагогами родителей в специально установленные часы; участие членов родительского комитета (5–7 человек) в заседаниях педагогического совета. Учитывая функции педагогического совета (выборы директора школы и заведующего учебной частью; распределение предметов между учителями и назначение классных руководителей, руководителей кружков; вопросы организации питания детей в школе, укрепление ее материальной базы и др.), можно говорить об определенном влиянии родительского коллектива на жизнедеятельность школы. Фактически школа в Павлыше была открыта для родителей всегда.

Заключение

Анализ теории и практики В.А. Сухомлинского подтверждает, что педагогическое взаимодействие с семьей в Павлышской школе было основано на принципах системности, последовательности, дифференциации и индивидуализации, осуществлялось по перспективным направлениям и в различных инновационных формах (психологический семинар, родительская школа, день открытых дверей, постоянно действующий родительский коллектив, родительская конференция и др.). Продуктивность педагогического взаимодействия с семьей обеспечивались при условии обстоятельного изучения индивидуальных особенностей ребенка и среды, в которой он развивается с раннего детства, при систематическом целенаправленном просвещении и обучении родителей. Такое взаимодействие характеризуется активным участием родительского коллектива в жизни и деятельности школы. Проблема взаимодействия с семьей учащегося находились в центре внимания всего педагогического коллектива школы и прежде всего самого директора, что обеспечивало единство требований и целостность этого процесса, оказывало позитивное влияние на развитие его субъектов – педагогов, родителей, детей.

СПИСОК ЛИТЕРАТУРЫ

1. Сухомлинский, В.А. Воспитание без наказаний / В.А. Сухомлинский // Избранные педагогические сочинения : в 3 т. / сост. О.С. Богданова, В.З. Смаль, А.И. Сухомлинская. – М. : Педагогика, 1981. – Т. 3. – С. 432–436.

2. Сухомлинский, В.А. Нравственное иждивенчество – откуда оно? / В.А. Сухомлинский // Избранные педагогические сочинения : в 3 т. / сост. О.С. Богданова, В.З. Смаль, А.И. Сухомлинская. – М. : Педагогика, 1981. – Т. 3. – С. 446–450.

3. Сухомлинский, В.А. Павлышская средняя школа / В.А. Сухомлинский // Избранные педагогические сочинения : в 3 т. / сост. О.С. Богданова, В.З. Смаль, А.И. Сухомлинская. – М. : Педагогика, 1980. – Т. 2. – 384 с.

4. Сухомлинский, В.А. Работа с коллективом родителей / В.А. Сухомлинский // Избранные педагогические сочинения : в 3 т. / сост. О.С. Богданова, В.З. Смаль, А.И. Сухомлинская. – М. : Педагогика, 1981. – Т. 3. – С. 422–427.

5. Сухомлинский, В.А. Разговор с молодым директором школы / В.А. Сухомлинский // Избранные педагогические сочинения : в 3 т. / сост. О.С. Богданова, В.З. Смаль, А.И. Сухомлинская. – М. : Педагогика, 1981. – Т. 3. – С. 7–204.

Segenyuk G.V. **System Approach to Family and School Interaction in the Educational Heritage by V.A. Sukhomlinsky**

The article deals with the system aproach to the interaction of school and family, which contributes to the effectiveness of the given process and upbringing. The author shows the main ways and forms of pedagogical interaction with the family from Pavlysh school work experience which can be used in modern educational establishments.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 02.03.2011

УДК 1:316.334+17.022

М.С. Кавалевіч

КАШТОЎНАСНЫЯ АРЫЕНТАЦЫІ АСОБЫ І ІХ ПЕДАГАГІЧНАЯ ПАДТРЫМКА: СІНЕРГЕТЫЧНЫ ПАДЫХОД

У кантэксце сінергетычнага падыходу асоба разглядаецца як самарэгуляваная, самакіравальная сістэма, якой уласцівы пэўны набор механізмаў самарэгуляцыі, дзе вядучую ролю кіравальнага фактару адыгрывае індывідуальная сістэма каштоўнасцяў як складаная інфармацыйна ўпарадкаваная сістэма, здольная ў працэсах узаемадзеяння з асяроддзем да адаптыўнай самакарэкцыі і прагрэсіўнай эвалюцыі. У артыкуле прадстаўлены праект педагагічнай падтрымкі і суправаджэння станаўлення асобасных якасцяў, якія садзейнічаюць духоўнаму развіццю, выхаванню сумленнасці, пачуцця ўласнай годнасці, імкнення да самаўдасканалення і інш. А для гэтага адукацыя павінна быць скіравана не толькі на фарміраванне ведаў, але і на раскрыццё і пошукі сэнсу чалавечага жыцця, што дапаможа моладзі ажыццявіць сваё асобаснае і прафесійнае самавызначэнне; абудзіць духоўнасць як імкненне да выхаду за межы свайго актуальнага ўнутранага стану і далучэнне да шырэйшага культурнага кантэксту жыцця.

Уводзіны

Катэгорыя «каштоўнасць» разглядаецца намі ў якасці базіснай, паколькі вызначае напрамак узаемадзеяння чалавека і навакольнага свету, сістэму асобаснага ўспрымання і засваення культуры. Аксіялагічная функцыя адукацыі заключаецца ў забеспячэнні багацця ўнутранага свету асобы, у фарміраванні яе вектар-развіцця і самаразвіцця. Праблема каштоўнасцяў заўсёды актуалізуецца, яе пастаноўка абвастраецца, набывае шырокае сацыяльнае і маральнае значэнне ў складаныя, пераломныя моманты, калі ранейшыя традыцыі губляюць сваю актуальнасць і значнасць, і тады пачынаецца замена іх новымі ідэаламі і мэтамі.

Сёння ў навуцы гавораць аб разгорнутай шырокамаштабнай «аксіялагічнай вайне», падчас якой мэтаскіравана руйнаваліся каштоўнасці і ідэалы людзей, што істотна палягчае маніпуляванне імі дзеля насаджэння ілжывых, але «выгадных» каштоўнасцяў і ідэалаў. З'яўляюцца новыя тэрміны – «энтрапійная эпідэмія», якая разумеецца як спантанная хаатызацыя псіхічнага свету людзей, што прыводзіць да страты імі арыенціраў і згубе эфектыўных жыццёвых стратэгій. Людзі сталі прымаць за мэты сродкі жыццезабеспячэння і ўмовы дасягнення банальнага камфорту (кар'ера, грошы, бяспека, задавальненне, забавы). Чалавек аказаўся выключаным з агульнасацыяльнага кантэксту і адарваным ад звыклых родавых і культурных сувязяў. Новая сістэма каштоўнасцяў, якая не толькі не абараніла ўнутраны, духоўны свет, сацыяльныя каштоўнасці маладога пакалення, ды і ўсяго грамадства ў цэлым, але і ў значнай меры дэзарыентавала яго, стварыла ілжывыя, паказныя каштоўнасці, імкненне да якіх аказала негатыўны ўплыў на маладога чалавека, павялічыла яго разрыў са старэйшым пакаленнем, якое само апынулася ў неадназначнай сітуацыі пераасэнсавання шэрагу традыцыйных каштоўнасцяў.

У культуры тэхнагеннай цывілізацыі дамінуючае значэнне ў грамадстве займаюць культ сілы і грошай. Базавымі каштоўнасцямі сучаснай цывілізацыі застаюцца ідэалы панавання над прыроднымі і сацыяльнымі аб'ектамі, ідэалы ўлады, заснаванай на сілавым пераўтварэнні прыроднага і сацыяльнага свету. Перад тварам глабальных небяспек чалавецтва вымушана шукаць новыя стратэгіі сацыялізацыі асобы і яе выхавання ў духу памяркоўнасці і павагі. Такім чынам, узрастае роля пошуку згоды паміж, здавалася б, супрацьлеглымі культурамі.

Даследчыкі сцвярджаюць, што практычна ажыццёўлены рэальны пераход чалавецтва ў гістарычна новы стан, які вызначаецца як цывілізацыйны злом, «восевы час гісторыі» [1, с. 32]. Адной з яго характэрных рыс з'яўляецца «духоўная напруга», прарыў да прынцыпова іншых жыццёвых і культурных уяўленняў, перагляду маральнага патэнцыялу эпохі, пераацэнкі здольнасці адукацыі выконваць сваю місію ў духоўным і маральным развіцці грамадства. «Надыходзіць раптам рашучы пералом у знешняй культуры: з'яўляюцца новыя погляды, новыя думкі і пачуцці, ускладняецца барацьба грамадскіх інтэрасаў; у традыцыйнае культурнае асяроддзе ўрываюцца замежныя ўплывы… Надыходзіць эпоха крызісу, разбэшчання асобы, яе свабоды ад таго, што завуць мараллю. Асоба як бы разрываецца на часткі, разломліваецца» [2, с. 68]. Гэтыя словы, напісаныя філосафам і педагогам С.І. Гесэнам у пачатку 30-х гг. мінулага стагоддзя, адпавядаюць сучаснаму стану грамадскай свядомасці.

Склалася вострая сітуацыя ў сацыяльнай, эканамічнай, культурнай, дэмаграфічнай, этнапалітычнай, экалагічнай і іншых абласцях. Найперш абвастраецца экзістэнцыяльны код: існае аб'яўляецца неіснуючым, а тое, што яшчэ павінна з'явіцца, – адзіным праўдзіва існым. Першае ацэньваецца адмоўна, другое атрымлівае высокую аксіялагічную адзнаку [3, с. 321].

Усталёўваецца стратэгія практычнага арыентавання: вырашальным становіцца выбар «выгадна» або «невыгадна». К. Ясперс падкрэслівае, што ў перыяд змены жыццёвых рэалій, у паваротныя моманты гісторыі, калі змены ўцягваюць у адзіны кругазварот падзей велізарныя масы людзей, узмацняецца значнасць «духоўнай камунікацыі». Думаецца, у кантэксце развіцця такой камунікацыі актуальнай становіцца адукацыя чалавека новага «восевага часу». У выхаванні такога чалавека *духоўнасць і маральнасць, без сумнення, выступаюць ключавымі паняццямі.* «Няправільныя ўчынкі наносяць адзінкавае зло, парушэнне ўстаноўленых знакавых сувязяў разрывае саму аснову чалавечага грамадства і робіць Зямлю царствам Сатаны – Аадам» .[3, с. 308]. У многім спрыяе гэтаму сучасная адукацыя, якая стварае ўмовы для абяднення душы пры ўзбагачэнні інфармацыяй.

Духоўнасць як унутраная скіраванасць на вышэйшыя каштоўнасці

Унутраны свет чалавека, матывы, якія заахвочваюць яго да той або іншай дзейнасці, выбар дабра або зла мала залежаць ад тэхнічных дасягненняў і навуковых прарываў. Наадварот, разумны, добра адукаваны нягоднік значна больш небяспечны для грамадства, чым «прасцяк», пра якога з іроніяй кажуць: «Добры чалавек не прафесія». Журботная «прымаўка». З грэбаваннем ставіцца да добрых людзей можа толькі грамадства, якое пакутуе хваробай амаральнасці.

Праблема ў тым, што мы адвучыліся «будаваць» унутраны свет чалавека. Выхаванне ў асноўным скіравана на фарміраванне чалавека знешне: як буду выглядаць у грамадстве, якое месца ў ім займу, якую кар'еру зраблю, які ў мяне будзе дом, машына і шматлікае іншае. Вядома, гэта неабходна для кожнага. А вось унутраная культура, унутраны змест мала каго хвалюе, напаўненнем духоўнага свету чалавека часцей за ўсё ніхто не займаецца. Таму варта не толькі перадаваць маладому пакаленню веды, але і фарміраваць высокую ўнутраную культуру, светлыя, добрыя, маральныя чалавечыя якасці. Прафесіяналізма і эрудыцыі недастаткова для чалавечага шчасця. Да іх павінны быць прыкладзены і іншыя якасці з разраду духоўна-маральных. У кантэксце выхавання паняцце «духоўнасць» прынята суадносіць з пазітыўнымі праявамі актыўнасці духу. Гэтая пазітыўнасць цесна звязана з маральнай пазіцыяй асобы. Магчыма, гэтым і вызначаецца з'яўленне словазлучэння духоўна-маральнае выхаванне.

Духоўнасць паднімае чалавека над штодзённасцю, адкрываючы шлях да «ўнутранай свабоды ад сіл, якія валодаюць знешнім пластом быцця» [4]. Прадстаўнікі розных светапоглядных пазіцый аднадушныя, расцэньваючы духоўнасць як унутраную скіраванасць на вышэйшыя каштоўнасці, якія надаюць жыццю і чалавечай культуры вышэйшае вымярэнне, быццёвае значэнне і сэнс. У чалавеку, як істоце «шматпавярховай і шматпланавай» (М.А. Бярдзяеў), прыроднае, сацыяльнае, культурнае арганічна злучаныя з патэнцыялам унутранай актыўнасці. Гэта актыўнасць набывае пэўную скіраванасць і характар, абумоўленыя ступенню духоўнасці і маральнасці асобы. Маральнасць як інтэгральная асобасная характарыстыка ўключае індывідуальныя каштоўнасна-сэнсавыя ўстаноўкі і асобасныя ўласцівасці і складае ўнутраны псіхалагічны рэсурс устойлівасці чалавека супраць любых праяў зла і разбурэння ўласнай прыроды.

З пазіцый хрысціянскай антрапалогіі, жыццё чалавека вызначаецца логікай і рытмам яго духоўнага развіцця. Па словах А. Швейцэра, «адзіная магчымасць надаць свайму быццю які-небудзь сэнс заключаецца ў тым, каб падняць сваё прыроднае стаўленне да свету да ўзроўню духоўнага» [4, с. 4]. Духоўнасць з'яўляецца найвялікшым вектарам развіцця і захавання чалавека.

Духоўнасць пранізвае ўсе асобасныя сферы. Ахопліваючы эмацыянальна-пачуццёвую сферу, яна нараджае вышэйшы характар адносін да свету, чалавецтва, сябе. Гэта новае вымярэнне ўзнікае за кошт выхаду ў прастору сэнсаў і каштоўнасцяў, якія маюць агульначалавечае значэнне. Духоўнасць праяўляе сябе ў імкненні чалавека ажыццявіць унутраную работу, звязаную з маральным удасканаленнем на аснове самасвядомасці, самавызначэння, свабоднага выбару. Адсюль духоўнасць можна вызначыць як анталагічна абумоўлены стан, іманентна ўласцівы чалавеку, перажыванне цэласнасці, якая праяўляецца на пэўнай стадыі індывідуальна-асобаснага развіцця. Гэты стан абумоўлены патрэбай і здольнасцю шляхам унутраных намаганняў усталёўваць і захоўваць сувязь з надіндывідуальным, а таксама *з надчалавечай* прасторай, у якую ўключана быццё чалавека як разумнай часткі жывой прыроды і ў якой канцэнтруюцца ўсе чалавечыя сэнсы.

Сучасны – постнекласічны – тып рацыянальнасці на пярэдні план навуковага пошуку выводзіць праблему самаарганізацыі складаных сістэм, сярод якіх галоўнае месца займаюць чалавекамерныя (паводле В.С. Сцёпіна) і якія ўключаюць чалавека ў якасці свайго важнейшага кампанента. Узорамі такіх сістэм становяцца біясфера як глабальная экасістэма, аб'екты сучасных біятэхналогій, сацыяльныя аб'екты і чалавек. У стратэгіях дзейнасці са складанымі чалавекамернымі сістэмамі ўзнікае новы тып інтэграцыі ісціны і маральнасці, мэтаскіраванага і каштоўнасна-рацыянальнага дзеяння. Даследаванне такіх сістэм абавязкова павінна ўлічваць магчымыя траекторыі выбару сцэнарыя развіцця з мноства магчымых.

Эфектыўным для даследавання такіх сістэм прызнаецца сацыясінергетычны погляд, які аб'ядноўвае ў сабе ідэі тэорыі самаарганізацыі складаных сістэм з выхадам на сацыяльную сферу (К.Х. Дэлакараў, В.С. Сцёпін, У.П. Бранскі, Л.Д. Беўзенка, Г.А. Кацельнікаў, В.В. Васількова і інш.). К.Х. Дэлакараў лічыць, што ў гэтых умовах няма падстаў ігнараваць эўрыстычныя, філасофска-метадалагічныя магчымасці тэорыі самаарганізацыі складаных сістэм, тым больш калі мы маем справу з такімі складанымі сістэмамі, як «прырода – грамадства – чалавек», сучасны нестабільны соцыум [5]. Паводле В.С. Сцёпіна, новая постнекласічная навука пашырае поле навукі, уключыўшы сацыяльныя каштоўнасці і мэты ў структуру навуковых ведаў.

Такім чынам, спецыфікай постнекласічнай навукі з'яўляецца ўзмацненне аксіялагічнага фактару ў даследаванні такой складанай самаразвіццёвай сістэмы, як «прырода – чалавек – грамадства», а таксама праблемы духоўнага крызісу асобы

з выхадам на ідэі сінергетыкі ў межах існуючага соцыуму. Гаворка ідзе пра абумоўленасць духоўнага крызісу асобы сацыякультурнымі фактарамі і высвятленне ролі каштоўнасцяў у гэтым працэсе.

Педагагічная падтрымка каштоўнасных арыентацый асобы

У кантэксце сінергетычнага падыходу асоба разглядаецца як самарэгуляваная, самакіравальная сістэма, якой уласцівы пэўны набор механізмаў самарэгуляцыі, дзе вядучую ролю кіравальнага фактару адыгрывае індывідуальная сістэма каштоўнасцяў як складаная інфармацыйна ўпарадкаваная сістэма, здольная ў працэсах узаемадзеяння з асяроддзем да адаптыўнай самакарэкцыі і прагрэсіўнай эвалюцыі шляхам выкарыстання механізмаў зваротнай сувязі, адкрытая сістэма, якая не можа існаваць у адрыве ад навакольнага прыроднага і сацыяльнага асяроддзя. Паміж элементамі сістэмы «асоба – грамадства» існуе своеасаблівая дынамічная раўнавага, і ўсякае адхіленне ад яе служыць асноўнай крыніцай актыўнасці сістэмы «асоба» [6].

Паводле Л.І. Анцыферавай, паводзінамі асобы рухае барацьба двух процілеглых пачаткаў, з аднаго боку, гэтае імкненне да зняцця напругі, ураўнаважвання свайго ўзаемадзеяння з сацыяльным асяроддзем, а з другога – пошук пастаяннай напругі, пастаноўка і рэалізацыя праектаў, мэт, задач і каштоўнасцяў, якія кіруюць паводзінамі асобы [7]. Чым устойлівейшыя каштоўнасці асобы, мацнейшыя яе перакананні, прынцыпы, ідэалы, тым больш ярка выяўляецца і яе цэласнасць. Цэласнасць асобы – вынік дынамічнай (няўстойлівай) раўнавагі ў сістэме «асоба – грамадства». Аднак гэтая раўнавага сёння знаходзіцца пад пагрозай парушэння з прычыны тых змен, якія адбываюцца ў грамадстве. Самі змены знешняга асяроддзя з'яўляюцца крыніцай актыўнасці асобы, таму што яна, адаптуючыся да зменлівых умоў, назапашвае карысную інфармацыю, павышае ўзровень сваёй арганізацыі і развіваецца. Такім чынам, змены, што адбываюцца ў грамадстве, з'яўляюцца крыніцай развіцця асобы і ў гэтым сэнсе карысныя для яе.

Застой, адсутнасць змен-стрэсараў у знешнім асяроддзі непазбежна вядуць да рэгрэсу асобы. Аднак гэтыя адхіленні не павінны быць занадта вялікімі. Існуе пэўная мяжа адхіленняў, з якімі здольна справіцца асоба. Калі яны перавышаюць дапушчальныя межы і выходзяць за межы яе прыстасавальных магчымасцяў, то яна пачынае ўспрымаць асяроддзе як крыніцу напругі. Псіхалагічна гэты этап перажываецца асобай як страта сэнсу жыцця, расчараванне ў ранейшых мэтах і каштоўнасцях, пераасэнсаванне мінулага жыццёвага вопыту і адносін, згуба пачуцця ідэнтычнасці, свайго месца ў жыцці грамадства. У свядомасці асобы ўзнікае шырокая «карта магчымасцяў», патэнцыяльных шляхоў развіцця. Яно атрымлівае імаверны, стахастычны характар і дыяпазон верагодных шляхоў развіцця асобы ад найвышэйшых момантаў самаадданасці і творчага самавыяўлення да крайняй ступені дэградацыі [7]. А.М. Князева і С.П. Курдзюмаў вызначаюць гэты хаос як «блуканне ў эвалюцыйных лабірынтах мыслення і ведаў» [8].

Н.М. Мухамеджанава вызначае духоўны крызіс асобы як гранічны выраз хаосу, які носіць амбівалентны характар, г. зн., з аднаго боку, аказвае разбуральнае дзеянне на асобу і ў выніку можа прывесці да згубы асобы, а з іншага – выступае як неабходны момант развіцця чалавека, канструктыўны механізм эвалюцыі, таму што з яго можа развівацца новая арганізацыя і нават нараджэнне новай асобы [6]. Больш за тое, у сацыясінергетычным кантэксце духоўныя крызісы асобы можна прадставіць як заканамерны працэс, які прыводзіць да з'яўлення змен дзейнасці чалавека ў сацыяльным асяроддзі, што можа паслужыць спачатку крыніцай новых супярэчнасцяў, а затым глебай для наступнага ўдасканалення асобы і соцыуму. Заканамернасць крызісаў абумоўлена амбівалентнасцю асобы, наяўнасцю ў яе двух

процілеглых пачаткаў: тэндэнцыі да ўстойлівасці, захавання і тэндэнцыі да змены, фарміравання новых каштоўнасцяў, мэт, планаў, задач.

Не выклікае сумнення той факт, што на крызіснай стадыі развіцця асобы адбываецца ў абсалютнай большасці выпадкаў змена, пераацэньванне каштоўнасцяў. Ранейшая сістэма каштоўнасцяў губляе сваю ўпарадкаванасць. Калі раней яе можна было прадставіць у выглядзе цэласнасці, то зараз гэтая сістэма рассыпаецца, ператвараецца ў хаос. Пераглядаецца і статут асобных каштоўнасцяў у агульнай сістэме.

Такім чынам, крызіс асобы можна вызначыць як біфуркацыйную фазу развіцця складанай самаарганізаванай сістэмы, калі яна знаходзіцца ў сітуацыі выбару магчымай будучай траекторыі развіцця пад уздзеяннем структуры-атрактара. Падпаданне асобы пад уладу пэўнай каштоўнасці, выхад на структуру-атрактар можна лічыць пачаткам пераадолення крызісу. Таму важнейшай перадумовай канструктыўнага выхаду асобы з крызісу з'яўляецца разнастайнасць элементаў індывідуальнай сістэмы каштоўнасцяў. Крыніцай разнастайнасці элементаў каштоўнаснай сістэмы прызнаюцца *каштоўнасны плюралізм,* разнастайнасць духоўнай культуры грамадства, альтэрнатыўныя нормы і ідэалы чалавечых адносін у грамадстве. Варта звярнуць увагу на тое, што, падобная разнастайнасць можа вельмі ўскладніць сітуацыю, у якую трапляе асоба, спрыяць развіццю светапогляднага хаосу, дэзарыентаваць індывіда ў самавызначэнні сябе, сваёй ролі ў грамадстве. Але з іншага боку, асабліва з пазіцыі сінергетычнага бачання, падобная каштоўнасная разнастайнасць можа мець станоўчую ролю, забяспечыць выхад асобаснай сістэмы на новы ўзровень гармоніі больш высокага парадку і нават новай ідэнтычнасці. Засваенне разнастайных каштоўнасцяў грамадства пашырае і ўзбагачае духоўныя магчымасці асобы, паколькі яно спрыяе інтэнсіфікацыі разумовай дзейнасці, якая ў сваю чаргу з'яўляецца неабходнай умовай выбару дамінантнай каштоўнасці, вакол якой дабудоўваецца ўся сістэма асобасных каштоўнасцяў.

Жыццядзейнасць людзей як сацыяльны працэс з пазіцый сацыясінергетыкі разглядаецца як самаарганізаваны адзіны негэнтрапійны працэс, самаразвіццёвая рэальнасць сацыяльнага парадку. Парадку не застылага, закрытага, а парадку ў стадыі станаўлення. Такі парадак характарызуецца працэсам разбурэння дысцыпліны, з'яўленнем новай ініцыятывы, якая патрабуе свайго замацавання і афармлення ў іншай дысцыпліне, на змену якой ідзе новая ініцыятыва і гэтак далей [7].

Сацыяльны працэс уключае хаос, які ўяўляецца не кангламератам мёртвых утварэнняў, а жывым, дынамічным беспарадкам зменлівых працэсаў. У хаосе прабіваюць сабе шлях і выяўляюцца заканамернасці, тэндэнцыі сацыяльнага парадку. Сацыяльны хаос – гэта не аморфнасць, нявызначанасць. Ён мае самыя разнастайныя асаблівасці, спецыфічныя характарыстыкі. Вызначальным момантам тут выступаюць зносіны паміж людзьмі, прычым не абстрактныя, а зносіны жывыя, якія адыгрываюць атракторную ролю ў самаарганізацыі сацыяльных працэсаў. Паколькі стан нельга выхаваць, мае сэнс гаварыць не аб духоўным выхаванні, а аб педагагічнай падтрымцы і суправаджэнні станаўлення асобасных якасцяў, якія спадарожнічаюць і садзейнічаюць духоўнаму развіццю, выхаванню такіх якасцяў, як сумленнасць, пачуццё ўласнай годнасці, імкненне да самаўдасканалення і інш.

Педагагічна павінны быць створаны стымулы, якія нараджаюць асобаснае імкненне да самавыхавання, самавызначэння, маральнага ўдасканалення і духоўнага развіцця, а таксама спрыяльныя гэтаму ўмовы. Кожны выхаванец у момант сустрэчы з педагогамі знаходзіцца на рознай «стартавай пляцоўцы» гатоўнасці, матывацыі да духоўнага і прафесійнага самавызначэння і развіцця, таму кожны павінен прайсці індывідуальны шлях духоўнага і прафесійнага росту і выхавання маральных асобасных якасцяў. Не існуе духоўнасці і маральнасці па-за іх носьбітамі, таму педагагічнае суправаджэнне і падтрымка асобаснага і прафесійнага самавызначэння заўсёды

патрабуюць канкрэтызацыі канцэптуальных і тэхналагічных мадэляў арганізацыі гэтага працэсу.

Усвядомленае ўзыходжанне да духоўнасці пачынаецца з пытання аб сэнсе свайго жыцця, неад'емным складнікам якога з'яўляецца працоўная дзейнасць. Зразумела, пытанні такога роду і стандартныя (правільныя) адказы на іх немагчыма закласці ў адукацыйныя стандарты. Але нішто не перашкаджае ўзмацніць у змесце адукацыі разгляд шэрагу праблем і катэгорый, якія скіроўваюць старшакласнікаў і студэнтаў да сэнсу быцця, такіх як Жыццё, Праца, Дабро, Ісціна, Прыгажосць і Гармонія.

Духоўны рост суправаджаецца фарміраваннем сістэмы каштоўнасных арыенціраў, важных для напаўнення ўласнага жыцця вышэйшымі сэнсамі. Відавочна, для рашэння пералічаных задач неабходна педагагічная дапамога і падтрымка ў любых формах, каб:

- абудзіць духоўнасць як імкненне да выхаду за межы свайго актуальнага ўнутранага стану і далучэнне да шырэйшага культурнага кантэксту жыцця;
- стварыць умовы для свабоднага, асэнсаванага развіцця ў выхаванцаў духоўнага пачатку;
- дапамагчы ў вызначэнні і здзяйсненні індывідуальнага шляху асобаснага і прафесійнага жыцця, ўзыходжання да духоўнасці.

Прынята лічыць, што агульнацывілізацыйны крызіс патрабуе паскарэння тэмпаў сацыякультурнага развіцця грамадства з дапамогай сродкаў адукацыі і камунікацый. Магчыма, варта ў першую чаргу падумаць аб ролі адукацыі не столькі ў паскарэнні, колькі ў ачалавечванні жыцця грамадства. Ва ўмовах, калі тэмпы духоўнага сталення чалавецтва катастрафічна адстаюць ад тэмпаў нарастання татальнага цывілізацыйнага крызісу, праблема экалогіі чалавечага духу становіцца актуальнай як ніколі.

Вопыт паказвае, што ўжо ў старэйшых класах з'яўляецца патрэба асэнсаваць сваё жыццё не як серыю выпадковых разрозненых падзей, а як цэласны працэс, які мае вызначаную мэту і сэнс як для асобы, так і для грамадства ў цэлым. Вытокі такога асэнсавання могуць быць закладзены ў сучаснай сярэдняй школе, а затым атрымаць развіццё ў вышэйшай. А для гэтага асноўныя біялагічныя, хімічныя, матэматычныя, лінгвістычныя, эканамічныя паняцці трэба разглядаць не толькі з пазіцыі інтэрпрэтацыі, а і ў плане іх быццёвага значэння і каштоўнасці. У сувязі з гэтым адукацыя павінна быць скіравана не толькі на фарміраванне ведаў, але і на раскрыццё і пошукі сэнсу чалавечага жыцця, што дапаможа моладзі ажыццявіць сваё асобаснае і прафесійнае самавызначэнне. Прычым неабходна падкрэсліць, што педагагічная дзейнасць прадуктыўная толькі тады, калі яна адпавядае логіцы самаразвіцця суб'екта, логіцы ўзаемадзеяння сіл і тэндэнцый, калі яны прыводзяць у дзеянне механізмы развіцця самой асобы, механізмы фарміравання неабходных уласцівасцяў і якасцяў.

Прыняцце рашэння, выбар траекторыі свайго жыцця, у тым ліку і прафесійнай, гэта адказнасць чалавека за рэалізацыю тых або іншых каштоўнасцяў. У кожнага чалавека свая вобласць адказнасці, дзе ён з'яўляецца неабходным і незаменным. Педагог павінен дапамагчы юнаку асэнсаваць індывідуальную адказнасць у сваёй вобласці. Як правіла, прафесійная дзейнасць з'яўляецца той вобласцю, дзе рэалізуецца чалавечы сэнс і каштоўнасці.

На вырашэнне пастаўленых задач скіраваны распрацаваны намі *сацыяльна-адукацыйны праект*, які прадугледжвае:

- распрацоўку новай гуманітарнай (культурнай) канцэпцыі асобаснага і прафесійнага самавызначэння моладзі, спрыяльнай яе арыентацыі на грамадскія каштоўнасці як сэнсажыццёвыя, асобасны і прафесійны рост;

- падтрымку і суправаджэнне станаўлення асобасных якасцяў, якія спадарожнічаюць і садзейнічаюць духоўнаму развіццю, выхаванню такіх якасцяў, як сумленнасць, пачуццё ўласнай годнасці, імкненне да самаўдасканалення і інш.
- уключэнне элементаў экафіласофіі ў змест адукацыйна-выхаваўчага працэсу у мэтах выхавання пакалення, адказнага за сябе і за Прыроду;
- пашырэнне экалагічнага складніка ў выхаванні навучэнцаў;
- павышэнне значнасці прыродазнаўчых навук;
- уключэнне ў змест грамадазнаўчых навук эканамічных і палітычных мадэляў такіх грамадстваў, у якіх бы на першае месца ставіліся інтарэсы Прыроды;
